ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
28.08.2025 №155

# Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Працоўнае навучанне» для VI–X класаў першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю з беларускай мовай навучання і выхавання

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Працоўнае навучанне» (далей – вучэбная праграма) прызначана для VI–X класаў спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю з беларускай мовай навучання і выхавання.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 1330 гадзін: па 210 гадзін у VI–VII класах (па 6 гадзін на тыдзень), па 280 гадзін у VIII–IX класах (па 8 гадзін на тыдзень), 350 гадзін у X класе (10 гадзін на тыдзень).

У главе 2 дадзенай вучэбнай праграмы пазначана колькасць вучэбных гадзін, мінімальна неабходных для засваення зместу яе раздзелаў. Яна можа быць павялічана, але сумарны аб’ём вучэбнага часу, вызначаны для раздзелаў вучэбнай праграмы, якія вывучаюцца ў кожным класе, не павінен перавышаць названы вышэй.

3. Мэта вывучэння вучэбнага прадмета «Працоўнае навучанне» – фарміраванне асноў кампетэнтнасці вучняў у розных сферах працоўнай, гаспадарча-бытавой дзейнасці, дэкаратыўна-прыкладной творчасці, якая садзейнічае сацыялізацыі асобы ў сучасных сацыяльна-эканамічных умовах і падрыхтоўцы да атрымання прафесіі ў класах паглыбленай сацыяльнай і прафесійнай падрыхтоўкі, ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі або непасрэдна на вытворчасці.

4. Задачы:

павышэнне ўзроўню матывацыі вучняў да вучэбна-працоўнай дзейнасці;

фарміраванне асноў графічнай і тэхналагічнай адукаванасці вучняў у працэсе вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і засваення тэхналагічных аперацый, якія вывучаюцца, уменняў эканомна выкарыстоўваць матэрыялы і выконваць правілы бяспечных паводзін;

фарміраванне ў вучняў звычкі да працы і працоўнай трываласці;

развіццё ў вучняў пазнавальных інтарэсаў, здольнасці да праяўлення творчасці, камунікатыўных і арганізатарскіх уменняў;

карэкцыя недахопаў вучэбна-працоўнай дзейнасці вучняў з дапамогай спецыяльнага фарміравання ўменняў арыентавацца ў заданні, планаваць яго выкананне, устанаўліваць прычынна-выніковыя сувязі ў працэсе працы, выконваць вылічэнні і вымярэнні, самакантроль і самаацэнку;

фарміраванне гатоўнасці вучняў да прафесійнага самавызначэння;

фарміраванне неабходных у працы станоўчых якасцей асобы, далучэнне да культурных нацыянальных каштоўнасцей і традыцый.

5. Змест дадзенай вучэбнай праграмы прадстаўлены наступнымі раздзеламі: «Тэхнічная графіка», «Электрычнасць», «Прафесійнае

самавызначэнне», «Апрацоўка драўніны», «Апрацоўка металаў», «Апрацоўка тканін», «Асновы гатавання ежы», «Рамонтныя работы ў быце», «Раслінаводства і жывёлагадоўля» (падраздзелы «Агародніцтва. Паляводства», «Кветкаводства і азеляненне», «Жывёлагадоўля», «Пладаводства»), «Мастацкая апрацоўка матэрыялаў» (падраздзелы «Пляценне з лазовага прута», «Ручная вышыўка», «Разьба па дрэве»).

Вывучэнне раздзелаў «Тэхнічная графіка», «Электрычнасць», «Прафесійнае самавызначэнне» з'яўляецца абавязковым для ўсіх вучняў. З іншых раздзелаў вучэбнай праграмы ўстанова адукацыі выбірае 2–4 раздзелы з улікам медыцынскіх рэкамендацый, полу, вучэбна-працоўных магчымасцей вучняў, магчымасцей вучэбна-матэрыяльнай базы, вытворчага асяроддзя, перспектыў атрымання прафесійнай падрыхтоўкі або прафесійна-тэхнічнай адукацыі і працаўладкавання. Вывучэнне розных раздзелаў вучэбнай праграмы з'яўляецца абавязковай умовай забеспячэння агульнапрацоўнай падрыхтоўкі вучняў.

Вучэбныя заняткі па раздзеле «Тэхнічная графіка» праводзяцца ў VI–X класах. У вучняў фарміруюцца элементы графічнай культуры, вырашаецца задача іх падрыхтоўкі да ўспрымання тэхнічных малюнкаў, чарцяжоў, эскізаў на занятках па апрацоўцы матэрыялаў і рамонтна-будаўнічых работах у побыце.

Вучэбныя заняткі па раздзеле «Электрычнасць» праводзяцца ў VIII–X класах. Іх асноўная задача – фарміраванне ў вучняў пачатковых ведаў аб электрычнасці, бытавых ведаў і ўменняў, неабходных для яе бяспечнага і эканомнага выкарыстання, азнаямленне вучняў з электрарухавікамі, якія выкарыстоўваюцца на станочным абсталяванні.

Вучэбныя заняткі па раздзеле «Прафесійнае самавызначэнне» праводзяцца ў VIII–X класах для замацавання, сістэматызацыі і пашырэння прафесійнай інфармацыі і фарміравання ўмення выкарыстоўваць яе для ўсвядомленага выбару і шляхоў атрымання прафесіі.

Для дзяўчынак пераважным (але не абавязковым) з'яўляецца вывучэнне раздзела «Апрацоўка тканін». Для хлопчыкаў як пераважнае рэкамендуецца навучанне па раздзеле «Апрацоўка драўніны», аднак магчымым з'яўляецца вывучэнне замест гэтага раздзела апрацоўкі тканін або ручной вышыўкі. Улічваецца, што веды і ўменні ў галіне апрацоўкі тканіны і ручной вышыўкі могуць быць для іх у быце не менш значнымі, чым веды і ўменні ў галіне апрацоўкі драўніны.

Раздзел «Апрацоўка металаў» рэкамендуецца для вывучэння толькі хлопчыкамі. У межах раздзела «Мастацкая апрацоўка матэрыялаў» як хлопчыкам, так і дзяўчынкам могуць быць рэкамендаваны пляценне з лазовага прута і ручная вышыўка, хлопчыкам – разьба па дрэве. Усе іншыя раздзелы дадзенай вучэбнай праграмы рэкамендуюцца для вывучэння як хлопчыкамі, так і дзяўчынкамі.

6. Змест раздзела «Апрацоўка металаў» арыентаваны на хлопчыкаў, у якіх адносна больш захаваны фізічныя магчымасці і якія больш паспяхова авалодваюць агульнапрацоўнымі ўменнямі.

Вучнямі, якім вывучэнне раздзела «Апрацоўка тканін» цяжкадаступнае з-за спецыфічных цяжкасцей у авалоданні работай на швейнай машыне, замест гэтага раздзела можа вывучацца падраздзел «Ручная вышыўка» раздзела «Мастацкая апрацоўка матэрыялаў».

У раздзеле «Раслінаводства і жывёлагадоўля» ў вучэбнай праграме вылучаны падраздзелы «Агародніцтва. Паляводства», «Кветкаводства і азеляненне», «Жывёлагадоўля», «Пладаводства». Установы адукацыі маюць права арганізаваць навучанне па асобных з іх з улікам магчымасцей вучэбна-матэрыяльнай базы, асаблівасцей вытворчага асяроддзя па месцажыхарстве вучняў, перспектыў наступнага атрымання прафесіі і працаўладкавання. Практычныя работы па падраздзеле «Жывёлагадоўля» арганізуюцца з улікам магчымасцей вучэбна-матэрыяльнай базы ўстановы адукацыі.

Пры арганізацыі навучання па раздзеле «Рамонтныя работы ў быце» ўлічваецца не толькі значнасць засваення гэтых работ для забеспячэння самастойнасці ў быце, але і перспектывы далейшага атрымання прафесій «маляр» і «тынкоўшчык». З улікам пастаяннага з’яўлення новых апрацоўчых матэрыялаў пры планаванні вучэбных заняткаў па гэтым раздзеле настаўнік можа пашырыць звесткі па матэрыялазнаўстве. Прадугледжваецца правядзенне ўнутраных тынкавальных і малярных работ у будынках, работ на прышкольным участку з выключэннем работ на вышыні.

Вывучэнне раздзела «Асновы гатавання ежы» арганізуецца не толькі для вырашэння задачы забеспячэння самастойнасці быту, але і з улікам таго, што пэўная частка асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю працаўладкоўваецца на прадпрыемствах грамадскага харчавання. Падрыхтоўка па гэтым раздзеле можа аказаць прамы ўплыў на паспяховасць сацыяльна-прафесійнай адаптацыі выпускнікоў.

У межах раздзела «Мастацкая апрацоўка матэрыялаў» для вывучэння могуць выбірацца асобныя яго падраздзелы. Пры выбары падраздзелаў «Разьба па дрэве» і «Ручная вышыўка» ўлічваецца, што іх змест фактычна дапаўняе змест раздзелаў «Апрацоўка драўніны» і «Апрацоўка тканін» адпаведна. Таму спалучэнне вывучэння гэтых раздзелаў з вывучэннем названых падраздзелаў раздзела «Рамёствы» варта разглядаць як вывучэнне аднаго раздзела.

Змест і тэрміны пачатку магчымага вывучэння падраздзела «Разьба па дрэве» (у VIII класе) вызначаны з улікам неабходнасці папярэдняга авалодання вучнямі разметкай загатовак, пілаваннем і габляваннем

драўніны, а таксама апрацоўкай драўніны стамескамі, якое забяспечваецца на вучэбных занятках па раздзеле «Апрацоўка драўніны» ў VI–VII класах.

У межах раздзела «Мастацкая апрацоўка матэрыялаў» установа адукацыі мае права таксама планаваць і ажыццяўляць навучанне па раздзелах варыятыўных кампанентаў вучэбнай праграмы «Працоўнае навучанне. Абслуговая праца. V–IX класы» і вучэбнай праграмы «Працоўнае навучанне. Тэхнічная праца. V–IX класы» для ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

7. Указаная ў дадзенай вучэбнай праграме мінімальная колькасць вучэбнага часу на вывучэнне асобных раздзелаў, падраздзелаў вучэбнай праграмы можа быць павялічана ў межах агульнай колькасці вучэбнага часу, адведзенага вучэбным планам на працоўнае навучанне, наступным чынам:

па раздзелах «Тэхнічная графіка», «Электрычнасць», «Прафесійнае самавызначэнне» – да 12 гадзін на навучальны год у кожным класе;

па раздзелах «Апрацоўка тканін», «Апрацоўка драўніны», «Апрацоўка металаў», «Рамонтныя работы ў быце», «Раслінаводства і жывёлагадоўля» – да 140 гадзін на навучальны год у VI–VII класах, да 175 гадзін на навучальны год у VIII–IX класах, да 280 гадзін на навучальны год у X класе;

па раздзеле «Асновы гатавання ежы» – да 70 гадзін на навучальны год у кожным класе;

па раздзеле «Мастацкая апрацоўка матэрыялаў» на вывучэнне падраздзела «Ручная вышыўка» ў спалучэнні з раздзелам «Апрацоўка тканін» у VI–X класах і падраздзела «Разьба па дрэве» ў VIII–X класах – да 70 гадзін на навучальны год;

на вывучэнне падраздзела «Пляценне з лазовага прута» раздзела «Мастацкая апрацоўка матэрыялаў» – да 105 гадзін на навучальны год у кожным класе.

Калі падраздзел «Ручная вышыўка» раздзела «Мастацкая апрацоўка матэрыялаў» вывучаецца замест раздзела «Апрацоўка тканін», то на яго вывучэнне рэкамендуецца адводзіць столькі ж вучэбнага часу, колькі на вывучэнне раздзела «Апрацоўка тканін».

Для дыферэнцыяцыі аб’ёму вучэбнага часу ўнутры раздзелаў рэкамендуецца: выкананне ўсіх або часткі вырабаў, пералік якіх у праграме з’яўляецца прыкладным; вар’іраванне аб’ёму вучэбнага часу на вучэбныя заняткі практычнага паўтарэння.

У X класе з улікам магчымасцей, якія рэальна даюцца ў розных умовах арганізацыі навучання (спецыяльнай школе, спецыяльнай школе-інтэрнаце, ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі), рэкамендуецца аб’ём вучэбнага часу размяркаваць так, каб асноўная яго частка была адведзена

на вывучэнне раздзела, які забяспечвае пераемнасць навучання з установай адукацыі, якая рэалізуе адукацыйную праграму прафесійна-тэхнічнай адукацыі, забяспечвае атрыманне кваліфікацыі рабочага (служачага), або з класамі з паглыбленай сацыяльнай і прафесійнай падрыхтоўкай.

Вучэбны час, які вылучаецца на вывучэнне кожнага раздзела, падраздзела вучэбнай праграмы на навучальны год, можа канцэнтравацца ў пэўным паўгоддзі (вучэбнай чвэрці) або раўнамерна размяркоўвацца на працягу навучальнага года з улікам умоў навучання (спецыяльная школа, спецыяльная школа-інтэрнат, установы агульнай сярэдняй адукацыі), сезоннасці работ, якія вывучаюцца, у галіне раслінаводства і жывёлагадоўлі і іншых умоў. Раздзелы, навучанне па якіх пачата раней, працягваюць вывучацца ва ўсіх наступных класах. Іх замена на іншыя раздзелы не прадугледжваецца.

Дапускаецца правядзенне вучэбных заняткаў з вучнямі адной групы па розных раздзелах, падраздзелах рознымі настаўнікамі з улікам іх прафесійнай падрыхтоўкі.

8. З мэтай забеспячэння аб’ёму працоўнага навучання ў адпаведнасці з вучэбным планам першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю з вучнямі, якія навучаюцца ў класах інтэграванага навучання і выхавання, вучэбныя заняткі па вучэбным прадмеце «Працоўнае навучанне» праводзяцца асобна, у складзе агульнай групы свайго класа, а таксама могуць праводзіцца ў складзе груп іншых класаў (не ніжэй за V клас). Напрыклад, вучэбныя заняткі па працоўным навучанні з вучнямі VI класа могуць быць арганізаваны ў складзе груп V, VI і VII класаў з улікам таго, што ў VI класе інтэграванага навучання і выхавання вучні з лёгкай інтэлектуальнай недастатковасцю звычайна навучаюцца па вучэбных праграмах VII класа першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната для вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю. Магчыма выкарыстанне іншых аптымальных для ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі варыянтаў аб’яднання вучняў розных класаў.

9. Вучэбны матэрыял кожнага з раздзелаў вучэбнай праграмы размеркаваны па гадах навучання і па тэмах. Змест вучэбнага матэрыялу (глава 2) структураваны наступным чынам: вызначаны звесткі, якія вывучаюцца, практычныя работы, якія выконваюцца, вырабы (аб’екты работы), па асобных тэмах – практыкаванні, назіранні і экскурсіі; у кожным раздзеле пазначаны чаканыя вынікі па класах (патрабаванні, якія ўказаны на папярэдніх гадах навучання, затым не паўтараюцца).

Па кожнай тэме ўказаны тыя звесткі, якія ў дадзены перыяд навучання з’яўляюцца для вучняў новымі; замацаванне раней атрыманых звестак плануецца настаўнікам.

Пералік вырабаў і практычных работ у вучэбнай праграме прыкладны. Вырабы могуць быць заменены настаўнікам. Ён мае права планаваць стварэнне вырабаў і выкананне не ўказаных у гэтай вучэбнай праграме практычных работ з улікам іх адпаведнасці вывучаемым звесткам і тэхналагічным аперацыям.

Патрабаванні да ведаў і ўменняў вучняў вызначаны з улікам таго, што ўменні выконваць тэхналагічныя аперацыі, практычныя работы, ствараюць вырабы ўключаюць выкананне ў працэсе работы санітарна-гігіенічных патрабаванняў, правіл арганізацыі вучэбнага месца і правіл бяспечных паводзін. Патрабуецца забеспячэнне кампетэнтнасці вучняў у гэтай галіне на ўзроўні практычнага валодання гэтымі патрабаваннямі і правіламі, якое вызначаецца ўменнем іх упэўненага самастойнага прымянення.

Размеркаванне тэм па перыядах навучання (паўгоддзях, вучэбных чвэрцях) і аб’ём іх вывучэння ўдакладняюцца настаўнікам і адлюстроўваюцца ў дакументацыі, якая плануецца. Паслядоўнасць вывучэння некаторых тэм можа змяняцца.

10. Навучанне па кожным раздзеле рэкамендуецца пачынаць з уступных урокаў (заняткаў). На іх вывучаюцца санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбных месцаў, бяспечных паводзін пры рабоце ў вытворчых (вучэбна-вытворчых) майстэрнях (кабінеце і іншых умовах), іх абсталяванне, размяркоўваюцца грамадскія даручэнні, вызначаюцца задачы работы на канкрэтны перыяд. У далейшым такія заняткі праводзяцца па меры неабходнасці (звычайна ў пачатку года).

11. Практычныя работы выконваюцца вучнямі на вучэбным абсталяванні. Заняткі праводзяцца пры строгім выкананні правіл бяспечных паводзін, проціпажарнай бяспекі і санітарна-гігіенічных патрабаванняў.

12. Настаўнік мае права самастойна вылучыць выкананне больш працаёмкіх, у тым ліку не ўказаных у вучэбнай праграме, вырабаў у асобныя тэмы. Для хлопчыкаў, якія вывучаюць апрацоўку тканін, рэкамендаваныя вучэбнай праграмай вырабы жаночага асартыменту замяняюцца на вырабы мужчынскага асартыменту ці прадметы хатняга ўжытку.

На заняткі практычнага паўтарэння пераважна плануецца выкананне знаёмых вырабаў (практычных работ).

13. Самастойныя і кантрольныя работы праводзяцца па адной або некалькіх тэмах за кошт вылучанага на іх вучэбнага часу ў межах 4–5 % ад яго агульнага аб’ёму.

14. На вучэбных занятках выкарыстоўваюцца франтальныя, групавыя, парныя і індывідуальныя формы навучання. Іх выбар ажыццяўляецца з улікам умоў арганізацыі навучання і задач вывучэння канкрэтнай тэмы.

Метады навучання прымяняюцца з улікам магчымасцей і спецыфікі выкарыстання слоўных і наглядных сродкаў навучання, элементаў праблемнага навучання, неабходнасці спецыяльнай арганізацыі дзейнасці вучняў, этапаў вучэбных заняткаў.

15. Асноўныя патрабаванні да вынікаў навучання сфармуляваны ў вучэбнай праграме па класах. З улікам розных магчымасцей вучняў у авалоданні як агульнапрацоўнымі ўменнямі, так і тэхналагічнымі аперацыямі вучэбная праграма з'яўляецца рознаўзроўневай.

Узроўні складанасці вызначаюцца асобна ў адносінах да агульнапрацоўных уменняў і асобна ў адносінах да засваення тэарэтычнага матэрыялу і практычных работ асобных тэм.

Навучанне па першым узроўні складанасці па кожным раздзеле вучэбнай праграмы ў межах развіцця агульнапрацоўных уменняў прадугледжвае, што вучні кожнага класа павінны ўмець самастойна або з мінімальнай дапамогай настаўніка арыентавацца ў заданнях, планаваць і кантраляваць выкананне заданняў (практычных работ), прадугледжаных у гэтым класе. Пры навучанні па другім узроўні складанасці дасягненне такой самастойнасці прадугледжваецца на занятках практычнага паўтарэння пры выкананні заданняў (практычных работ), прадугледжаных у папярэдніх класах, або падобных да іх.

Пры навучанні па першым узроўні складанасці ўказаныя ў вучэбнай праграме звесткі і практычныя работы вывучаюцца ў поўным аб'ёме. Пры навучанні па другім узроўні складанасці праграмны матэрыял скарачаецца наступным чынам.

Апрацоўка драўніны. Могуць не вывучацца тэмы: «Выпальванне» (VI клас), «Разьба па дрэве» (VII клас), «Свідраванне адтулін на станку» (VIII клас), «Такарныя работы» (IX клас).

Апрацоўка металаў. Могуць не вывучацца тэмы: «Свідраванне і зенкаванне адтулін» (VIII клас), «Такарна-шрубарэзны станок» (IX клас), «Абточванне цыліндрычных паверхняў на такарным станку» (X клас), «Свідраванне на такарным станку» (X клас).

Апрацоўка тканін. Ва ўсіх класах дазваляецца работа па гатовай выкрайцы. У IX–X класах не з'яўляецца абавязковым пашыў часткі ці ўсіх рэкамендаваных паясных і плечавых вырабаў. Яны могуць быць заменены на іншыя, у тым ліку ўказаныя ў вучэбнай праграме, або могуць быць спланаваны ўрокі практычнага паўтарэння.

Рамонтныя работы ў быце. У X класе можа не вывучацца тэма «Планаванне рамонтных работ».

Найважнейшым вынікам працоўнага навучання з'яўляецца таксама авалоданне вучнямі сацыяльнымі ўменнямі: прымаць у выпадку неабходнасці дапамогу пры выкананні практычнай работы;

узаемадзейнічаць з іншымі вучнямі ў працэсе выканання практычных работ.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### ТЭХНІЧНАЯ ГРАФІКА
### VI клас (10 гадзін)

#### Пачатковыя звесткі аб тэхнічным малюнку, чарцяжы, эскізе (5 гадзін)

Тэхнічны малюнак, чарцёж, эскіз як спосабы выяўлення прадметаў, іх прызначэння і адрознення. Выкарыстанне тэхнічных малюнкаў, чарцяжоў, эскізаў пры выкананні швейных (сталярных, слясарных) вырабаў. Лініі чарцяжа. Міліметр як асноўная адзінка вымярэння ў чарчэнні. Абазначэнне і нанясенне памераў.

Практыкаванні ў распазнаванні тэхнічнага малюнка, чарцяжа, эскіза. Практыкаванні ў чытанні найпрасцейшых тэхнічных малюнкаў і чарцяжоў вырабаў, якія выконваюцца на ўроках па апрацоўцы тканін (драўніны, металаў).

#### Пачатковыя прыкладныя геаметрычныя пабудовы (5 гадзін)

Лінейка, яе будова і прызначэнне (паўтарэнне). Чарцёжныя вугольнікі, іх будова і прызначэнне. Паслядоўнасць пабудовы геаметрычных фігур па зададзеных памерах. Алоўкі, іх адрозніванне па цвёрдасці-мяккасці.

Практычныя работы. Пабудова квадрата, прамавугольніка, трохвугольніка па зададзеных памерах. Пабудова прамога вугла і вугла 45° (вугал, роўны палове прамога вугла).

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
### ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

прызначэнне і адрозненні тэхнічнага малюнка, чарцяжа, эскіза як спосабаў выяўлення прадметаў.

Вучні ўмеюць:

карыстацца лінейкай, чарцёжным вугольнікам, выконваць пабудову квадрата, прамавугольніка, трохвугольніка па зададзеных памерах, прамога вугла і вугла 45°.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

пачатковыя звесткі аб тэхнічным малюнку, чарцяжы, эскізе на вучэбных занятках па іншых раздзелах вучэбнай праграмы;

прыкладныя геаметрычныя пабудовы ў працэсе выканання разметкі на вучэбных занятках па іншых раздзелах вучэбнай праграмы.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб чарцёжна-вымяральных інструментах пры іх самастойным падборы на вучэбных занятках па працоўным навучанні і ў быце.

## VII КЛАС (10 гадзін)

### Дзяленне акружнасці на роўныя часткі, пабудова правільных многавугольнікаў (5 гадзін)

Цыркуль, яго будова і прызначэнне. Правілы правядзення акружнасцей цыркулем. Правілы бяспекі пры рабоце з цыркулем.

Абазначэнне на чарцяжы радыуса і дыяметра. Спосабы дзялення акружнасці на 2, 4, 3, 6, 5 роўных частак.

Практычныя работы. Дзяленне акружнасці на 2, 4, 3, 6, 5 роўных частак. Пабудова ў крузе правільных многавугольнікаў.

### Маштаб (5 гадзін)

Паняцце маштабу. Умоўнае абазначэнне маштабу. Неабходнасць выкарыстання маштабаў.

Практыкаванні ў вызначэнні маштабу.

Практычная работа. Пабудова геаметрычных фігур у маштабе 1:1, 1:2, 2:1.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

прызначэнне і будову цыркуля;

абазначэнне на чарцяжы радыуса і дыяметра;

спосабы дзялення акружнасці на 2, 4, 3, 6, 5 роўных частак;

паняцце і ўмоўнае абазначэнне маштабу.

Вучні ўмеюць:

дзяліць акружнасць на роўныя часткі;

выконваць пабудову ў крузе правільных многавугольнікаў;

выконваць пабудову геаметрычных фігур у маштабе 1:1, 1:2, 2:1.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

звесткі аб цыркулі і маштабе пры выкананні практычных работ на вучэбных занятках па іншых раздзелах вучэбнай праграмы.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб маштабе пры самастойным яго вызначэнні на вучэбных занятках па працоўным навучанні і ў быце.

## VIII КЛАС (8 гадзін)

### Прамавугольнае праецыраванне (4 гадзіны)

Уяўленне аб праецыраванні як спосабе атрымання выявы прадметаў. Уяўленне аб плоскасцях праекцый. Віды спераду (галоўны), зверху, злева і размяшчэнне іх на чарцяжы. Выбар галоўнага віду.

Выяўленне на чарцяжы нябачных частак паверхні прадмета.

Назіранні за пабудовай куба і прамавугольнага паралелепіпеда настаўнікам у прамавугольных праекцыях.

Практыкаванні. Знаходжанне на відах спераду, зверху і злева частак прадмета. Мадэляванне са скрыначак канструкцый, прадстаўленых на чарцяжах.

### Пабудова вуглоў з дапамогай транспарціра (4 гадзіны)<br>(практычнае паўтарэнне геаметрычнага матэрыялу<br>ўрокаў матэматыкі)

Градус як адзінка вымярэння вуглоў. Прызначэнне і будова транспарціра. Паняцце прамога, вострага, тупога, разгорнутага і поўнага вуглоў.

Практыкаванні. Вымярэнне транспарцірам велічыні вуглоў. Запіс вынікаў вымярэнняў. Пабудова вуглоў зададзенай градуснай велічыні.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ<br>ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

аб праецыраванні як спосабе атрымання выявы прадметаў;

прызначэнне і будову транспарціра.

Вучні ўмеюць:

знаходзіць на відах спераду, зверху і злева часткі прадмета;

мадэляваць са скрыначак канструкцыі, прадстаўленыя на чарцяжах;

выконваць вымярэнне велічыні вуглоў і пабудову вуглоў зададзенай градуснай велічыні з дапамогай транспарціра.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

звесткі аб праецыраванні пры чытанні графічных выяў на вучэбных занятках па іншых раздзелах вучэбнай праграмы.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб транспарціры і ўменні працаваць з транспарцірам для выканання вымярэнняў і пабудоў вуглоў на вучэбных занятках па працоўным навучанні пры рашэнні найпрасцейшых канструктыўных задач.

## IX КЛАС (8 гадзін)

Аксанаметрычныя праекцыі і тэхнічны малюнак (4 гадзіны)

Уяўленне аб выяве прадмета на тэхнічным малюнку (без азнаямлення з назвамі праекцый).

Практыкаванні. Размяшчэнне прадметаў (табурэта, століка ці іншых) у адпаведнасці з іх выявай на тэхнічным малюнку. Знаходжанне частак прадмета на тэхнічным малюнку і чарцяжы.

Аналіз геаметрычнай формы прадметаў (4 гадзіны)

Геаметрычныя целы (паўтарэнне геаметрычнага матэрыялу).

Практыкаванне. Выяўленне геаметрычнай формы прадмета па яго выяве.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

аб магчымасці markознага выяўлення прадмета на тэхнічным малюнку.

Вучні ўмеюць:

размяшчаць прадметы ў адпаведнасці з іх выявай на тэхнічным малюнку, знаходзіць часткі прадмета на тэхнічным малюнку і чарцяжы, вызначаць па тэхнічным малюнку геаметрычную форму прадметаў і іх частак.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

звесткі пра выявы прадметаў на тэхнічных малюнках у працэсе работы з дадзеным відам тэхнічнай нагляднасці на вучэбных занятках па іншых раздзелах вучэбнай праграмы.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменні вызначаць геаметрычную форму прадметаў у працэсе рашэння найпрасцейшых канструктыўных задач.

X КЛАС (8 гадзін)

Спалучэнні (8 гадзін)

Паняцце спалучэння. Пункт спалучэння. Віды спалучэнняў. Паслядоўнасць выканання разметкі спалучэнняў.

Практыкаванні. Спалучэнне паралельных прамых з дугой. Спалучэнне перасякальных прамых з дугой (скругленне прамога, вострага і тупога вуглоў).

Практычная работа. Выкананне спалучэнняў у працэсе разметкі швейных (сталярных, слясарных) вырабаў.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

віды спалучэнняў.

Вучні ўмеюць:

выконваць спалучэнні паралельных прамых з дугой і перасякальных прамых з дугой (скругленне прамога, вострага і тупога вуглоў).

Вучні ведаюць і прымяняюць:

прыёмы выканання спалучэнняў у працэсе разметкі швейных (сталярных, слясарных) вырабаў.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб спалучэннях пры рашэнні найпрасцейшых канструктыўных задач.

## АПРАЦОЎКА ДРАЎНІНЫ
## VI КЛАС (60 гадзін)

### Уступныя заняткі (2 гадзіны)

Арганізацыя і абсталяванне сталярнай майстэрні (майстэрні па апрацоўцы драўніны). Небяспечныя фактары пры рабоце ў майстэрні. Санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы бяспечных паводзін на занятках па апрацоўцы драўніны. Вучэбнае месца. Прызначэнне і будова сталярнага варштата. Размяшчэнне на варштаце інструментаў і матэрыялаў. Захоўванне інструментаў і рабочага адзення. Задачы навучання апрацоўцы драўніны. Прафесіі рабочых у дрэваапрацоўчай прамысловасці. Прафесія сталяра.

Практыкаванне. Замацаванне нарыхтовак з дапамогай шрубавых заціскаў.

### Агульныя звесткі аб драўніне (4 гадзіны)

Паняцце аб драўніне. Часткі дрэва і іх выкарыстанне. Агульныя звесткі аб нарыхтоўцы драўніны. Лесаматэрыялы, іх прымяненне.

Практыкаванне. Вызначэнне частак дрэва.

### Разметка бруска па лінейцы і вугольніку (8 гадзін)

Элементы бруска: пласць, кант, тарэц, рабро бруска. Патрабаванні да верхняй пласці і канта, іх абазначэнне на загатоўцы.

Міліметр як асноўная адзінка вымярэння ў сталярнай справе. Прызначэнне і будова вымяральнай лінейкі і сталярнага вугольніка. Арганізацыя вучэбнага месца пры выкананні разметкі.

Паслядоўнасць і правілы разметкі па лінейцы і вугольніку. Паняцце прыпуску. Тэхнічны малюнак бруска, абазначэнне на ім памераў.

Практычныя работы. Вымярэнне памераў бруска на загатоўцы. Чытанне памераў на тэхнічным малюнку. Перанясенне памераў на брусок. Правядзенне ліній разметкі па вугольніку.

Пілаванне ў стусле па лініях разметкі[1] (14 гадзін)

Інструменты і прыстасаванні для пілавання ў стусле: стусла, нажоўка; іх прызначэнне і будова.

Прамы вугал. Вугал, роўны палове прамога вугла.

Рабочая поза, хватка інструмента (нажоўкі). Паслядоўнасць і правілы выканання пілавання ў стусле. Кантроль якасці пілавання.

Напільнікі, іх віды, выкарыстанне для зачысткі дэталей з драўніны. Рабочая поза, хватка інструмента, прыёмы работы напільнікам.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры пілаванні і зачыстцы дэталей з драўніны.

Практычныя работы. Замацаванне стусла ў заціску варштата. Пілаванне ў стусле па лініях разметкі пад прамым вуглом і пад вуглом 45°. Праверка прамалінейнасці адпілаванай дэталі. Зачыстка дэталей напільнікам.

Вырабы. Цацачны будаўнічы матэрыял з гатовых брускоў, дэталі цацак (мадэлей мэблі і транспарту).

Зборка вырабаў на цвіках і на клеі.
Выраб нерухомых цацак (8 гадзін)

Спосабы злучэння дэталей сталярных вырабаў.

Віды цвікоў, іх прызначэнне. Інструменты: малаток, шыла, абцугі, цвікадзёр; іх прызначэнне і будова. Правілы злучэння дэталей цвікамі. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні злучэнняў на цвіках.

Віды клеяў для злучэння драўляных канструкцый. Клей ПВА, яго ўласцівасці. Пэндзлі для нанясення клею. Правілы нанясення клею і правілы злучэння дэталей. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры рабоце з клеем.

Шліфавальная шкурка, яе прызначэнне, адрозніванне па зярністасці. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры шліфаванні вырабаў з драўніны.

Практычныя работы. Разметка па шаблонах месцаў злучэння дэталей на цвіках. Наколванне адтулін шылам. Зборка вырабаў. Шліфаванне вырабаў.

Вырабы. Мадэлі мэблі і транспарту.

Мастацкая апрацоўка драўніны[2] (12 гадзін)

---

[1] Калі гэта тэма вывучалася ў V класе, то яе матэрыял прапануецца вучням у якасці практычнага паўтарэння.

[2] Калі гэта тэма вывучалася ў V класе, то яе матэрыял прапануецца вучням у якасці практычнага паўтарэння.

Лобзік, яго прызначэнне і будова. Выпіловачны столік, яго мацаванне да варштата. Капіравальная папера. Правілы пераводу малюнка праз капіравальную паперу. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выпілоўванні лобзікам.

Будова і прымяненне прыбора для выпальвання. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры рабоце з электравыпальвальнікам.

Практычныя работы. Выпілоўванне лобзікам: падбор фанеры, перавод малюнка праз капіравальную паперу, праколванне адтулін ва ўнутраных контурах. Выпілоўванне ўнутраных контураў, выпілоўванне па знешніх контурах, апрацоўка вырабу.

Выпальванне: перавод малюнка праз капіравальную паперу, выпальванне.

Вырабы. Літары для стэндаў, фігуркі звяроў і птушак.

Практычнае паўтарэнне (12 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках па апрацоўцы драўніны;

агульныя звесткі аб прафесіях рабочых у дрэваапрацоўчай прамысловасці, прафесіі сталяра;

часткі дрэва, звесткі аб нарыхтоўцы драўніны, лесаматэрыялах і іх прымяненні;

прызначэнне і будову сталярнага варштата, інструментаў, якія вывучаліся, і прыстасаванняў для пілавання ў стусле, разметкі бруска, выканання злучэнняў на цвіках і на клеі, выпілоўвання, выпальвання;

элементы бруска: пласць, кант, тарэц, рабро бруска; патрабаванні да верхняй пласці і канта, іх абазначэнне на загатоўцы;

паняцце прыпуску;

прызначэнне, прымяненне і віды цвікоў;

прызначэнне шліфавальнай шкуркі;

клеявыя саставы: сталярны клей, клей полівінілацэтатны;

тэхналогію выканання тэхналагічных аперацый пілавання, шліфавання, разметкі, злучэння дэталей на цвіках і на клеі, выпілоўвання лобзікам, выпальвання;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць пілаванне ў стусле; шліфаванне; разметку бруска па лінейцы і вугольніку; злучэнні дэталей з драўніны на цвіках і на клеі; выпілоўванне лобзікам; выпальванне.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па апрацоўцы драўніны і пры рабоце з драўнінай у працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб драўніне і тэхналогіі яе апрацоўкі пры вырашэнні праблемных сітуацый у працэсе арыенціроўкі ў заданні і пры планаванні работы.

## VII КЛАС (60 гадзін)

### Агульныя звесткі аб драўніне (4 гадзіны)

Пароды драўніны (хвойныя, ліставыя). Уласцівасці (колер, пах, цвёрдасць) драўніны розных парод. Тэкстура драўніны.

Піламатэрыялы, іх віды і прызначэнне.

Практыкаванні ў распазнаванні відаў піламатэрыялаў.

### Выраб скрынкі з гатовых рэек і фанеры (4 гадзіны)

Выкарыстанне фанеры ў сталярных вырабах. Будова фанеры. Падбор цвікоў з улікам таўшчыні фанеры і рэек. Правілы зборкі скрынкі.

Практычныя работы. Шліфаванне дэталей. Зборка скрынкі. Кантроль якасці вырабу.

Вырабы. Скрынкі.

### Чарцёж вырабу (2 гадзіны)

Прызначэнне чарцяжа. Лініі чарцяжа. Маштаб.

Практыкаванні ў чытанні чарцяжоў будучых вырабаў.

### Разметка рэйсмусам (4 гадзіны)

Прызначэнне і будова рэйсмуса. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры рабоце з рэйсмусам. Устаноўка рэйсмуса на зададзены памер. Выбар базавага боку бруска.

Практычная работа. Разметка загатовак з драўніны.

Аб’екты работы. Загатоўкі для будучых вырабаў (падстаўка для алоўкаў і іншыя).

### Пілаванне (6 гадзін)

Валокны драўніны. Віды пілавання: упоперак валокнаў, уздоўж валокнаў. Прыёмы пілавання. Прычыны браку пры пілаванні. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры пілаванні.

Практычныя работы. Разметка загатоўкі і яе мацаванне ў заднім заціску варштата. Пілаванне ўпоперак валокнаў. Кантроль якасці работы лінейкай, вугольнікам.

Аб’екты работы. Загатоўкі для будучых вырабаў (падстаўка для алоўкаў і іншыя).

Габляванне (6 гадзін)

Інструменты для габлявання. Прызначэнне і асноўныя часткі рубанка. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры габляванні. Паслядоўнасць габлявання. Прыёмы габлявання. Улік напрамку валокнаў пры габляванні драўніны. Паняцце дыяганалі. Вызначэнне цэнтра квадрата і прамавугольніка правядзеннем дыяганалей.

Практычныя работы. Разметка загатовак. Габляванне загатовак па памерах. Вызначэнне цэнтра на тарцы загатоўкі. Скругленне вуглоў бруска. Шліфаванне дэталей.

Аб’екты работы. Загатоўкі для будучых вырабаў (падстаўка для алоўкаў і іншыя).

Свідраванне адтулін ручнымі інструментамі (4 гадзіны)

Калаўрот, ручны дрыль; іх прызначэнне і будова. Свердлы. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры свідраванні адтулін ручнымі інструментамі.

Практычныя работы. Разметка месцаў для свідравання адтулін на загатоўцы. Мацаванне свердла ў патроне. Замацаванне дэталі. Свідраванне скразных адтулін.

Выраб. Падстаўка для алоўкаў (ці іншыя).

Зборка вырабаў з драўніны на шрубах (4 гадзіны)

Прызначэнне і віды шруб. Выбар адвёрткі для ўкручвання шруб. Правілы злучэння дэталей на шрубах. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры зборцы вырабаў з драўніны на шрубах.

Практычная работа. Склейванне асноўнай часткі падстаўкі для алоўкаў з асновай, злучэнне дэталей шрубамі.

Выраб. Падстаўка для алоўкаў.

Зборка вырабаў па чарцяжы (4 гадзіны)

Практыкаванні ў чытанні чарцяжоў вырабаў.

Практычная работа. Зборка вырабаў па чарцяжы.

Вырабы. Палічка, насілкі, лапатка ці іншыя па выбары настаўніка.

Апрацоўка вырабаў з драўніны (4 гадзіны)

Прызначэнне і віды апрацоўкі. Матэрыялы для празрыстай апрацоўкі. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры апрацоўцы драўніны. Прыёмы выканання празрыстай апрацоўкі вырабаў з драўніны.

Практычная работа. Апрацоўка раней выкананых вырабаў з драўніны лакам на воднай аснове.

Мастацкая апрацоўка драўніны (6 гадзін)

Прызначэнне і віды разьбы па дрэве. Пароды драўніны для разьбярства па дрэве і патрабаванні да якасці матэрыялу. Інструменты для разьбы па дрэве. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры разьбе па дрэве.

Практычныя работы. Нанясенне малюнка і выкананне найпрасцейшай контурнай разьбы. Апрацоўка вырабу.

Вырабы. Дэкаратыўныя пласціны і іншыя.

Практычнае паўтарэнне (12 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:
пароды драўніны і ўласцівасці драўніны розных парод; тэкстуру драўніны; піламатэрыялы, іх віды і прызначэнне;
прызначэнне і будову рэйсмуса, піл, рубанка, шыла, калаўрота, ручнога дрыля, інструментаў для разьбы па дрэве;
віды пілавання; прычыны браку пры пілаванні;
прызначэнне і віды шруб;
прызначэнне і віды апрацоўкі;
прызначэнне і віды разьбы па дрэве;
тэхналогію выканання разметкі рэйсмусам, пілавання ўпоперак валокнаў, габлявання драўніны, свідравання адтулін ручнымі інструментамі, празрыстай апрацоўкі вырабаў з драўніны, контурнай разьбы;
правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.
Вучні ўмеюць:
выконваць разметку рэйсмусам, пілаванне ўпоперак валокнаў; габляванне рубанкам; зборку вырабаў па чарцяжы; свідраванне адтулін ручнымі інструментамі; зборку вырабаў з драўніны на шрубах; празрыстую апрацоўку вырабаў з драўніны лакамі на воднай аснове; контурнае разьбярства.
Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па апрацоўцы драўніны і пры рабоце з драўнінай у працэсе пазаўрочнай дзейнасці.
Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:
веды аб драўніне і тэхналогіі яе апрацоўкі пры вырашэнні праблемных сітуацый у працэсе арыенціроўкі ў заданні і пры планаванні работы.

## VIII КЛАС (46 гадзін)

### Агульныя звесткі аб драўніне (2 гадзіны)

Унутраная будова драўнянага ствала на папярочным (тарцовым) разрэзе (сарцавіна, ядро, абалона, камбій, кара). Гадавыя кольцы. Сарцавінныя прамяні.

Ліставыя драўняныя матэрыялы, іх віды, уласцівасці, прымяненне.

Практыкаванні. Распазнаванне слаёў драўніны. Распазнаванне відаў ліставых драўняных матэрыялаў.

### Пілаванне (6 гадзін)

Віды пілавання драўніны. Інструменты для пілавання драўніны ўздоўж валокнаў. Падрыхтоўка лучковай пілы да работы. Прыёмы пілавання драўніны ўздоўж валокнаў. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры пілаванні драўніны ўздоўж валокнаў.

Практычныя работы. Разметка загатовак. Пілаванне загатовак уздоўж валокнаў.

Аб’екты работы. Загатоўкі для будучых вырабаў.

### Вуглавое злучэнне ў палову таўшчыні бруска (10 гадзін)

Прымяненне і канструкцыя вуглавога злучэння брускоў у палову таўшчыні бруска. Паслядоўнасць выканання запілоўвання. Забеспячэнне трываласці злучэння шчыльнасцю падгонкі, склейваннем, шрубамі. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні вуглавых злучэнняў у палову таўшчыні бруска.

Практычныя работы. Падрыхтоўка брускоў да разметкі. Разметка брускоў у палову іх таўшчыні. Запілоўванне брускоў. Падгонка злучэнняў. Зборка злучэнняў. Апрацоўка выкананага вырабу.

Вырабы. Рамкі, стэнды ці іншыя вырабы.

### Пасярэдняе злучэнне ў палову таўшчыні бруска (10 гадзін)

Стамеска. Прымяненне, будова і памеры стамесак. Прыёмы работы стамескай. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні пасярэдніх злучэнняў у палову таўшчыні бруска.

Практычныя работы. Падрыхтоўка брускоў да разметкі. Разметка брускоў у палову іх таўшчыні. Запілоўванне брускоў. Выдаленне драўніны стамескай. Падгонка злучэнняў. Зборка злучэнняў. Апрацоўка выкананага вырабу.

Вырабы. Стэнды ці іншыя вырабы для кветак.

Свідраванне адтулін на станку (8 гадзін)

Свідравальны станок, яго прызначэнне і асноўныя часткі, прынцып дзеяння. Віды свердлаў. Падрыхтоўка свідравальнага станка да работы, прыёмы кіравання. Арганізацыя вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры свідраванні на свідравальным станку.

Практыкаванні. Устаноўка свердла ў патроне. Замацаванне загатоўкі. Падача свердла да загатоўкі пры выключаным станку.

Практычныя работы. Падрыхтоўка загатовак для падстаўкі для алоўкаў. Падрыхтоўка свідравальнага станка да работы. Разметка цэнтраў адтулін. Свідраванне скразных адтулін на свідравальным станку. Склейванне асноўнай часткі падстаўкі для алоўкаў з асновай. Апрацоўка выкананага вырабу.

Практычнае паўтарэнне (10 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

унутраную будову драўнянага ствала на папярочным разрэзе;

інструменты для пілавання драўніны ўздоўж валокнаў; прымяненне і будову стамескі; прызначэнне і асноўныя часткі, прынцып дзеяння свідравальнага станка; віды свердлаў;

тэхналогію пілавання ўздоўж валокнаў, злучэння брускоў упаўдрэва (вуглавое злучэнне ў палову таўшчыні бруска, пасярэдняе злучэнне ў палову таўшчыні бруска), свідравання адтулін на свідравальным станку;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць пілаванне драўніны ўздоўж валокнаў, сталярныя вырабы з прымяненнем злучэння брускоў упаўдрэва, свідраванне адтулін на свідравальным станку.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па апрацоўцы драўніны і пры рабоце з драўнінай у працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб драўніне і тэхналогіі яе апрацоўкі пры вырашэнні праблемных сітуацый у працэсе арыенціроўкі ў заданні і пры планаванні работы.

## IX КЛАС (46 гадзін)

### Заганы драўніны (2 гадзіны)

Заганы драўніны. Агульныя звесткі аб заганах драўніны, іх уплыве на якасць вырабаў. Асноўныя заганы драўніны (сучкі, расколіны, заганы формы ствала і будовы, грыбныя пашкоджанні, хімічныя афарбоўкі, пашкоджанні насякомымі).

Практычная работа. Вывучэнне заган драўніны.

### Уласцівасці і прымяненне драўніны мяккіх і цвёрдых парод (2 гадзіны)

Віды мяккіх парод драўніны: ліпа, алешына, асіна, хвоя і іншыя. Віды цвёрдых парод драўніны: дуб, ясень, граб, бук і іншыя. Знешнія прыметы, уласцівасці і ўжыванне драўніны асобных парод.

Віды сушкі драўніны. Правілы выканання сушкі і захоўвання драўніны.

Практыкаванні ў распазнаванні парод драўніны па ўзорах.

### Падрыхтоўка загатовак (6 гадзін)

Практычная работа. Падрыхтоўка загатовак (разметка, пілаванне, струганне) для наступных заняткаў.

Аб’екты работы. Загатоўкі калодкі для швабры, крыжавіны падставак, рамак, стэндаў, трапіка-рашоткі або іншых вырабаў.

### Дзяўбанне (10 гадзін)

Долата. Прымяненне, будова і памеры долата. Прызначэнне і віды гнёздаў у сталярных злучэннях. Памеры гнязда. Мацаванне дэталей пры дзяўбанні. Паслядоўнасць выканання прыёмаў работы пры дзяўбанні. Правілы дзяўбання. Кантроль глыбіні пры дзяўбанні гнязда. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры дзяўбанні.

Практычныя работы. Разметка гнёздаў рэйсмусам. Мацаванне дэталей у зацісках варштата. Дзяўбанне скразных і нескразных гнёздаў.

Вырабы. Калодка для швабры, крыжавіны падставак ці іншыя вырабы.

### Вуглавое пасярэдняе злучэнне на шып адзінарны скразны. Вуглавое канцавое злучэнне на шып адкрыты скразны адзінарны (10 гадзін)

Канструктыўныя элементы вуглавога пасярэдняга злучэння на шып адзінарны скразны. Канструктыўныя элементы вуглавога канцавога злучэння на шып адкрыты скразны адзінарны. Перавагі шыпавых злучэнняў дэталей перад злучэннямі ўпаўдрэва. Паслядоўнасць выканання злучэнняў. Пілы для вырабу шыпа і выканання правушыны. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні шыпавых злучэнняў.

Практыкаванні ў распазнаванні шыпавых злучэнняў на загатоўках.

Практычныя работы. Разметка шыпа. Разметка гнязда і правушыны. Выраб шыпа, выкананне гнязда, правушыны. Падрыхтоўка і зборка злучэнняў на клеі.

Вырабы. Лесвічка, рамкі, стэнды або іншыя вырабы.

### Такарныя работы (8 гадзін)

Такарны станок па драўніне, яго прызначэнне і асноўныя часткі. Прызначэнне пярэдняй бабкі, задняй бабкі, падручніка з трымальнікам. Прыстасаванні для замацавання і апрацоўкі загатовак на такарным станку. Інструменты для такарных работ. Настройка такарнага станка, прыёмы кіравання такарным станком. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры рабоце на такарным станку.

Практыкаванні. Замацаванне загатоўкі. Устаноўка падручніка.

Практычныя работы. Падбор загатовак. Папярэдняя падрыхтоўка загатоўкі (састругванне рэбраў на васьміграннік, вызначэнне і падрыхтоўка цэнтра тарца загатоўкі). Замацаванне загатоўкі. Устаноўка і замацаванне падручніка. Чарнавое і чыставое тачэнне з кантролем памераў. Адразанне дэталей.

Вырабы. Дэталі драўлянага канструктара, шашкі, загатоўкі для ўрокаў працы ў малодшых класах.

### Практычнае паўтарэнне (8 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

віды і ўласцівасці мяккіх і цвёрдых парод драўніны; віды сушкі драўніны, правілы сушкі і захоўвання драўніны;

прымяненне, будову і памеры долата;

прызначэнне і віды гнёздаў у сталярных злучэннях;

паслядоўнасць выканання прыёмаў работы пры дзяўбанні;

шыпавыя злучэнні дэталей (вуглавое пасярэдняе злучэнне на шып адзінарны скразны, вуглавое канцавое злучэнне на шып адкрыты скразны адзінарны); тэхналогію іх выканання;

прызначэнне і асноўныя часткі такарнага станка; інструменты для такарных работ; тэхналогію тачэння на такарным станку;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць дзяўбанне, шыпавыя злучэнні, тачэнне.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па апрацоўцы драўніны і пры рабоце з драўнінай у працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб драўніне і тэхналогіі яе апрацоўкі пры вырашэнні праблемных сітуацый у працэсе арыенціроўкі ў заданні і пры планаванні работы.

## X КЛАС (46 гадзін)

### Сталярныя злучэнні (4 гадзіны)

Зрошчванне, збіванне, злучэнні на шкантах. Прыёмы выканання сталярных злучэнняў. Якасць сталярных злучэнняў. Правілы бяспечных паводзін пры выкананні сталярных злучэнняў.

Практычная работа. Злучэнне дэталей зрошчваннем (збіваннем).

### Падрыхтоўка загатовак (8 гадзін)

Практычная работа. Падрыхтоўка загатовак (разметка, пілаванне, струганне) для наступных вырабаў.

Аб’екты работы. Загатоўкі для наступных вырабаў.

### Ручныя электрыфікаваныя інструменты (6 гадзін)

Агульныя звесткі пра ручныя электрыфікаваныя інструменты для свідравання (электрадрылі), шліфавання (шліфавальныя машыны), укручвання шруб (акумулятарныя адвёрткі і дрылі, пнеўматычныя шрубавёрты), іх прызначэнне і прымяненне.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры рабоце ручным электрыфікаваным інструментам.

Практыкаванні ў выкананні прыёмаў работы ручным электрыфікаваным інструментам.

### Празрыстая і непразрыстая апрацоўка сталярных вырабаў (4 гадзіны)

Прызначэнне празрыстай і непразрыстай апрацоўкі сталярных вырабаў. Матэрыялы і інструменты для выканання апрацоўкі (празрыстай, непразрыстай) сталярных вырабаў. Падрыхтоўка драўляных паверхняў да апрацоўкі (празрыстай, непразрыстай). Тэхналогія нанясення апрацоўчых

матэрыялаў (лакафарбавых саставаў). Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні апрацоўкі (празрыстай, непразрыстай) сталярных вырабаў.

Практычная работа. Празрыстая і непразрыстая апрацоўка сталярных вырабаў.

Рамонт сталярных вырабаў (16 гадзін)

Асноўныя пашкоджанні і дэфекты сталярных вырабаў у выніку эксплуатацыі і зносу. Спосабы ліквідацыі пашкоджанняў і дэфектаў. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры рамонце сталярных вырабаў.

Практычныя работы. Выяўленне пашкоджанняў і дэфектаў у сталярных вырабах. Разборка табурэтаў, крэслаў, скрынь, выдаленне старога клею. Пастаноўка шкантаў і выкананне іншых злучэнняў на клеі. Устаноўка фурнітуры, зашчапак і гэтак далей. Узмацненне вузлоў і злучэнняў шрубамі і металічнымі вугалкамі. Наклейванне абіўкі. Наклейванне пластыку.

Практычнае паўтарэнне (8 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

сталярныя злучэнні (зрошчванне, збіванне, на шкантах), прыёмы іх выканання;

прызначэнне і прымяненне ручных электрыфікаваных інструментаў;

прызначэнне празрыстай і непразрыстай апрацоўкі сталярных вырабаў, матэрыялы і інструменты, якія выкарыстоўваліся для яе выканання, тэхналогію выканання;

асноўныя пашкоджанні і дэфекты сталярных вырабаў у выніку эксплуатацыі і зносу, спосабы іх ліквідацыі;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць сталярныя злучэнні, карыстацца ручнымі электрыфікаванымі інструментамі, выконваць празрыстую і непразрыстую апрацоўку сталярных вырабаў, практычныя работы па рамонце сталярных вырабаў, якія вывучаліся.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін на вучэбных занятках па апрацоўцы драўніны і пры рабоце з драўнінай у працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб драўніне і тэхналогіі яе апрацоўкі пры вырашэнні праблемных сітуацый у працэсе арыенціроўкі ў заданні і пры планаванні работы.

## АПРАЦОЎКА МЕТАЛАЎ
## VI КЛАС (60 гадзін)

### Уступныя заняткі (2 гадзіны)

Арганізацыя і абсталяванне слясарнай майстэрні (майстэрні па апрацоўцы металаў). Небяспечныя фактары пры рабоце ў майстэрні. Санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы бяспечных паводзін на занятках па апрацоўцы металаў. Вучэбнае месца. Прызначэнне і будова слясарнага варштата. Размяшчэнне на варштаце інструментаў і матэрыялаў. Захоўванне інструментаў і рабочага адзення. Задачы навучання апрацоўцы металаў. Прафесіі рабочых у металаапрацоўчай прамысловасці.

Практыкаванне. Замацаванне загатовак у слясарных цісках.

### Матэрыялазнаўства (4 гадзіны)

Разнастайнасць металаў. Атрыманне металаў. Сплавы. Прымяненне металаў і сплаваў на вытворчасці і ў быце.

Прымяненне дроту на вытворчасці і ў быце. Атрыманне дроту. Уласцівасці алюмініевага, меднага і стальнога дроту. Таўшчыня дроту. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін на занятках з дротам.[3]

Практыкаванні. Вызначэнне вырабаў з металу. Адрозненне алюмініевага, меднага і стальнога дроту. Вызначэнне пластычнасці дроту.

### Графічныя выявы вырабаў з дроту (2 гадзіны)

Тэхнічны малюнак, чарцёж, эскіз плоскіх вырабаў з дроту. Абазначэнне памераў вырабу. Вызначэнне даўжыні загатоўкі, неабходнай для работы.

Практыкаванні. Чытанне графічных выяў вырабаў з дроту. Вызначэнне даўжыні загатоўкі, неабходнай для работы.

### Праўка дроту (4 гадзіны)

Вызначэнне тэхналагічнай аперацыі праўкі. Спосабы праўкі, інструменты і прыстасаванні для выканання праўкі. Прыёмы праўкі. Кантроль якасці выканання праўкі. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы

---

[3] Калі звесткі аб дроце вывучаліся ў V класе, то гэты матэрыял прапануецца вучням у якасці паўтарэння.

бяспечных паводзін пры выкананні праўкі.

Практыкаванне. Выкананне праўкі.

Вымярэнне, разметка і рэзка дроту (6 гадзін)

Вызначэнне тэхналагічнай аперацыі разметкі. Інструменты для вымярэння і разметкі (металічная лінейка, алоўкі, маркеры). Прыёмы выканання разметкі. Кантроль якасці выканання разметкі. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні вымярэнняў і разметкі.

Вызначэнне тэхналагічнай аперацыі рэзкі. Інструменты для рэзкі дроту (кусачкі-бакарэзы, кусачкі тарцовыя, пасаціжы, напільнік). Прыёмы рэзкі дроту і зачысткі зрэзаў. Кантроль якасці выканання рэзкі. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры рэзцы дроту.

Практыкаванні. Выкананне разметкі дроту. Выкананне рэзкі дроту.

Гібка дроту (4 гадзіны)

Вызначэнне тэхналагічнай аперацыі гібкі. Інструменты для гібкі дроту (слясарныя ціскі, пласкагубцы, круглагубцы, пасаціжы, малаток, кіянка, апраўкі). Прыёмы гібкі дроту ў слясарных цісках, на апраўцы, з выкарыстаннем круглагубцаў. Кантроль якасці выканання гібкі. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры гібцы дроту.

Практыкаванне. Гібка дроту.

Выкананне вырабаў з дроту (26 гадзін)

Тэхналагічная карта на выкананне вырабаў з дроту. Спосабы зборкі вырабаў з некалькіх дэталей.

Практычныя работы. Праўка дроту рознымі спосабамі. Разметка загатовак з дроту па лінейцы. Разразанне (адкусванне) дроту кусачкамі, зачыстка беражкоў. Гібка дроту ў цісках, на апраўках, з выкарыстаннем круглагубцаў.

Вырабы. Геаметрычныя фігуры, ланцужкі, контурныя выявы звяроў, птушак.

Практычнае паўтарэнне (12 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках па апрацоўцы металаў;

агульныя звесткі аб прафесіях рабочых у металаапрацоўчай прамысловасці;

агульныя звесткі аб металах і сплавах, іх прымяненні на вытворчасці і ў быце;

прымяненне дроту ў быце і на вытворчасці; спосабы яго атрымання;

вызначэнне тэхналагічных аперацый праўкі, разметкі, рэзкі, гібкі;

прызначэнне і будову слясарнага варштата, інструментаў і прыстасаванняў для работы з дротам, выкананне тэхналагічных аперацый праўкі, разметкі, рэзкі, гібкі, якія вывучаліся;

тэхналогію выканання праўкі, разметкі па лінейцы, разразання, зачысткі, згінання дроту;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць праўку дроту; разметку загатовак з дроту па лінейцы; разразанне (адкусванне) дроту кусачкамі; зачыстку беражкоў; згінанне дроту з дапамогай пласкагубцаў, круглагубцаў, у слясарных цісках, на апраўках.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па апрацоўцы дроту і пры рабоце з дротам у працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб дроце і тэхналогіі яго апрацоўкі пры вырашэнні праблемных сітуацый у працэсе арыенціроўкі ў заданні і пры планаванні работы.

## VII КЛАС (60 гадзін)

### Матэрыялазнаўства (2 гадзіны)

Уласцівасці тонкаліставога металу (бляхі, дахавай сталі). Вырабы з тонкалістава металу, яго прымяненне на вытворчасці і ў быце. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін на занятках з тонкаліставым металам.

Практыкаванні ў вызначэнні пластычнасці тонкалістава металу.

Практыкаванні ў адрозніванні бляхі і дахавай сталі.

### Праўка загатовак з тонкалістава металу (4 гадзіны)

Прызначэнне праўкі загатовак з тонкалістава металу. Інструменты і прыстасаванні, якія прымяняюцца пры праўцы металу (правільная пліта, кіянка, слясарны малаток з круглым байком, драўляны брусок). Спосабы выканання праўкі. Кантроль якасці праўкі лістава металу. Арганізацыя

вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры праўцы тонкаліставога металу.

Практычныя работы. Праўка тонкаліставога металу кіянкай, малатком. Праўка тонкаліставога металу драўляным бруском.

Аб’екты работы. Загатоўкі для скрыначак з бляхі, дэталей металаканструктара, накладак і іншых вырабаў.

### Плоскасная разметка (8 гадзін)

Віды разметкі: лінейная, плоскасная, прасторавая. Асноўныя і дапаможныя рыскі. Керны. Інструменты і прыстасаванні для выканання разметкі: разметачная пліта, лінейка, вугольнікі, шаблоны, чарцілка, разметачны цыркуль, кернер.

Паняцце прыпуску на апрацоўку дэталей. Падрыхтоўка загатоўкі з тонкаліставога металу да разметкі. Прыёмы разметкі дэталей па шаблоне.

Абазначэнне памераў вырабу (дэталі) і ліній згібаў на чарцяжы. Паняцце базы для разметкі. Прыёмы адкладвання памераў, нанясення паралельных рысак, разметкі прамавугольніка.

Кантроль якасці разметкі. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры разметцы тонкаліставога металу.

Практычныя работы. Разметка загатовак з тонкаліставога металу па шаблоне, па лінейцы і вугольніку з выкарыстаннем чарцілкі.

Аб’екты работы. Загатоўкі для скрыначак, дэталей металаканструктара, накладак і іншых вырабаў.

### Разразанне тонкаліставога металу нажніцамі (4 гадзіны)

Прызначэнне і асноўныя часткі ручных нажніц па метале. Спосабы разразання тонкаліставога металу ручнымі нажніцамі. Прыёмы апрацоўкі беражкоў. Кантроль якасці рэзкі тонкаліставога металу і зачысткі беражкоў. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры разразанні тонкаліставога металу і апрацоўцы беражкоў.

Практычныя работы. Разразанне тонкаліставога металу ручнымі нажніцамі, замацаванымі ў цісках; апрацоўка беражкоў.

Аб’екты работы. Нарыхтоўкі для скрыначак з бляхі, дэталей металаканструктара, накладак і іншых вырабаў.

### Гібка тонкаліставога металу (18 гадзін)

Інструменты і прыстасаванні, якія прымяняюцца пры гібцы тонкаліставога металу (ціскі, апраўкі, кіянка, малаток). Падабенства гібкі і праўкі, спосабы выканання гібкі тонкаліставога металу. Кантроль якасці гібкі тонкаліставога металу і злучэння дэталей. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні гібкі.

Практычная работа. Гібка тонкаліставога металу на апраўках і ў цісках.

Вырабы. Скрыначкі. Дэталі металаканструктара. Дзіцячы шуфлік (ручка драўляная).

Прабіванне адтулін (4 гадзіны)

Інструменты і прыстасаванні для прабівання адтулін: малаток, прабойнік, пліта. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры прабіванні адтулін.

Практычная работа. Прабіванне адтулін прабойнікам.

Вырабы. Дэталі металаканструктара. Накладкі.

Шліфаванне вырабаў з тонкаліставога металу (4 гадзіны)

Прызначэнне шліфавання. Інструменты і прыстасаванні для шліфавання: шліфавальная шкурка; драўляны брусок, шліфавальная калодка. Прыёмы шліфавання. Кантроль якасці выканання шліфавання. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры шліфаванні вырабаў з тонкаліставога металу.

Практычная работа. Шліфаванне вырабаў з тонкаліставога металу.

Аб’екты работы. Скрыначкі, дэталі металаканструктара, шуфлік, накладкі.

Практычнае паўтарэнне (16 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

уласцівасці тонкаліставога металу (бляхі, дахавай сталі);

прызначэнне і будову інструментаў і прыстасаванняў, якія прымяняюцца пры выкананні тэхналагічных аперацый, якія вывучаліся: праўкі тонкаліставога металу, плоскаснай разметкі, рэзання тонкаліставога металу, гібкі тонкаліставога металу, прабівання адтулін, шліфавання вырабаў з тонкаліставога металу;

паняцце прыпуску на апрацоўку дэталей;

тэхналогію выканання праўкі тонкаліставога металу, плоскаснай разметкі, рэзання тонкаліставога металу, гібкі тонкаліставога металу, прабівання адтулін, шліфавання вырабаў з тонкаліставога металу;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць праўку тонкаліставога металу, плоскасную разметку, рэзанне тонкаліставога металу, гібку тонкаліставога металу, прабіванне адтулін, шліфаванне вырабаў з тонкаліставога металу.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па апрацоўцы тонкаліставога металу і пры рабоце з тонкаліставым металам у працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб тонкаліставым метале і тэхналогіі яго апрацоўкі пры вырашэнні праблемных сітуацый у працэсе арыенціроўкі ў заданні і пры планаванні работы.

## VIII КЛАС (46 гадзін)

### Матэрыялазнаўства (2 гадзіны)

Чорныя металы і іх сплавы. Каляровыя металы і іх сплавы. Фізічныя ўласцівасці металаў (колер, цеплаправоднасць, пашырэнне пры награванні, плаўкасць, электраправоднасць, вязкасць). Паняцце карозіі. Каразійная ўстойлівасць металаў. Механічныя ўласцівасці металаў (трываласць, цвёрдасць, пругкасць, пластычнасць).

Практыкаванні ў распазнаванні металаў і іх сплаваў, у параўнанні механічных уласцівасцей металаў.

### Плоскасная разметка (6 гадзін)

Прыёмы разметкі пры дапамозе кернера, разметачнага цыркуля. Кантроль якасці разметкі. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні разметкі з выкарыстаннем кернера, разметачнага цыркуля.

Практычная работа. Разметка загатовак з тонкалістававога металу з выкарыстаннем кернера, разметачнага цыркуля.

Аб’екты работы. Загатоўкі для будучых вырабаў.

### Рубка металаў (6 гадзін)

Вызначэнне тэхналагічнай аперацыі рубкі. Зубіла, яго часткі. Крэйцмейсель. Спосабы рубкі металаў. Прыёмы рубкі металаў. Кантроль якасці рубкі. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры рубцы металаў.

Практычныя работы. Мацаванне загатовак у цісках. Рубка металаў у цісках і на пліце.

Аб’екты работы. Загатоўкі і дэталі для будучых вырабаў.

Апілоўванне металаў (16 гадзін)

Вызначэнне тэхналагічнай аперацыі апілоўвання. Будова напільніка. Віды насечак напільнікаў, віды напільнікаў па колькасці насечак. Профіль сячэння рабочай часткі напільніка. Засцярога напільнікаў ад пашкоджанняў.

Прыёмы апілоўвання дэталей з металаў. Асаблівасці апілоўвання вузкіх і шырокіх плоскіх паверхняў, крывалінейных паверхняў. Кантроль якасці апілоўвання. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры апілоўванні.

Практычныя работы. Апілоўванне плоскіх паверхняў. Апілоўванне крывалінейных паверхняў. Шліфаванне паверхні выкананых вырабаў.

Вырабы. Аснова для вешалкі з адным кручком, падкладкі пад разцы такарнага станка, вушка, кручок для вешалкі, падвес для плакатаў.

Свідраванне і зенкаванне адтулін (6 гадзін)

Вызначэнне тэхналагічнай аперацыі свідравання. Будова спіральнага свердла. Зянкоўка. Прызначэнне зенкавання. Свідравальны станок. Асноўныя часткі свідравальнага станка. Будова машынных ціскоў. Паслядоўнасць і прыёмы выканання работ на свідравальным станку. Прычыны браку пры свідраванні, меры яго папярэджання. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры свідраванні і зенкаванні.

Практычныя работы. Падрыхтоўка свідравальнага станка да работы з устаноўкай у шпіндалі станка свідравальнага патрона і замацаваннем свердла ў патроне. Выманне свердла з патрона і патрона са шпіндаля. Замацаванне загатоўкі ў машынных ціосках. Свідраванне скразных адтулін у дэталях, замацаваных у машынных ціосках. Зенкаванне адтулін. Выдаленне стружак шчоткай-змёткай.

Вырабы. Дэталі металаканструктара. Накладкі.

Практычнае паўтарэнне (10 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

назвы і фізічныя ўласцівасці найбольш распаўсюджаных чорных і каляровых металаў і іх сплаваў; паняцце карозіі;

вызначэнні тэхналагічных аперацый разметкі, рубкі, апілоўвання і свідравання;

прызначэнне і будову інструментаў і прыстасаванняў, што прымяняюцца пры выкананні тэхналагічных аперацый, якія вывучаліся: разметкі, рубкі, апілоўвання і свідравання;

тэхналогію выканання разметкі пры дапамозе кернера, разметачнага цыркуля, рубкі металаў, апілоўвання паверхняў, свідравання і зенкавання адтулін;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць плоскасную разметку пры дапамозе кернера, разметачнага цыркуля, рубку металаў, апілоўванне паверхняў, свідраванне і зенкаванне адтулін.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па апрацоўцы металаў і пры рабоце з металамі ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб металах, тэхналогіі іх апрацоўкі пры вырашэнні праблемных сітуацый у працэсе арыенціроўкі ў заданні і пры планаванні работы.

## IX КЛАС (46 гадзін)

### Матэрыялазнаўства (4 гадзіны)

Паняцце сплаваў. Састаў, уласцівасці і прымяненне бронзы, латуні, дзюралюмінію, сілуміну. Састаў, уласцівасці і прымяненне чыгуну. Віды сталі, іх састаў, уласцівасці і прымяненне. Віды, атрыманне і прымяненне сартавога пракату. Профілі сартавога пракату. Прымяненне сартавога пракату рознага профілю.

Практыкаванні ў распазнаванні металаў і сплаваў, профіляў сартавога пракату.

### Рэзка загатовак слясарнай нажоўкай (12 гадзін)

Прымяненне разразання загатовак слясарнай нажоўкай. Асноўныя часткі слясарнай нажоўкі. Будова нажовачнага палатна. Падрыхтоўка нажоўкі да работы. Прыёмы разразання металу нажоўкай. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры разразанні металу нажоўкай.

Практычныя работы. Разметка загатовак. Мацаванне загатоўкі ў цісках. Устаноўка ў станку нажовачнага палатна. Разразанне папярэдне размечаных загатовак.

Аб’екты работы. Загатоўкі і дэталі для будучых вырабаў.

### Злучэнне дэталей заклёпкамі (6 гадзін)

Паняцце заклёпачнага злучэння. Будова заклёпкі. Формы закладной галоўкі заклёпкі. Заклёпачныя швы. Прыёмы ручной клёпкі і іх

паслядоўнасць. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні заклёпачных злучэнняў.

Практыкаванні ў падборы заклёпак.

Практычная работа. Выкананне заклёпачных злучэнняў.

Вырабы. Вешалкі з адным кручком. Гаспадарчы інвентар (замена заклёпак).

Такарна-шрубарэзны станок (6 гадзін)

Прызначэнне такарна-шрубарэзнага станка. Асноўныя часткі такарна- шрубарэзнага станка. Ахоўныя прылады такарна- шрубарэзнага станка. Прызначэнне і віды такарных разцоў. Элементы такарнага разца. Прыёмы ўстаноўкі загатоўкі. Прыёмы ўстаноўкі разца. Кіраванне такарна-шрубарэзным станком. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры рабоце на такарна-шрубарэзным станку.

Практыкаванні. Пуск і спыненне станка. Устаноўка частаты кручэння шпіндаля. Устаноўка загатоўкі. Устаноўка разца. Упраўленне супартам. Зняцце пробных стружак.

Наразанне разьбы (6 гадзін)

Паняцце разьбы. Прымяненне разьбы. Віды разьбы. Асноўныя элементы разьбы. Выява разьбы на чарцяжах. Інструменты і прыстасаванні для наразання вонкавай разьбы. Прыёмы наразання вонкавай разьбы. Інструменты і прыстасаванні для наразання ўнутранай разьбы. Прыёмы наразання ўнутранай разьбы. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры наразанні разьбы.

Практычныя работы. Наразанне вонкавай разьбы. Наразанне ўнутранай разьбы.

Вырабы. Балты, гайкі і іншыя.

Практычнае паўтарэнне (12 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

састаў, уласцівасці і прымяненне сплаваў (бронзы, латуні, дзюралюмінію, сілуміну), чыгуну, сталі; віды, атрыманне, профілі і прымяненне сартавога пракату;

прызначэнне і будову слясарнай нажоўкі;

паняцце заклёпачнага злучэння; будову заклёпвання;

прызначэнне і будову такарна-шрубарэзнага станка; прызначэнне і віды такарных разцоў;

паняцце, прымяненне і віды разьбы;

інструменты і прыстасаванні для наразання вонкавай і ўнутранай разьбы;

тэхналогію выканання разразання загатовак слясарнай нажоўкай, злучэння дэталей заклёпкамі, работы на такарна-шрубарэзным станку, наразання разьбы;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць рэзку загатовак слясарнай нажоўкай, злучэнне дэталей заклёпкамі, наразанне разьбы, трэніровачныя практыкаванні ў рабоце на такарна-шрубарэзным станку.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па апрацоўцы металаў і пры рабоце з металамі ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб металах, аб тэхналогіі іх апрацоўкі пры вырашэнні праблемных сітуацый у працэсе арыенціроўкі ў заданні і пры планаванні работы.

## X КЛАС (46 гадзін)

### Матэрыялазнаўства (2 гадзіны)

Сучасныя кампазіцыйныя матэрыялы і іх прымяненне ў прамысловасці.

Практычная работа. Вывучэнне ўласцівасцей кампазіцыйных матэрыялаў.

### Абточванне цыліндрычных паверхняў (6 гадзін)

Разцы для абточвання цыліндрычных паверхняў. Прыёмы абточвання цыліндрычных паверхняў.

Прызначэнне і будова штангенцыркуля. Прыёмы вымярэнняў штангенцыркулем, счытванне паказанняў. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры абточванні цыліндрычных паверхняў.

Практычная работа. Абточванне цыліндрычных паверхняў з выкананнем кантрольных вымярэнняў штангенцыркулем.

Аб’екты работы. Загатоўкі для будучых вырабаў. Дэталі кручэння (восі, валікі), ручкі для інструментаў і прыстасаванняў.

### Свідраванне на такарна-шрубарэзным станку (6 гадзін)

Адрозненні свідравання на такарна-шрубарэзным станку ад свідравання на свідравальным станку. Задняя бабка, яе будова. Прыёмы

выканання цэнтравання. Прыёмы свідравання. Віды браку і іх прычыны пры свідраванні на такарна-шрубарэзным станку. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры свідраванні на такарна-вінтарэзным станку.

Практычныя работы. Свідраванне скразных адтулін. Свідраванне глухіх адтулін.

Вырабы. Шайбы, гайкі. Нацяжкі для клёпкі.

Паянне (4 гадзіны)

Паняцце паяння. Тыпы паяльнікаў. Віды прыпою. Флюсы. Прыёмы паяння мяккім прыпоем. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры паянні.

Назіранні за злучэннем дэталей паяннем.

Выраб і рамонт металічных частак
гаспадарчага абсталявання і інвентару (12 гадзін)

Дэфекты металічных частак гаспадарчага абсталявання і інвентару (рыдлёвак, шуфлікаў, скрабкоў), спосабы іх ліквідацыі. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры вырабе і рамонце металічных частак гаспадарчага абсталявання і інвентару.

Практычныя работы. Выкананне работ па заяўках школы.

Практычнае паўтарэнне (16 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

звесткі аб сучасных кампазіцыйных матэрыялах;

разцы для абточвання цыліндрычных паверхняў;

прызначэнне і будову штангенцыркуля;

адрозненні свідравання на такарна-шрубарэзным станку ад свідравання на свідравальным станку; будову задняй бабкі такарна-шрубарэзнага станка;

паняцце паяння; тыпы паяльнікаў; віды прыпою, флюсы;

дэфекты металічных частак мэблі, гаспадарчага абсталявання і інвентару;

тэхналогію выканання абточвання цыліндрычных паверхняў на такарна-шрубарэзным станку, тэхналогію выканання на такарна-шрубарэзным станку свідравання, прыёмы паяння, прыёмы выканання практычных работ па вырабе і рамонце металічных частак гаспадарчага абсталявання і інвентару;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць прыёмы абточвання цыліндрычных паверхняў, свідраванне на такарна-вінтарэзным станку; паянне; выраб і дробны рамонт металічных частак гаспадарчага абсталявання і інвентару.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па апрацоўцы металаў і пры рабоце з металамі ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб металах, тэхналогіі іх апрацоўкі пры вырашэнні праблемных сітуацый у працэсе арыенціроўкі ў заданні і пры планаванні работы.

## АПРАЦОЎКА ТКАНІН

### VI КЛАС (95 гадзін)

#### Уступныя заняткі (2 гадзіны)

Арганізацыя і абсталяванне швейнай майстэрні (майстэрні па апрацоўцы тканін): класны ўчастак, участак для машынных работ, месца для прасавальных работ.

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні. Правілы бяспечных паводзін у кабінеце. Небяспечныя фактары пры рабоце ў швейнай майстэрні. Захоўванне інструментаў і рабочага адзення. Задачы навучання апрацоўцы тканін.

Прафесіі рабочых швейнай прамысловасці: вытворца лякал, раскладчык лякал, насцільшчык, раскройшчык, закройшчык. Прафесія швачкі.

Практычная работа. Арганізацыя вучэбнага месца для выканання швейных вырабаў.

#### Матэрыялазнаўства (6 гадзін)

Віды тэкстыльных валокнаў: натуральныя і хімічныя; расліннага і жывёльнага паходжання. Валокны расліннага паходжання (бавоўнавае, ільняное) і іх уласцівасці: колер, бляск, мяккасць, трываласць, даўжыня валакна. Кароткія звесткі аб вытворчасці тканін. Атрыманне тканіны з раслінных валокнаў. Першасная апрацоўка бавоўны, лёну, прадзенне, ткацтва, апрацоўка.

Будова тканіны. Аснова і ўток. Пруг тканіны. Шырыня тканіны. Палатнянае перапляценне. Добры і вываратны бакі тканіны. Прыметы добрага і вываратнага бакоў тканіны. Народнае ткацтва ў Беларусі.

Уласцівасці баваўняных і льняных тканін: эстэтычныя, гігіенічныя, тэхналагічныя. Асартымент баваўняных і льняных тканін.

Ніткі для шыцця і вышывання.

Лабараторна-практычныя работы. Вызначэнне асновы і ўтку. Вызначэнне добрага і вываратнага бакоў тканіны. Выраб узораў палатнянага перапляцення. Складанне калекцыі тканін. Параўнанне баваўняных і льняных тканін па тэхналагічных уласцівасцях.

Швейныя ручныя работы (4 гадзіны)

Ручныя строчкі часовага прызначэння. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні швейных ручных работ.

Практыкаванне. Выкананне на ўзорах ручных строчак часовага прызначэння прамымі шыўкамі.

Машыназнаўства (14 гадзін)

Бытавая швейная машына з электрапрыводам, прызначэнне і будова. Прызначэнне і будова электрапрывода. Арганізацыя вучэбнага месца, працоўная поза.

Правілы бяспечных паводзін пры рабоце на машыне з электрапрыводам перад пачаткам работы, пры запраўцы нітак, у час і пры заканчэнні работы.

Рэгулятар даўжыні шыўка, зваротны ход машыны, машыннае замацаванне. Парадак запраўкі верхняй і ніжняй нітак. Паслядоўнасць падрыхтоўкі машыны да работы.

Будова маталкі, правілы выканання намотвання ніткі на шпульку. Умовы выканання роўнай строчкі.

Машынныя швы: злучальныя, краявыя, аздобныя. Шывок, строчка, шво, шырыня шва. Умовы выканання роўнай строчкі.

Сшывальнае шво (ураспрасоўванне, узапрасоўванне). Двайное шво. Шво ўпадгінку з адкрытым і закрытым зрэзамі. Прызначэнне швоў. Канструкцыя і тэхналогія выканання. Патрабаванні да якасці швоў. Правілы бяспечных паводзін пры рабоце з колючымі і рэжучымі інструментамі.

Практыкаванні. Знешні агляд машыны. Падрыхтоўка машыны да работы. Работа на халастым ходу, пуск і спыненне. Запраўка верхняй і ніжняй нітак. Намотванне ніткі на шпульку. Выкананне на ўзорах тканіны прамых строчак з зададзенай даўжынёй шыўка і строчак рознай канфігурацыі. Выкананне машыннага замацавання.

Практычныя работы. Выкананне на ўзорах машынных швоў: сшывальнага шва ўраспрасоўванне і ўзапрасоўванне, двайнога шва, шва ўпадгінку з адкрытым і закрытым зрэзамі.

Вільготна-цеплавая апрацоўка швейных вырабаў (2 гадзіны)

Пачатковыя звесткі пра будову і выкарыстанне электрапраса. Тэрмарэгулятар. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры рабоце з электрапрасам.

Практыкаванні. Прыёмы выканання вільготна-цеплавых работ на ўзорах тканіны (запрасоўванне, спрасоўванне, адцягванне і іншыя).

Практычная работа. Выкананне вільготна-цеплавой апрацоўкі найпрасцейшых швейных вырабаў (сурвэтак і іншых).

Чарцёж вырабу (6 гадзін)

Чарцёж швейнага вырабу. Лініі чарцяжа: суцэльныя (асноўныя і дапаможныя), штрыхавыя і штрыхпункцірныя. Абазначэнне памераў на чарцяжы. Спецыяльныя абазначэнні пры афармленні чарцяжоў. Выкрайка. Інструменты і матэрыялы, неабходныя для вырабу выкраек.

Практычныя работы. Афармленне рамкі на альбомным лісце. Пабудова гарызантальных, вертыкальных, нахільных ліній. Пабудова прамых, вострых і тупых вуглоў. Пабудова адрэзкаў, дзяленне адрэзкаў. Пабудова чарцяжоў выкраек аднадэтальных швейных вырабаў.

Шыццё на швейнай машыне па прамых зрэзах тканіны (14 гадзін)

Звесткі аб тканінах для вырабу сурвэтак, ручнікоў, мяшочкаў. Формы сурвэтак, ручнікоў. Віды зрэзаў тканіны. Уласцівасці зрэзаў. Апрацоўка зрэзаў вырабаў швом упадгінку з закрытым зрэзам. Патрабаванні да якасці крою, вырабу.

Практычныя работы. Пабудова чарцяжа прамавугольнай (квадратнай) формы. Выраб і праверка выкрайкі. Падрыхтоўка тканіны да раскрою. Раскладка выкрайкі на тканіне, замацаванне выкрайкі. Абмялоўка. Раскрой тканіны. Падрыхтоўка дэталі крою да апрацоўкі. Апрацоўка вуглоў сурвэткі сшывальным швом ураспрасоўванне. Пашыў вырабаў з прымяненнем шва ўпадгінку з закрытым зрэзам і сшывальнага. Вільготна-цеплавая апрацоўка вырабаў.

Вырабы. Мяшочкі. Сталовая бялізна: сурвэткі (набор), ручнікі.

Выкананне швейнага вырабу з прымяненнем абкідвальнага шва (10 гадзін)

Тканіны, якія выкарыстоўваюцца для вырабу асноўных дэталей павязкі, апрацоўкі зрэзаў. Ручныя і машынныя работы. Машынныя швы: сшывальны, абкідвальны. Патрабаванні да якасці работы.

Практыкаванне. Выкананне абкідвальнага шва на ўзоры.

Практычныя работы. Пабудова чарцяжа выкрайкі павязкі для сну. Выраб выкрайкі павязкі. План работы па пашыве павязкі. Раскрой тканіны. Вышыванне эмблемы. Прымотванне завязак. Абточванне асноўных

дэталей. Выкананне аздобнай строчкі (з адначасовым застрочваннем адтуліны). Вільготна-цеплавая апрацоўка вырабу.

Выраб. Павязка для сну.

Выкананне аднадэтальнага вырабу
з прымяненнем двайнога шва (16 гадзін)

Прызначэнне навалачак. Тканіны, якія прымяняюцца для вырабу навалачак. Віды, канструктыўныя асаблівасці, памеры навалачак. Адпаведнасць памеру навалачкі памеру падушкі. Швы, якія прымяняюцца для вырабу навалачак. Меркі для пабудовы чарцяжа. Памеры клапана. Разлік расходу тканіны для вырабу навалачкі з клапанам. Паслядоўнасць вырабу навалачкі. Патрабаванні да якасці работы.

Практычныя работы. Пабудова чарцяжа і выкананне выкрайкі. Падрыхтоўка тканіны да раскрою. Раскладка выкрайкі на тканіне. Абмялоўка. Раскрой тканіны. Пашыў навалачкі. Вільготна-цеплавая апрацоўка вырабу. Складванне па стандарце.

Выраб. Навалачка з клапанам.

Догляд вырабаў з тэкстыльных матэрыялаў (2 гадзіны)

Віды работ па доглядзе вырабаў з тэкстыльных матэрыялаў. Сімвалы, якія абазначаюць работы па доглядзе вырабаў з тэкстыльных матэрыялаў. Вытворчы ярлык. Асаблівасці догляду вырабаў з баваўняных і льняных тканін.

Практычныя работы. Выбар рэжыму вільготна-цеплавой апрацоўкі вырабаў з баваўняных і льняных тканін. Падбор мыйных сродкаў для мыцця вырабаў з баваўняных і льняных тканін.

Рамонт адзення (8 гадзін)

Віды работ па рамонце адзення: прышыванне гузікаў, прышыванне вешалкі, рамонт адзення па распоратым шве і разарваным месцы, накладанне латкі, цыраванне.

Віды гузікаў. Спосабы прышывання ў залежнасці ад віду гузікаў і таўшчыні тканіны. Ніткі для прышывання гузікаў. Вызначэнне месца прышывання адарванага гузіка.

Швы, якія прымяняюцца для рамонту адзення па распоратым шве і ў месцы разрыву тканіны. Патрабаванні да якасці работы.

Прызначэнне вешалкі, падбор тканіны для вырабу вешалкі. Спосабы прышывання вешалкі.

Правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ па рамонце адзення.

Практычныя работы. Падбор гузікаў і нітак (па колеры, таўшчыні, якасці), падрыхтоўка бялізны і адзення да рамонту. Прышыванне гузікаў са скразнымі адтулінамі, з вушкам, на стойцы. Утварэнне стойкі.

Рамонт адзення па распоратым шве, па разарваным месцы. Вільготна-цеплавая апрацоўка месцаў рамонту.

Выраб і прышыванне вешалкі. Раскрой тканіны па зададзеных памерах. Апрацоўка вешалкі машыннай строчкай. Прышыванне вешалкі да ручніка двайной адваротнай строчкай або ручнымі шыўкамі: сшывальнымі або касымі. Прасаванне.

Практычнае паўтарэнне (11 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках па апрацоўцы тканін;

агульныя звесткі аб прафесіях рабочых швейнай прамысловасці;

віды тэкстыльных валокнаў і іх уласцівасці; агульныя звесткі аб вытворчасці тканін; будову тканіны; палатнянае перапляценне; ніткі для шыцця і вышывання; уласцівасці і асартымент бавоўняных і льняных тканін;

агульную будову швейнай машыны з электрапрыводам; прызначэнне і будову электрапрывода;

паслядоўнасць падрыхтоўкі да работы швейнай машыны; запраўку верхняй і ніжняй нітак, рэгуляванне даўжыні шыўка, выкананне замацоўвання і строчак;

прызначэнне, канструкцыю і тэхналогію выканання: сшывальнага (узапрасоўванне, ураспрасоўванне) шва, двайнога шва, шва ўпадгінку з адкрытым і закрытым зрэзамі, абкідвальнага шва;

прызначэнне вільготна-цеплавой апрацоўкі швейных вырабаў; пачатковыя звесткі аб будове і выкарыстанні электрапраса;

асаблівасці чарцяжа выкрайкі швейнага вырабу; інструменты і матэрыялы, неабходныя для выканання выкраек;

віды і ўласцівасці зрэзаў тканіны;

прызначэнне выкананых вырабаў; тканіны, якія прымяняліся для выканання вырабаў;

віды работ па доглядзе вырабаў з тэкстыльных матэрыялаў; асаблівасці догляду вырабаў з бавоўняных і льняных тканін;

віды работ па дробным рамонце адзення; віды гузікаў і спосабы іх прышывання; швы, якія прымяняюцца для рамонту адзення па распоратым

шве і ў месцы разрыву тканіны; спосабы прышывання вешалкі да швейнага вырабу;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць падрыхтоўку швейнай машыны да работы;

выконваць чарцёж выкрайкі аднадэтальнага швейнага вырабу прамавугольнай (квадратнай) формы; вырабляць выкрайкі швейных вырабаў, якія выконваліся;

выконваць падрыхтоўку тканіны да раскрою, раскладку выкрайкі на тканіне, абмялоўку і раскрой тканіны, падрыхтоўку дэталей крою да апрацоўкі;

выконваць машынныя швы: сшывальнае шво ўраспрасоўванне і ўзапрасоўванне, двайное шво, шво ўпадгінку з адкрытым і закрытым зрэзамі, абкідвальнае шво;

падбіраць мыйныя сродкі для мыцця вырабаў з бавоўняных і льняных тканін;

выконваць дробны рамонт адзення.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па апрацоўцы тканін і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб бавоўняных і льняных тканінах пры іх падборы для вырабаў, якія выконваюцца.

## VII КЛАС (95 гадзін)

### Матэрыялазнаўства (6 гадзін)

Атрыманне валокнаў натуральнага шоўку. Шаўковыя тканіны. Уласцівасці і прызначэнне шаўковых тканін. Уласцівасці натуральнага шоўку: трываласць, змінальнасць, гіграскапічнасць, слізгаценне, абсыпальнасць, прасякальнасць, адносіны да вады, цяпла. Тканіны са штучнага шоўку. Правілы прасавання тканін з натуральнага і штучнага шоўку.

Шарсцяное валакно і яго ўласцівасці: даўжыня, трываласць і іншыя. Атрыманне пражы з шарсцянога валакна. Атрыманне тканіны з шарсцяной пражы. Шарсцяныя тканіны, прызначэнне. Уласцівасці шарсцяных тканін: трываласць, здольнасць да афарбоўкі, усадка, цеплаахоўныя ўласцівасці. Дзеянне вады і цяпла на шэрсць. Шарсцяныя тканіны з дабаўленнем штучных валокнаў. Іх уласцівасці і прызначэнне. Правілы прасавання шарсцяных тканін.

Аздобныя матэрыялы: тасьма, карункі, стужкі, махры. Падбор аздобных матэрыялаў у залежнасці ад мадэлі і прызначэння вырабу.

Сацінавае перапляценне. Уласцівасці тканін сацінавага перапляцення: трываласць, абсыпальнасць, расцяжнасць, мяккасць, драпіравальнасць, слізгаценне.

Саржавае перапляценне. Саржа ўточная і асноўная. Уласцівасці тканін саржавага перапляцення. Прыметы тканін з рознымі відамі перапляцення нітак.

Лабараторна-практычныя работы. Параўнанне баваўняных, ільняных, шаўковых і шарсцяных тканін па тэхналагічных уласцівасцях. Параўнанне палатнянага, сацінавага і саржавага перапляценняў.

### Машыназнаўства (12 гадзін)

Чаўночны камплект, яго будова. Парадак разборкі і зборкі чаўночнага камплекта. Будова і падбор машыннай іголкі з улікам характарыстык апрацаванай тканіны. Правілы ўстаноўкі машыннай іголкі.

Механізмы рэгулявання швейнай машыны. Рэгулятар шырыні зігзага, рэгулятар нацяжэння верхняй ніткі, рэгулятар нацяжэння ніжняй ніткі.

Накладныя швы. Прызначэнне накладнога шва. Канструкцыя і тэхналогія выканання накладнога шва з двума адкрытымі зрэзамі, адным закрытым, двума закрытымі зрэзамі.

Практыкаванні. Разборка і зборка чаўночнага камплекта. Рэгуліроўка нацяжэння верхняй і ніжняй нітак. Рэгуліроўка шырыні зігзагападобнай строчкі. Падбор і ўстаноўка машыннай іголкі. Распазнаванне накладнога шва на ўзорах і ў швейных вырабах. Вымярэнне шырыні шва.

Практычныя работы. Выкананне ўзораў накладных швоў. Настрочванне тасьмы.

### Выкананне швейных вырабаў з прымяненнем накладнога шва (24 гадзіны)

Прызначэнне і падбор тканін для вырабу сурвэтак. Ужывальныя швы. Правілы настрочвання тасьмы. Патрабаванні да якасці работы.

Прызначэнне і падбор тканін для пано з геаметрычных фігур. Апрацоўка зрэзаў асноўнай дэталі. Прыпускі на апрацоўку зрэзаў. Раскрой аплікатыўных дэталей па шаблонах. Улік напрамку долевых нітак на асноўнай і аплікатыўных дэталях. Паслядоўнасць вырабу пано. Правілы накідвання і настрочвання аплікатыўных дэталей. Патрабаванні да якасці работы.

Практычная і дэкаратыўная функцыі фіранак. Тканіны для фіранак. Мадэлі. Віды шторнай стужкі і яе прызначэнне. Разлік расходу тканіны. Паслядоўнасць вырабу фіранкі. Патрабаванні да якасці работы.

Практычныя работы. Пабудова чарцяжа. Выкананне выкрайкі вырабу. Падбор тасьмы для ўпрыгожвання вырабу. Падрыхтоўка матэрыялу да раскрою. Раскладка выкрайкі. Абмялоўка. Раскрой тканіны. Падрыхтоўка дэталей крою да апрацоўкі. Намотванне і настрочванне аплікатыўных дэталей. Пашыў вырабу. Апрацоўка верхняга зрэзу фіранкі шторнай стужкай. Вільготна-цеплавая апрацоўка вырабу.

Вырабы. Сурвэткі, упрыгожаныя тасьмой. Пано з геаметрычных фігур (аплікацыя). Аконныя фіранкі для кухні, упрыгожаныя аплікацыяй, тасьмой.

## Фартух з накладнымі кішэнямі (24 гадзіны)

Прызначэнне і мадэлі фартухоў. Тканіны, якія выкарыстоўваюцца для пашыву фартухоў. Назва дэталей фартуха і контурных зрэзаў. Адзінарныя і парныя дэталі фартуха. Швы, якія прымяняюцца пры пашыве суцэльнакроенага фартуха з накладнымі кішэнямі на шлейках. Правілы раскладкі дэталей на тканіны рознай шырыні. Прыпускі на апрацоўку зрэзаў. Паслядоўнасць вырабу фартуха.

Перанос контурных ліній з адной дэталі на іншую. Капіравальныя шыўкі.

Накладныя кішэні. Форма, спосабы апрацоўкі. Назвы зрэзаў у крої кішэні. Спосабы злучэння кішэні з асноўнай дэталлю.

Парныя дэталі фартуха – шлейкі і пояс. Апрацоўка шлеек і пояса. Патрабаванні да якасці работы.

Практыкаванне. Выкананне капіравальных шыўкоў на ўзоры.

Практычныя работы. Выбар выкрайкі. Падрыхтоўка тканіны да раскрою. Раскладка дэталей выкрайкі на тканіне. Абмялоўка. Раскрой тканіны. Падрыхтоўка дэталей крою да апрацоўкі. Апрацоўка простай накладной кішэні на ўзоры. Апрацоўка накладных кішэняў фартуха. Злучэнне кішэняў з фартухом. Апрацоўка шлеек і пояса. Апрацоўка бакавых зрэзаў нагруднай часткі фартуха. Апрацоўка верхняга зрэзу фартуха. Апрацоўка зрэзаў ніжняй часткі фартуха. Канчатковае аздабленне. Вільготна-цеплавая апрацоўка вырабу.

## Догляд вырабаў з тэкстыльных матэрыялаў (4 гадзіны)

Сімвалічныя абазначэнні работ па доглядзе вырабаў з тканін: мыццё, адбельванне, прасаванне, хімчыстка, сушка. Асаблівасці догляду вырабаў з натуральных тканін. Антыстатычная апрацоўка вырабаў з натуральных тканін.

Практычная работа. Выбар рэжыму вільготна-цеплавой апрацоўкі вырабаў з натуральных тканін.

## Рамонт адзення (8 гадзін)

Накладанне латкі. Правілы падбору тканіны і падрыхтоўкі адзення да накладання латкі. Віды латак па форме. Паслядоўнасць работы пры накладанні латак. Накладанне латкі з дапамогай накладнога або сшывальнага швоў, у выглядзе аплікацыі, з дапамогай ручных шыўкоў – касых абкідальных або пяцельных. Патрабаванні да якасці работы.

Практычныя работы. Падрыхтоўка адзення і бялізны да накладання латкі. Падбор тканіны для латкі. Раскрой і апрацоўка дэталі латкі. Накладанне латкі сшывальным або накладным швом з вытрымліваннем аднолькавага напрамку нітак і супадзення малюнка. Накладанне латкі ў выглядзе аплікацыі накладным швом. Вільготна-цеплавая апрацоўка.

Практычнае паўтарэнне (17 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

звесткі аб валокнах натуральнага шоўку, шарсцяным валакне; звесткі аб тканінах з натуральнага шоўку, шарсцяных тканінах;

правілы вільготна-цеплавой апрацоўкі вырабаў з шаўковых і шарсцяных тканін;

сацінавае перапляценне; уласцівасці тканін сацінавага перапляцення;

саржавае перапляценне; уласцівасці тканін саржавага перапляцення;

будову чаўночнага камплекта; механізмы рэгуліроўкі швейнай машыны; будову і правілы ўстаноўкі машыннай іголкі;

прызначэнне, канструкцыю і тэхналогію выканання накладнога шва з двума адкрытымі зрэзамі, адным закрытым, двума закрытымі зрэзамі; капіравальнага шва;

прызначэнне выкананых вырабаў;

тканіны і іншыя матэрыялы, якія прымяняліся для выканання вырабаў;

тэхналогію накладання латкі;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць рэгуліроўкі швейнай машыны, ажыццяўляць падбор і ўстаноўку машынных іголак;

рабіць выкрайкі швейных вырабаў, якія выконваліся;

выконваць машынныя швы (накладны);

выконваць падбор мыйных сродкаў для мыцця вырабаў з шарсцяных і шаўковых тканін;

выконваць дробны рамонт адзення (накладанне латкі).

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па апрацоўцы тканін і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб тканінах з натуральнага шоўку і шарсцяных тканінах пры іх падборы для вырабаў, якія выконваюцца;

веды аб рэжымах вільготна-цеплавой апрацоўкі вырабаў з натуральных тканін.

## VIII КЛАС (81 гадзіна)

### Матэрыялазнаўства (6 гадзін)

Тканіны з натуральных валокнаў (паўтарэнне). Ткацкія перапляценні (паўтарэнне). Хімічныя валокны, іх віды і ўласцівасці. Атрыманне сінтэтычных тканін. Характэрныя прыметы, уласцівасці і прызначэнне сінтэтычных тканін. Натуральныя тканіны з дабаўленнем хімічных валокнаў. Агульныя звесткі аб асартыменце тканін, якія выпускаюцца на тэкстыльных прадпрыемствах Рэспублікі Беларусь.

Нятканыя матэрыялы, іх уласцівасці і прызначэнне. Розныя спосабы вытворчасці нятканых матэрыялаў: палотнапрашыўныя, ніткапрашыўныя, тканінапрашыўныя, клеявы, лямцава-валюшны.

Дэфекты тканін (ткацкія дэфекты і дэфекты аздаблення).

Лабараторна-практычныя работы. Вывучэнне ўласцівасцей штучных і сінтэтычных тканін. Вызначэнне ткацкіх дэфектаў, дэфектаў афарбоўкі тканін. Раскладка выкрайкі вырабу на тканіне з дэфектам.

### Машыназнаўства (12 гадзін)

Рабочыя механізмы швейнай машыны. Механізм іголкі. Механізм чаўнака. Механізм ніткапрыцягвальніка. Механізм рухавіка тканіны. Механізм лапкі. Правілы бяспечных паводзін пры рабоце на швейнай машыне.

Акантовачнае шво. Прызначэнне акантовачнага шва. Матэрыялы для выканання акантовачнага шва. Віды акантовачнага шва: з адкрытым зрэзам, з закрытым зрэзам, акантоўка тасьмой. Патрабаванні да якасці работы.

Запашывачнае шво. Прызначэнне запашывачнага шва. Канструкцыя і спосабы выканання запашывачнага шва.

Практыкаванне. Распазнаванне ў швейных вырабах і на ўзорах акантовачнага і запашывачнага швоў.

Практычныя работы. Апрацоўка зрэзу акантовачным швом з адкрытым зрэзам. Апрацоўка зрэзу акантовачным швом з закрытым зрэзам (першы, другі спосабы). Выкананне запашывачнага шва на ўзоры.

Выраб сурвэткі з прымяненнем запашывачнага шва (8 гадзін)

Падбор тканін для сурвэткі, якая складаецца з трох прамавугольных аднолькавых частак: сярэдняя дэталь аднатонная, дзве іншыя – з тканіны з малюнкам ці наадварот. Прыпускі да бакавых зрэзаў для злучэння дэталей сурвэткі. Акантоўка зрэзаў сурвэткі тасьмой.

Практычныя работы. Пабудова чарцяжа выкрайкі дэталей сурвэткі. Выраб выкрайкі. Падрыхтоўка тканіны да раскрою. Раскладка выкрайкі на тканіне. Абмялоўка. Раскрой тканіны. Падрыхтоўка дэталей крою да апрацоўкі. Пашыў вырабу. Вільготна-цеплавая апрацоўка вырабу.

Абшыўкі. Апрацоўка зрэзаў тканіны абшыўкамі (12 гадзін)

Віды зрэзаў тканіны. Уласцівасці зрэзаў. Віды абшывак: долевыя, папярочныя, касыя, двайныя, адзінарныя. Адцягванне і спрасоўванне касых абшывак.

Падстаўкі пад гарачае. Прызначэнне, форма. Тканіны для вырабу. Выкарыстанне абшыўкі для апрацоўкі зрэзаў і для апрацоўкі вырабаў. Разлік даўжыні абшыўкі. Шырыня абшыўкі. Падбор аздобных тканін для абшыўкі.

Практыкаванне. Распазнаванне абшывак па віду крою.

Практычныя работы. Выкройванне долевых і папярочных абшывак. Апрацоўка зрэзу долевай абшыўкай на вываратны бок. Апрацоўка зрэзу папярочнай абшыўкай на добры бок. Выкройванне касых абшывак. Апрацоўка зрэзаў адзінарнай касой абшыўкай. Апрацоўка закругленага зрэзу двайной касой абшыўкай.

Меркі для пабудовы чарцяжа выкрайкі вырабу, пабудова чарцяжа і выкананне выкрайкі. Падрыхтоўка тканіны да раскрою. Раскладка выкрайкі на тканіне. Абмялоўка. Раскрой тканіны. Падрыхтоўка дэталей крою да апрацоўкі. Апрацоўка зрэзаў вырабу папярочнай або касой абшыўкай (у залежнасці ад мадэлі). Вільготна-цеплавая апрацоўка вырабу.

Вырабы. Падстаўкі пад гарачае. Сурвэткі авальнай формы.

Выраб прыхваткі (12 гадзін)

Апісанне мадэлі. Разлік неабходнай колькасці тканіны. Прыпускі для апрацоўкі зрэзаў. Выкарыстанне касой двайной абшыўкі для апрацоўкі зрэзаў і для апрацоўкі вырабаў. Разлік даўжыні абшыўкі. Шырыня абшыўкі. Падбор аздобных тканін для абшыўкі. Паслядоўнасць вырабу прыхваткі. Патрабаванні да якасці работы.

Практычныя работы. Пабудова чарцяжа і выраб выкрайкі прыхваткі. Падрыхтоўка тканіны да раскрою. Раскладка выкрайкі на тканіне. Абмялоўка. Раскрой тканіны. Падрыхтоўка крою да апрацоўкі. Загатоўка касой двайной абшыўкі. Апрацоўка вырабу касой двайной абшыўкай. Вільготна-цеплавая апрацоўка вырабу.

Вырабы. Прыхваткі.

Выраб швейных вырабаў – прадметаў інтэр’ера (16 гадзін)

Прызначэнне, канструкцыя, разнастайнасць форм і дэкаратыўнага афармлення канапавых падушак. Варыянты зашпількі.

Гладкафарбаваныя натуральныя тканіны, іх спалучэнне з рознымі відамі аздаблення пры пашыве канапавых падушак. Назвы дэталей крою і зрэзаў прамавугольнай (квадратнай) падушкі. Меркі для вырабу выкрайкі. Разлік колькасці тканіны пры рознай шырыні. Прыпускі на швы. Работа з гатовай выкрайкай. Паслядоўнасць вырабу падушкі. Патрабаванні да якасці.

Практычныя работы. Зняцце мерак. Пабудова чарцяжа. Выраб выкрайкі. Падрыхтоўка тканіны да раскрою. Раскладка выкрайкі на тканіне. Абмялоўка. Раскрой тканіны. Падрыхтоўка дэталей крою да апрацоўкі. Пашыў вырабу. Вільготна-цеплавая апрацоўка вырабу.

Вырабы. Канапавыя падушкі.

Догляд вырабаў з тэкстыльных матэрыялаў (2 гадзіны)

Падбор мыйных сродкаў і выбар рэжыму мыцця вырабаў.

Сімвалічныя абазначэнні работ па доглядзе вырабаў з тканіны. Асаблівасці догляду вырабаў са штучных і сінтэтычных тканін.

Практычныя работы. Выбар рэжыму вільготна-цеплавой апрацоўкі вырабаў натуральных, штучных і сінтэтычных тканін. Падбор мыйных сродкаў для мыцця вырабаў натуральных, штучных і сінтэтычных тканін.

Практычнае паўтарэнне (13 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

асартымент тканін, якія выпускаюцца на тэкстыльных прадпрыемствах Рэспублікі Беларусь;

уласцівасці штучных і сінтэтычных тканін;

нятканыя матэрыялы, іх уласцівасці і прызначэнне;

спосабы вытворчасці нятканых матэрыялаў: палотнапрашыўны, ніткапрашыўны, тканінапрашыўны, клеявы, валюшны;

дэфекты тканін;

працоўныя механізмы швейнай машыны;

прызначэнне, канструкцыю і тэхналогію выканання акантовачнага і запашывачнага швоў;

віды абшывак: долевыя, папярочныя, касыя, двайныя, адзінарныя;

призначэнне выкананых вырабаў; тканіны і іншыя матэрыялы, якія прымяняліся для іх вырабу;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выкарыстоўваць гатовую выкрайку;

вырабляць выкрайкі швейных вырабаў, якія выконваліся;

выконваць машынныя швы: акантовачны, запашывачны;

выконваць абшыўкі;

выконваць падбор мыйных сродкаў і рэжым мыцця вырабаў з тканін.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па апрацоўцы тканін і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб тканінах пры іх падборы для вырабаў;

веды аб мыйных сродках і рэжымах мыцця вырабаў з тканін.

## IX КЛАС (81 гадзіна)

### Матэрыялазнаўства (4 гадзіны)

Новыя тканіны, новыя віды аздабленняў. Тэкстыльныя шпалеры. Нятканыя матэрыялы. Сінтэпон, сыравіна для яго вытворчасці. Выкарыстанне сінтэпону.

Пракладачныя матэрыялы; іх віды, уласцівасці і прызначэнне. Сухі і вільготны спосабы злучэння пракладачных матэрыялаў з асноўнай тканінай. Падкладачныя матэрыялы; іх віды, уласцівасці і прызначэнне.

Трыкатажнае палатно папярочна-вязанае і асноввязанае. Структура, віды трыкатажнага палатна. Малюнкі перапляценняў трыкатажу. Уласцівасці трыкатажнага палатна, яго выкарыстанне ў швейных вырабах. Групы трыкатажных вырабаў па відзе выкарыстанай сыравіны, спосабе апрацоўкі.

Лабараторна-практычная работа. Уласцівасці трыкатажнага палатна.

### Машыназнаўства (6 гадзін)

Догляд швейнай машыны. Чыстка швейнай машыны, яе прызначэнне. Інструменты і прылады для выканання чысткі. Парадак выканання чысткі. Чыстка чаўнака, зубчастай рэйкі, іголкавай пласцінкі.

Змазванне швейнай машыны, прызначэнне змазвання. Прыналежнасці і інструменты для выканання змазвання. Участкі для змазвання, іх абазначэнне на машыне. Схема змазвання швейнай машыны. Парадак выканання змазвання, праверка якасці выканання змазвання.

Непаладкі ў рабоце швейнай машыны. Якасць строчак. Прычыны парушэння якасці строчак. Выпраўленне складаных непаладак, ліквідацыя нескладаных (дробных) непаладак. Выкананне дзеянняў, неабходных для прадухілення непаладак.

Дэфекты строчкі, паломка іголкі, пропуск шыўкоў, абрыў верхняй ніткі, абрыў ніжняй ніткі, дрэннае прасоўванне тканіны, цяжкі ход машыны. Вызначэнне прычын непаладак і спосабаў ліквідацыі непаладак у рабоце швейнай машыны па табліцы. Арганізацыя рабочага месца, правілы бяспекі пры рабоце на швейнай машыне.

Практычная работа. Выкананне чысткі і змазвання швейнай машыны.

Практыкаванні. Вызначэнне віду няспраўнасці, прычыны няспраўнасці, знаходжанне практычных спосабаў іх ліквідацыі.

Паясныя і плечавыя швейныя вырабы.

Элементарныя звесткі аб чарцяжы швейнага вырабу (6 гадзін)

Агульныя звесткі пра адзенне. Розныя віды адзення па прызначэнні, спосабе нашэння. Адрозненне паясных і плечавых швейных вырабаў. Асартымент тканін для выканання розных відаў вырабаў. Узаемасувязь выбару тканіны і мадэлі вырабу. Тканіны з накіраваным і ненакіраваным малюнкамі.

Разнастайнасць мадэлей паясных і плечавых швейных вырабаў. Графічныя сілуэты плечавых вырабаў. Сілуэты па ступені аблягання фігуры чалавека. Віды спадніц.

Агульныя звесткі аб прафесіях мастака-мадэльера, мадэльера-канструктара, тэхнолага, швачкі.

Кропкі чарцяжа. Асноўныя лініі фігуры чалавека. Назвы дэталей і ліній чарцяжа вырабу. Назвы контурных зрэзаў выкрайкі, лякала.

Паслядоўнасць і правілы зняцця мерак. Запіс мерак. Памер вырабу. Вызначэнне памеру вырабу. Стандартныя меркі фігур дзяўчынак школьнага ўзросту. Асноўныя арыенцірныя кропкі фігуры. Падбор выкрайкі (лякала) у адпаведнасці са знятымі меркамі.

Часопісы мод, іх выкарыстанне пры выбары мадэлі. Вызначэнне памеру для паясных і плечавых вырабаў. Работа з лістом выкраек: пошук патрэбнай дэталі, умоўныя абазначэнні, спецыяльныя сімвалы.

Практычныя работы. Параўнанне мадэлей адзення ў часопісах мод. Падбор тканін да розных відаў адзення (з існуючай калекцыі тканін). Замалёўка мадэлей адзення на гатовым контуры.

Падбор выкрайкі з выкарыстаннем часопіса мод. Выраб выкрайкі з выкарыстаннем часопіса мод.

Практыкаванні. Чытанне чарцяжоў швейных вырабаў і суаднясенне чарцяжа з мадэллю. Паказ размяшчэння ўмоўных ліній і кропак на табліцы,

манекене, фігуры вучаніцы. Зняцце і запіс мерак, вызначэнне памеру вырабу, падбор выкрайкі (лякала) у адпаведнасці са знятымі меркамі.

Пашыў паясных вырабаў (24 гадзіны)

Звесткі аб спадніцах. Віды спадніц (па прызначэнні, канструкцыі). Выбар мадэлей спадніц (з улікам прызначэння спадніцы, асаблівасцей фігуры). Падбор тканін з улікам мадэлей і наадварот.

Зняцце і запіс мерак. Пабудова чарцяжа. Назвы дэталей і ліній чарцяжа, выкрайкі, лякал спадніцы. Памеры спадніц. Вызначэнне памераў спадніц. Падбор выкраек (лякал) спадніц у адпаведнасці са знятымі меркамі.

Вытачкі: прызначэнне, размяшчэнне, разлік раствору вытачак.

Разлік расходу тканіны пры пашыве прамой спадніцы. Прыпускі на швы.

Апрацоўка зашпількі тасьмой-маланкай. Віды маланак. Спосабы ўточвання маланак. Апрацоўка абкідвальных петляў.

Спосабы апрацоўкі бакавых зрэзаў, верхняга і ніжняга зрэзаў.

Патрабаванні да апрацоўкі дэталей вырабу. Паслядоўнасць выканання спадніцы.

Варыянты змянення асобных частак спадніцы (пояс, ніз, зашпілька). Дадатковыя дэталі спадніцы (накладныя кішэні, фальбоны, складкі і іншыя).

Разлік расходу тканіны пры пашыве клінавай спадніцы. Разлік шырыні кліна па лініі таліі, лініі сцёгнаў. Прыпускі на швы. Клінавая спадніца з фальбонай.

Апрацоўка ніжняга зрэзу спадніцы фальбонай. Разлік даўжыні фальбоны, спосабы злучэння фальбоны з асноўнай дэталлю.

Практычныя работы. Зняцце мерак. Запіс мерак. Выбар выкрайкі. Падрыхтоўка тканіны да раскрою. Раскладка выкрайкі на тканіне. Абмялоўка. Раскрой тканіны. Падрыхтоўка дэталей крою да апрацоўкі. Падрыхтоўка спадніцы да прымеркі, прымерка. Розныя спосабы апрацоўкі зашпількі тасьмой-маланкай (на ўзоры). Апрацоўка абкідвальных петляў (на ўзоры). Сшыванне вытачак і бакавых зрэзаў (на ўзоры). Апрацоўка бакавых швоў, зашпількі (на ўзоры). Апрацоўка ніжняга зрэзу рознымі спосабамі. Апрацоўка фальбоны. Розныя спосабы злучэння фальбон з асноўнай дэталлю: прышыванне, уточванне, злучэнне з асноўнай дэталлю накладным швом (на ўзоры). Пашыў спадніцы па тэхналагічнай карце. Канчатковая апрацоўка вырабу. Вільготна-цеплавая апрацоўка вырабу.

Вырабы. Спадніца прамая. Спадніца клінавая.

Пашыў плечавых вырабаў (24 гадзіны)

Начная кашуля

Звесткі аб начных кашулях. Прызначэнне начных кашуль. Віды кашуль па канструкцыі, мадэлі начных кашуль. Колеравае вырашэнне і асартымент тканін для пашыву начных кашуль. Віды аздаблення. Падбор тканін з улікам мадэлей і наадварот.

Начная кашуля з круглым выразам. Апісанне фасону. Віды работ пры пашыве кашулі, планаванне работы па пашыве.

Меркі, зняцце мерак, запіс мерак. Меркі, неабходныя для падбору выкрайкі начной кашулі. Вызначэнне памераў начных кашуль.

Выкрайка начной кашулі. Назвы дэталей і зрэзаў выкрайкі (лякал) начной кашулі. Падбор выкраек (лякал) начных кашуль у адпаведнасці са знятымі меркамі, разлік расходу тканіны.

Раскрой тканіны для начной кашулі: эканомія тканіны і ўлік малюнка.

Апрацоўка вытачак. Прызначэнне вытачак у плечавых вырабах. Віды вытачак па месцы размяшчэння і канструкцыі. Разметка вытачак, паслядоўнасць апрацоўкі вытачак па тэхналагічнай карце.

Падрыхтоўка начной кашулі да прымеркі. Прымерка.

Пашыў начной кашулі. Паслядоўнасць выканання начной кашулі.

Практычныя работы. Выраб выкрайкі кашулі, падрыхтоўка выкрайкі да раскрою, разлік расходу тканіны на начную кашулю. Раскрой тканіны для начной кашулі. Апрацоўка нагрудных вытачак па тэхналагічнай карце (на ўзоры). Падрыхтоўка дэталей крою начной кашулі да апрацоўкі. Падрыхтоўка начной кашулі да прымеркі. Правядзенне прымеркі, удакладненне вырабу пасля прымеркі. Апрацоўка вытачак. Апрацоўка плечавых зрэзаў начной кашулі запашывачным швом. Апрацоўка зрэзу гарлавіны двайной касой абшыўкай. Апрацоўка бакавых зрэзаў запашывачным швом. Апрацоўка зрэзаў проймаў двайнымі касымі абшыўкамі. Апрацоўка ніжняга зрэзу швом упадгінку з закрытым зрэзам. Канчатковая апрацоўка вырабу.

### Блузка прамая без рукавоў з адкладным плоскаляжачым каўнярам[4]

Звесткі аб блузках. Віды блузак па прызначэнні. Беларускія народныя блузкі. Тканіны для блузак.

Апісанне фасону вырабу. План апісання фасону вырабу. Складанне апісання фасону розных мадэлей па плане.

Асноўныя дэталі блузкі, дадатковыя дэталі. Віды аздаблення блузак. Фасон. Выбар фасону. Улік асаблівасцей фігуры. Фігуры людзей у

---

[4] Пры наяўнасці неабходнага аб’ёму вучэбнага часу на вывучэнне раздзела, гэта значыць павелічэнні мінімальна вызначанага аб'ёму вучэбнага часу на вывучэнне раздзела «Апрацоўка тканіны» ў IX класе.

залежнасці ад постаці і будовы. Выбар фасону блузкі з улікам асаблівасцей фігуры.

Блузка прамая без рукавоў з адкладным плоскаляжачым каўнярам. Звесткі аб блузцы. Апісанне фасону, асноўныя і аздобныя дэталі блузкі. Дэталі крою блузкі. Віды работ (швоў) пры пашыве блузкі.

Кропкі і лініі чарцяжа блузкі. Кропкі чарцяжа блузкі. Назвы дэталей і ліній чарцяжа, выкрайкі, лякал блузкі.

Звесткі пра падкройныя абшыўкі. Спосабы апрацоўкі зрэзаў дэталей з дапамогай падкройных абшывак. Раскрой падкройнай абшыўкі з аздобнай тканіны.

Адкладныя плоскаляжачыя каўняры. Віды каўняроў. Віды аздабленняў каўнярoў. Адзінарныя і двайныя каўняры. Дэталі двайнога каўняра. Мерка для пабудовы чарцяжа каўняра, шырыня і форма каўняра.

Чарцёж плоскаляжачага каўняра. Пабудова чарцяжоў плоскаляжачых каўнярoў. Назва ліній чарцяжа.

Апрацоўка і злучэнне з вырабам двайнога плоскаляжачага каўняра. Абкідвальныя швы. Віды абкідвальных швоў. Паслядоўнасць апрацоўкі двайнога плоскаляжачага каўняра па тэхналагічнай карце.

Апрацоўка пояса. Віды і прызначэнне паясоў. Даўжыня дэталі пояса, шырыня пояса, злучэнне частак пояса. Паслядоўнасць апрацоўкі пояса.

Зняцце мерак, вызначэнне памеру і расходу тканіны на пашыў блузкі, падбор выкрайкі. Памерныя прыметы гатовага вырабу. Таварны ярлык. Падбор выкрайкі блузкі па памеры з улікам росту. Лініі і ўчасткі выкрайкі, па якіх уносяць змены ў адпаведнасці з меркамі.

Разлік расходу тканіны для пашыву блузкі без рукавоў. Раскрой тканіны і падрыхтоўка блузкі да прымеркі. Правядзенне прымеркі.

Работы па пашыве блузкі. Паслядоўнасць выканання блузкі.

Практычныя работы. Выраб выкрайкі падкройнай абшыўкі. Апрацоўка зрэзу гарлавіны падкройнай абшыўкай (на ўзоры). Апрацоўка зрэзаў проймаў падкройнымі абшыўкамі (на ўзоры). Апрацоўка абкідвальнага шва ў кант (на ўзоры). Апрацоўка двайнога плоскаляжачага каўняра па тэхналагічнай карце (на ўзоры). Злучэнне каўняра з вырабам з дапамогай падкройнай абшыўкі (на ўзоры). Апрацоўка пояса (на ўзоры). Падбор выкрайкі, занясенне змен з улікам сваіх мерак. Падрыхтоўка тканіны да раскрою і раскрой тканіны. Падрыхтоўка дэталей крою блузкі да апрацоўкі. Падрыхтоўка блузкі да прымеркі. Правядзенне прымеркі. Замалёўка мадэлі блузкі ў сшытак па гатовым контуры. Запіс плана работы па пашыве блузкі ў сшытак. Пашыў прамой блузкі без рукавоў з адкладным плоскаляжачым каўнярам па тэхналагічнай карце. Канчатковая апрацоўка вырабу.

### Догляд вырабаў з тэкстыльных матэрыялаў (4 гадзіны)

Мыццё, прызначэнне мыцця, спосабы мыцця (паўтарэнне). Выкарыстанне мыйных сродкаў і адбельвання. Парадак падрыхтоўкі вырабу да мыцця. Сарціроўка вырабаў па саставе, відзе тканіны, колеры. Улік звестак этыкеткі з маркіроўкай. Рэкамендацыі для мыцця вырабаў з улікам валакністага саставу, колеру, рознай ступені забруджанасці, звестак этыкетак.

Этапы мыцця. Паслядоўнасць прасавання спадніцы. Паслядоўнасць прасавання сукенкі.

Практычныя работы. Прасаванне пасцельнай бялізны, верхняга адзення.

Практычнае паўтарэнне (13 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

агульныя звесткі аб новых тканінах, новых відах аздабленняў, тэкстыльных шпалерах, нятканых матэрыялах, сінтэпоне і іх выкарыстанні; віды, уласцівасці і прызначэнне пракладачных і падкладачных матэрыялаў; структуру, віды і ўласцівасці трыкатажнага палатна; групы трыкатажных вырабаў па відзе сыравіны, якая выкарыстоўваецца, па спосабе апрацоўкі;

інструменты і прылады для выканання работ па доглядзе швейнай машыны, парадак і правілы выканання гэтых работ; непаладкі ў рабоце швейнай машыны і спосабы ліквідацыі нескладаных (дробных) непаладак;

агульныя звесткі аб прафесіях мастака-мадэльера, мадэльера-канструктара, тэхнолага, швачкі;

агульныя тэхніка-тэхналагічныя звесткі аб паясных і плечавых швейных вырабах (прызначэнні, канструктыўных асаблівасцях, разнастайнасці мадэлей, чарцяжах, мерках, падборы выкраек);

прызначэнне выкананых вырабаў;

тканіны і іншыя матэрыялы, якія прымяняліся для выканання вырабаў;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць чыстку і змазванне швейнай машыны;

вызначаць від няспраўнасці, прычыны няспраўнасці, знаходзіць практычныя спосабы яе ліквідацыі;

здымаць і запісваць меркі, вызначаць памер вырабу, падбіраць выкрайкі (лякалы) у адпаведнасці са знятымі меркамі, змяняць выкрайкі;

выконваць практычныя работы па пашыве знаёмых паясных і плечавых вырабаў з прымяненнем тэхналагічных аперацый, якія вывучаліся.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па апрацоўцы тканін і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб тканінах пры выкананні догляду швейных вырабаў.

## X КЛАС (81 гадзіна)

### Машыназнаўства (8 гадзін)

Прыстасаванні малой механізацыі да швейных машын. Агульная характарыстыка прыстасаванняў.

Віды, прызначэнне і будова прыстасаванняў першай групы. Накіроўваючыя прыстасаванні для выканання злучальных швоў і паралельных строчак (абмежавальная лінейка, лапка з накіроўваючым борцікам, лапка з лінейкай, лапка-запашывальнік).

Віды, прызначэнне і будова прыстасаванняў другой групы. Прыстасаванні для выканання краявых швоў, акантоўкі зрэзаў (лапка-рубільнік, акантавальнік).

Віды, прызначэнне і будова прыстасаванняў трэцяй групы. Спецыяльныя лапкі для настрочвання тасьмы, тасьмы-маланкі, сутажа, лапка для выканання зборкі.

Правілы бяспечных паводзін пры ўстаноўцы прыстасаванняў і рабоце з імі.

Практычная работа. Устаноўка прыстасаванняў малой механізацыі (устаноўка лапак, наяўных у камплекце).

Практыкаванні. Выкананне аздобных строчак, накладнога і настрочнага швоў, шва ўпадгінку з закрытым зрэзам, запашывачнага шва, паралельных строчак з выкарыстаннем спецыяльных прыстасаванняў.

### Пашыў плечавых вырабаў (50 гадзін)

#### Блузка з зашпількай да верху

Мадэляванне. Варыянты пераносу нагруднай вытачкі. Агульныя звесткі аб мадэляванні, паслядоўнасць выканання работы па мадэляванні. Мадэляванне вытачкі. Перанос вытачкі ў бакавую лінію, у лінію гарлавіны, у лінію таліі.

Мадэляванне выраза гарлавіны. Варыянты выраза гарлавіны. Паслядоўнасць мадэлявання розных варыянтаў выраза гарлавіны.

Мадэляванне какетак. Агульныя звесткі пра какеткі, іх размяшчэнне ў розных вырабах і формах. Паслядоўнасць выканання мадэлявання розных варыянтаў какетак.

Апрацоўка какетак. Розныя спосабы апрацоўкі какетак і іх злучэнні з асноўнай дэталлю.

Віды зашпілек. Зашпілька-разрэз, спосабы апрацоўкі зашпількі. Скразныя зашпількі.

Падборты, звесткі аб падбортах. Падборты суцэльнакроеныя з бортам і адразныя. Назва зрэзаў падборта. Злучэнне частак падборта. Раскрой падборта і апрацоўка верхняга і ўнутранага зрэзаў падборта.

Апрацоўка падбортаў, спосабы апрацоўкі.

Разметка петляў. Месцазнаходжанне, віды і памеры петляў.

Адкладныя каўняры і каўняры на стойцы. Прызначэнне і віды каўняроў. Дэталі крою каўняроў. Мадэлі каўняроў. Падбор чарцяжоў каўняроў у адпаведнасці з мадэллю.

Рукавы як частка швейнага вырабу, іх уплыў на якасць вырабу. Віды ўшытых рукавоў. Разнастайнасць рукавоў па даўжыні, крою і спосабах апрацоўкі ніжніх зрэзаў. Манжэта, часткі манжэты, змена даўжыні рукава пры апрацоўцы ніжняга зрэзу манжэтай. Чарцёж прамога рукава і манжэты. Назвы ліній чарцяжа прамога рукава і манжэты. Меркі для пабудовы чарцяжа асновы доўгага прамога рукава і манжэты. Выкрайка рукава і манжэты, назвы дэталей. Паслядоўнасць падрыхтоўкі выкрайкі рукава і манжэты да раскрою. Памеры прыпускаў на швы рукава і манжэты. Паслядоўнасць апрацоўкі прамой манжэты; манжэты з зашпількай, якая складаецца з дзвюх дэталей; прамой замкнёнай манжэты.

Віды (спосабы) апрацоўкі ніжняга зрэзу рукава. Выбар спосабу апрацоўкі. Віды (спосабы) апрацоўкі ніжняга зрэзу кароткага рукава.

Злучэнне рукавоў з проймамі. Прыметы адрознівання правага і левага рукавоў. Апрацоўка дэталей крою рукавоў пасля іх раскрою. Парадак выканання фастрыгавання і ўшывання рукава ў пройму.

Мадэляванне рукавоў. Паслядоўнасць выканання работы па мадэляванні рукавоў. Нанясенне ліній фасону на гатовую выкрайку, выраб выкрайкі з улікам фасонных ліній.

Блузка з зашпількай да верху. Звесткі аб блузках. Апісанне фасону блузкі. Дэталі крою блузкі.

Выраб выкрайкі блузкі з зашпількай да верху. Меркі, неабходныя для пабудовы чарцяжа асновы прамой блузкі. Зняцце мерак. Вызначэнне становішча ліній грудзей, таліі, сцёгнаў у адпаведнасці са знятымі меркамі. Дадатковыя меркі для пабудовы чарцяжа рукава. Дадатковыя пабудовы на аснове выкрайкі блузкі.

Праверка выкрайкі ў адпаведнасці са сваімі меркамі.

Разлік расходу тканіны на пашыў блузкі ў залежнасці ад яе шырыні і фасону вырабу. Планаванне работы па вырабе блузкі з зашпількай да верху. Падрыхтоўка тканіны да раскрою. Прыпускі на апрацоўку.

Раскрой тканіны з улікам прыпускаў на апрацоўку швоў.

Прымерка блузкі з зашпількай да верху. Падрыхтоўка блузкі да прымеркі. План падрыхтоўкі блузкі да прымеркі. Задачы прымеркі. План правядзення першай прымеркі. Другая прымерка. Падрыхтоўка вырабу да прымеркі, задачы прымеркі, удакладненне ў вырабе даўжыні і шырыні; становішчы каўняра і рукава; пасадкі на фігуры.

Работы па апрацоўцы дэталей і вузлоў блузкі з зашпількай да верху. Паслядоўнасць вырабу блузкі з зашпількай да верху. Тэхналагічная карта «Апрацоўка дэталей і вузлоў блузкі з зашпількай да верху (вытачак, бартоў, каўняра, рукавоў)».

Работы па злучэнні дэталей і вузлоў блузкі з зашпількай да верху (зборка вырабу), тэхналагічная карта.

Вільготна-цеплавая апрацоўка. Звесткі аб вільготна-цеплавой апрацоўцы. Уплыў вільготна-цеплавой апрацоўкі на знешні (таварны) від швейных вырабаў. Выбар рэжымаў вільготна-цеплавой апрацоўкі для розных па валакністым саставе тканін (па табліцы). Умовы і рэкамендацыі для выканання розных відаў вільготна-цеплавых работ. Паляпшэнне якасці швейных вырабаў і выпраўленне некаторых недахопаў з дапамогай вільготна-цеплавой апрацоўкі.

Калодкі для прасавальных работ, іх віды і прызначэнне. Прычыны з’яўлення льснення і яго ліквідацыя. Задачы канчатковага прасавання. Паслядоўнасць выканання канчатковага прасавання блузкі з рукавамі, зашпількай і каўняром. Умовы для эфектыўнага правядзення працэсу вільготна-цеплавой апрацоўкі гатовай блузкі. Прыметы якаснага выканання вільготна-цеплавой апрацоўкі гатовага вырабу. Прыёмы вызначэння якасці гатовага вырабу.

Практычныя работы. Злучэнне прамой какеткі з асноўнай дэталлю сшывальным швом, накідвальным швом, накладным швом. Злучэнне авальнай какеткі з асноўнай дэталлю накладным швом. Апрацоўка какетак з фальбонамі. Апрацоўка разрэзу для зашпількі абшыўкай (на ўзоры).

Выраб выкрайкі падборта суцэльнакроенага, з бортам па тэхналагічнай карце. Выраб выкрайкі адразнога падборта (для вырабаў з адваротамі). Апрацоўка ўнутранага і верхняга зрэзаў падборта швом упадгінку з адкрытым зрэзам (на ўзоры). Апрацоўка борта адразным падбортам (працяг работы). Апрацоўка ніжняга зрэзу борта ў вырабах з зашпількай.

Разметка петляў у вырабах з зашпількай да верху. Разметка петляў у вырабах з адваротамі. Разметка месцаў прышывання гузікаў (на ўзоры).

Апрацоўка адкладнога каўняра (без пракладкі на ўзоры). Апрацоўка каўняра на стойцы (на ўзоры). Злучэнне каўняра на стойцы з гарлавінай (на ўзоры). Злучэнне каўняра з гарлавінай у вырабах з адваротамі (на ўзоры).

Апрацоўка прамой манжэты на ўзоры па тэхналагічнай карце. Апрацоўка ніжняга зрэзу рукава замкнёнай манжэтай (на ўзоры) па гатовым кроі (першы спосаб). Апрацоўка ніжняга зрэзу рукава замкнёнай манжэтай (на ўзоры) па гатовым кроі (другі спосаб). Апрацоўка ніжняга зрэзу рукава прышыўной манжэтай на зашпільцы (на ўзоры). Апрацоўка ніжняга зрэзу кароткага рукава гумовай тасьмой з утварэннем адзінарнай фальбоны (на ўзоры).

Выраб выкрайкі блузкі з зашпількай да верху. Змяненне стандартнай выкрайкі ў адпаведнасці з асаблівасцямі фігуры. Падрыхтоўка і раскрой тканіны для дэталей блузкі. Апрацоўка дэталей крою блузкі. Падрыхтоўка блузкі да прымеркі. Правядзенне першай прымеркі. Апрацоўка вытачак; апрацоўка бартоў; апрацоўка каўняра; апрацоўка рукавоў. Апрацоўка плечавых зрэзаў; апрацоўка бакавых зрэзаў; ушыванне каўняра; ушыванне рукавоў у праймы; апрацоўка ніжняга зрэзу; выкананне разметкі петляў, абкідванне петляў; разметка і прышыванне гузікаў. Выкананне канчатковага прасавання блузкі па тэхналагічнай карце.

### Сукенка суцэльнакроеная, паўпрылеглага сілуэту, з кароткімі рукавамі[5]

Звесткі аб сукенках. Віды сукенак па кроі, канструкцыі. Разнастайнасць дадатковых дэталей і аздаблення. Тканіны для сукенак, выбар тканін у залежнасці ад прызначэння, моды і фасону сукенкі. Выбар фасону сукенкі, мадэль сукенкі, вывучэнне мадэлі. Вызначэнне сілуэту, крою, дадатковых дэталей аздаблення. Распрацоўка фасону, выраб выкрайкі сукенкі ў адпаведнасці з выбраным фасонам.

Апісанне фасону сукенкі, віды швоў, якія прымяняюцца пры пашыве.

Выраб выкрайкі суцэльнакроенай, паўпрылеглай сукенкі з кароткімі рукавамі. Выкарыстанне асновы выкрайкі прамой блузкі. Дадатковыя меркі і пабудовы на аснове выкрайкі прамой блузкі. Таліевыя вытачкі, іх прызначэнне, месца становішча, разлік і размеркаванне. Парадак выканання работы па змяненні выкрайкі.

Парадак пабудовы чарцяжоў дэталей кішэні, рукава, абшывак.

Разлік расходу тканіны на пашыў сукенкі ў залежнасці ад яе шырыні і фасону вырабу.

---

[5] Пры наяўнасці неабходнага аб’ёму вучэбнага часу на вывучэнне раздзела, гэта значыць павелічэнні мінімальна вызначанага аб’ёму вучэбнага часу на вывучэнне раздзела «Апрацоўка тканіны» ў X класе.

Паслядоўнасць вырабу сукенкі з рукавамі (суцэльнакроенай). Раскрой і падрыхтоўка дэталей крою сукенкі да апрацоўкі. Раскладванне матэрыялу. Велічыня прыпускаў на швы для апрацоўкі зрэзаў і швоў да дэталей крою сукенкі. Парадак падрыхтоўкі і раскрою тканіны.

Паслядоўнасць падрыхтоўкі дэталей крою сукенкі да апрацоўкі.

Прымерка сукенкі, паслядоўнасць падрыхтоўкі сукенкі да прымеркі. Правядзенне прымерак, паслядоўнасць правядзення першай і другой прымерак сукенкі.

Паслядоўнасць пашыву сукенкі. Складнікі пашыву складаных швейных вырабаў. Віды работ па апрацоўцы зрэзаў дэталей, выкананні ручных і машынных аперацый і прасавальных работ. Работы па апрацоўцы дэталей і вузлоў сукенкі (тэхналагічная карта). Работы па злучэнні дэталей і вузлоў сукенкі (тэхналагічная карта).

Практычныя работы. Зняцце мерак і разлік раствору таліевых вытачак. Змяненне выкрайкі блузкі, пабудова вытачак. Пабудова чарцяжоў дэталей кішэні, рукава, абшывак. Падрыхтоўка і раскрой тканіны. Падрыхтоўка дэталей крою сукенкі да апрацоўкі. Падрыхтоўка сукенкі да прымеркі. Правядзенне першай прымеркі сукенкі. Правядзенне другой прымеркі сукенкі. Апрацоўка вытачак на спінцы. Апрацоўка вытачак на полках. Апрацоўка абшыўкі да гарлавіны. Апрацоўка накладных кішэняў. Злучэнне накладной кішэні з вырабам. Апрацоўка рукавоў. Апрацоўка плечавых зрэзаў. Апрацоўка гарлавіны. Апрацоўка бакавых зрэзаў. Ушыванне рукавоў. Апрацоўка нізу вырабу. Канчатковая апрацоўка сукенкі.

### Догляд вырабаў з тэкстыльных матэрыялаў (2 гадзіны)

Асноўныя віды работ па доглядзе вырабаў з тэкстыльных матэрыялаў. Прычыны і віды зношвання і разбурэння тэкстыльных вырабаў. Правілы захоўвання тэкстыльных вырабаў. Карысныя парады.

Практыкаванне. Укладванне тэкстыльных вырабаў на працяглае захоўванне.

### Практычнае паўтарэнне (21 гадзіна)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

віды, прызначэнне і будову прыстасаванняў да швейных машын;

разнастайнасць мадэлей плечавых вырабаў; варыянты пераносу нагруднай вытачкі; варыянты формы выраза гарлавіны; варыянты какетак, каўнянроў, паясоў, манжэт, накладных кішэняў, віды зашпілек, віды рукавоў;

призначэнне выкананых вырабаў; тканіны і іншыя матэрыялы, якія прымяняліся для іх вырабу;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

устанаўліваць прыстасаванні малой механізацыі (лапкі, наяўныя ў камплекце);

выконваць аздобныя строчкі, накладное і накідвальнае шво, шво ўпадгінку з закрытым зрэзам, запашывачнае шво, паралельныя строчкі з выкарыстаннем спецыяльных прыстасаванняў;

здымаць і запісваць меркі, вызначаць памер вырабу, падбіраць выкрайкі (лякалы) у адпаведнасці са знятымі меркамі, змяняць выкрайкі;

выконваць практычныя работы па пашыве знаёмых паясных і плечавых вырабаў з прымяненнем тэхналагічных аперацый, якія вывучаліся.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па апрацоўцы тканін і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб тканінах пры выкананні догляду швейных вырабаў.

## АСНОВЫ ГАТАВАННЯ ЕЖЫ

### VI КЛАС (35 гадзін)

#### Уступныя заняткі (2 гадзіны)

Задачы навучання асновам гатавання ежы. Абсталяванне вучэбнага кабінета для заняткаў па асновах гатавання ежы. Санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы бяспечных паводзін на занятках у кабінеце, арганізацыя вучэбнага месца. Прафесіі работнікаў прадпрыемстваў грамадскага харчавання.

Практыкаванне. Арганізацыя вучэбнага месца на занятках па гатаванні ежы.

#### Кухня і яе абсталяванне (4 гадзіны)

Абсталяванне кухні. Размяшчэнне абсталявання. Кухонны посуд, інструменты і прыстасаванні для гатавання ежы. Догляд кухоннага посуду. Сталовы посуд і прыборы. Чайны посуд. Догляд сталовага і чайнага посуду. Арганізацыя вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры чыстцы кухоннага посуду, мыццё кухоннага посуду і прыстасаванняў, сталовага посуду і прыбораў, чайнага посуду.

Практычныя работы. Чыстка і мыццё кухоннага посуду і прыстасаванняў. Мыццё сталовага посуду і прыбораў, чайнага посуду.

## Гігіена харчавання[6] (6 гадзін)

Значэнне харчавання. Асноўныя прадукты харчавання. Рацыянальнае харчаванне – умова захавання здароўя. Уяўленне аб рэжыме харчавання.

Агульныя патрабаванні да якасці прадуктаў харчавання і іх захоўвання. Патрабаванні вытворчай і асабістай гігіены на занятках па апрацоўцы харчовых прадуктаў. Правілы мыцця і дэзынфекцыі рук. Спецвопратка (санвопратка), правілы яе нашэння і захоўвання. Правілы бяспечных паводзін пры рабоце з прасам.

Практычныя работы. Практыкаванні ў мыцці і дэзынфекцыі рук, апрацоўцы пазногцяў. Прасаванне прадметаў спецвопраткі.

## Сервіроўка стала да сняданку (2 гадзіны)

Паняцце аб сервіроўцы стала. Стравы, якія рэкамендуюцца для ўключэння ў меню для сняданку. Паслядоўнасць сервіроўкі стала да сняданку. Варыянты сервіроўкі стала да сняданку. Правілы карыстання сталовымі прыборамі.

Практычная работа. Сервіроўка стала да сняданку ў адпаведнасці з меню.

## Гарачыя напіткі (4 гадзіны)

Гарачыя напіткі: чай, кава, какава, іх значэнне ў харчаванні чалавека. Зялёны і чорны чай. Кава ў зернях, молатая, распушчальная. Спосабы гатавання гарачых напіткаў.

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні. Арганізацыя вучэбнага месца. Правілы бяспечных паводзін пры гатаванні гарачых напіткаў. Тэрміны ўжывання прыгатаваных гарачых напіткаў.

Практычныя работы. Заварванне чаю. Гатаванне какавы з какава-парашку.

## Стравы з яек (4 гадзіны)

Харчовая каштоўнасць яек. Тэрміны захоўвання яек і іх абазначэнне. Умовы захоўвання яек. Прыметы недабраякаснасці яек. Тэхналогія гатавання адварных яек, яечні.

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні. Арганізацыя вучэбнага месца. Правілы бяспечных паводзін пры гатаванні страў з яек. Тэрміны рэалізацыі страў з яек.

---

[6] Калі матэрыялы тэм «Гігіена харчавання», «Бутэрброды», «Гарачыя напіткі» вывучаліся ў V класе, то яны выносяцца на заняткі практычнага паўтарэння.

Практычныя работы. Адварванне яек. Гатаванне яечні.

Бутэрброды (4 гадзіны)

Харчовая каштоўнасць хлеба. Бутэрброды і іх віды. Тэхналогія гатавання і афармлення бутэрбродаў.

Санітарна-гігіенічныя правілы. Арганізацыя вучэбнага месца. Правілы бяспечных паводзін пры гатаванні бутэрбродаў. Правілы захоўвання і тэрміны рэалізацыі бутэрбродаў.

Практычныя работы. Нарэзка хлеба, іншых прадуктаў. Гатаванне адкрытых і закрытых, простых і камбінаваных бутэрбродаў.

Беларуская нацыянальная кухня (2 гадзіны)

Беларуская нацыянальная кухня. Стравы беларускай нацыянальнай кухні, якія гатуюцца на сняданак.

Практычнае паўтарэнне (7 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

агульныя санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках па апрацоўцы харчовых прадуктаў;

абсталяванне кухні; кухонны, сталовы і чайны посуд, інструменты і прыстасаванні для гатавання ежы; правілы догляду кухоннага, сталовага і чайнага посуду;

значэнне харчавання; асноўныя групы прадуктаў харчавання; агульныя патрабаванні да якасці прадуктаў харчавання і іх захоўвання;

паслядоўнасць сервіроўкі стала да сняданку;

харчовую каштоўнасць хлеба, яек;

гарачыя напіткі, стравы з яек, віды бутэрбродаў; тэхналогію іх гатавання;

стравы нацыянальнай беларускай кухні, якія гатуюцца на сняданак;

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

чысціць і мыць кухонны посуд і прыстасаванні, мыць сталовы посуд і прыборы, чайны посуд; дэзынфікаваць рукі, апрацоўваць пазногці; прасаваць прадметы спецвопраткі; сервіраваць стол да сняданку; вызначаць дабраякаснасць яек; гатаваць знаёмыя гарачыя напіткі, стравы з яек, бутэрброды.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па асновах гатавання ежы, па сацыяльна-бытавой арыенціроўцы і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб прадуктах і тэхналогіі іх апрацоўкі пры вырашэнні «вытворчых» задач («канструяванне» бутэрбродаў і гэтак далей).

## VII КЛАС (35 гадзін)

### Асновы рацыянальнага харчавання (2 гадзіны)

Агульнае ўяўленне аб рацыянальным харчаванні. Рэжым харчавання. Правілы рацыянальнага харчавання. Значэнне рацыянальнага харчавання для здароўя чалавека.

### Сервіроўка стала да вячэры (2 гадзіны)

Стравы, якія рэкамендуюцца для ўключэння ў меню для вячэры. Паслядоўнасць сервіроўкі стала да вячэры. Варыянты сервіроўкі стала да вячэры. Асаблівасці сервіроўкі стала да святочнай вячэры.

Практычная работа. Сервіроўка стала да вячэры ў адпаведнасці з меню.

### Стравы з малака і малочных прадуктаў (10 гадзін)

Асартымент і харчовая каштоўнасць малака і малочных прадуктаў. Умовы і тэрміны захоўвання малака і малочных прадуктаў. Прыметы недабраякаснасці малака і малочных прадуктаў. Звесткі, якія змяшчаюцца на ўпакоўках малака і малочных прадуктаў. Разнастайнасць малочных страў. Сумяшчальнасць малака з іншымі прадуктамі харчавання. Тэхналогія гатавання малочных супоў, каш на малацэ, сырнікаў.

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні. Арганізацыя вучэбнага месца. Правілы бяспечных паводзін пры гатаванні страў з малака і малочных прадуктаў. Тэрміны рэалізацыі страў з малака і малочных прадуктаў.

Практычныя работы. Гатаванне малочных супоў, каш на малацэ. Гатаванне сырнікаў.

### Стравы з круп і макаронных вырабаў (10 гадзін)

Асартымент і харчовая каштоўнасць круп і макаронных вырабаў. Умовы і тэрміны захоўвання круп і макаронных вырабаў. Разнастайнасць страў з круп і макаронных вырабаў. Звесткі, якія змяшчаюцца на ўпакоўках круп і макаронных вырабаў. Шматкі, гатовыя да ўжывання, і кашы хуткага прыгатавання, іх разнастайнасць і спосабы выкарыстання ў ежу. Тэхналогіі

гатавання розных каш. Тэхналогія гатавання гарніру з макаронных вырабаў.

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні. Арганізацыя вучэбнага месца. Правілы бяспечных паводзін пры гатаванні страў з круп і макаронных вырабаў. Тэрміны рэалізацыі страў з круп і макаронных вырабаў.

Практычныя работы. Першасная апрацоўка круп. Гатаванне каш. Гатаванне гарніру з макаронных вырабаў.

### Беларуская нацыянальная кухня (2 гадзіны)

Асаблівасці штодзённых народных трапез. Стравы беларускай нацыянальнай кухні, якія гатуюцца на вячэру.

### Практычнае паўтарэнне (9 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

правілы і значэнне рацыянальнага харчавання для здароўя чалавека;

варыянты і паслядоўнасць сервіроўкі стала да вячэры;

стравы з малака і малочных прадуктаў, круп і макаронных вырабаў; тэхналогію іх гатавання;

стравы нацыянальнай беларускай кухні, якія гатуюцца на вячэру;

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

сервіраваць стол да вячэры; вызначаць дабраякаснасць малака і малочных прадуктаў, круп і макаронных вырабаў; гатаваць знаёмыя стравы з малака і малочных прадуктаў, круп і макаронных вырабаў.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па асновах гатавання ежы, па сацыяльна-бытавой арыенціроўцы і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб стравах з малака і малочных прадуктаў, круп і макаронных вырабаў пры вызначэнні страў, якія можна прыгатаваць з прапанаванага набору прадуктаў.

## VIII КЛАС (35 гадзін)

### Асновы рацыянальнага харчавання (8 гадзін)

Пажыўныя рэчывы, неабходныя арганізму чалавека. Звесткі аб пажыўных рэчывах, якія змяшчаюцца на ўпакоўках прадуктаў харчавання. Утрыманне пажыўных рэчываў у асноўных прадуктах харчавання. Неабходнасць спажывання разнастайных прадуктаў харчавання. Віды прыёмаў ежы, выбар прадуктаў і страў для асобных прыёмаў ежы.

Практычная работа. Складанне меню на дзень, тыдзень.

### Сервіроўка стала да абеду (2 гадзіны)

Стравы, якія рэкамендуюцца для ўключэння ў меню для абеду. Асаблівасці сервіроўкі стала да абеду. Варыянты сервіроўкі стала да абеду.

Практычная работа. Сервіроўка стала да абеду ў адпаведнасці з меню.

### Агародніна. Салаты з агародніны (4 гадзіны)

Разнастайнасць агароднінных культур. Харчовая каштоўнасць агародніны.

Захоўванне агародніны. Прыметы недабраякаснасці агародніны. Разнастайнасць страў з агародніны. Правілы і спосабы першаснай апрацоўкі агародніны. Формы нарэзкі агародніны. Віды цеплавой апрацоўкі агародніны. Тэхналогія гатавання найпрасцейшых салатаў.

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні. Арганізацыя вучэбнага месца. Правілы бяспечных паводзін пры гатаванні салатаў. Тэрміны рэалізацыі салатаў.

Практычныя работы. Першасная апрацоўка агародніны. Нарэзка агародніны. Гатаванне найпрасцейшых салатаў.

### Стравы з бульбы (6 гадзін)

Харчовая каштоўнасць бульбы. Захоўванне бульбы. Прыметы недабраякаснасці бульбы. Разнастайнасць страў з бульбы. Правілы і спосабы першаснай апрацоўкі бульбы. Спосабы нарэзкі бульбы. Віды цеплавой апрацоўкі бульбы. Тэхналогія гатавання бульбы адварной, пюрэ, бульбы смажанай.

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні. Арганізацыя вучэбнага месца. Правілы бяспечных паводзін пры гатаванні страў з бульбы. Тэрміны рэалізацыі страў з бульбы.

Практычныя работы. Першасная апрацоўка бульбы. Гатаванне бульбы адварной, пюрэ, бульбы смажанай.

### Мяса. Мясныя стравы (6 гадзін)

Класіфікацыя мяса па відзе і ўзросце. Харчовая каштоўнасць мяса. Мясныя прадукты. Умовы захоўвання мяса і мясапрадуктаў. Прыметы недабраякаснасці мяса і мясапрадуктаў. Разнастайнасць мясных страў. Паўфабрыкаты для гатавання мясных страў. Звесткі, якія змяшчаюцца на

ўпакоўках мясных прадуктаў. Прыправы для мясных страў. Тэхналогія гатавання булёну з кубікаў. Тэхналогія адварвання сасісак, пельменяў. Выкарыстанне мясных (каўбасных) вырабаў для гатавання халодных закусак, салатаў.

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні. Арганізацыя вучэбнага месца. Правілы бяспечных паводзін пры гатаванні мясных страў. Тэрміны рэалізацыі мясных страў.

Практычныя работы. Гатаванне булёну з кубікаў. Адварванне сасісак, пельменяў. Гатаванне мясных салатаў.

Беларуская нацыянальная кухня (2 гадзіны)

Стравы беларускай нацыянальнай кухні, якія рыхтуюцца на абед; асаблівасці іх гатавання.

Практычнае паўтарэнне (7 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

агульныя звесткі аб пажыўных рэчывах, выбары прадуктаў і страў для асобных прыёмаў ежы;

разнастайнасць агародніны, назвы мяса ў залежнасці ад віду жывёл, мясапрадукты; харчовую каштоўнасць агародніны, бульбы, мяса і мясапрадуктаў;

умовы захоўвання і прыметы недабраякаснасці агародніны, бульбы, мяса і мясапрадуктаў;

разнастайнасць страў з агародніны, бульбы, мясных страў;

правілы і спосабы першаснай апрацоўкі, нарэзкі і цеплавой апрацоўкі агародніны і бульбы;

тэхналогію прыгатавання найпрасцейшых салатаў з агародніны, бульбы адварной, пюрэ, бульбы смажанай, булёну з кубікаў, адварвання сасісак, пельменяў, прыгатавання мясных салатаў;

тэрміны рэалізацыі страў, якія вывучаліся;

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

сервіраваць стол да абеду; вызначаць дабраякаснасць агародніны, бульбы, мяса і мясапрадуктаў; гатаваць знаёмыя стравы з агародніны, бульбы, мясапрадуктаў.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па асновах гатавання

ежы, па сацыяльна-бытавой арыенціроўцы і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб стравах з агародніны, бульбы, мяса і мясапрадуктаў пры вызначэнні страў, якія можна прыгатаваць з прапанаванага набору прадуктаў.

## IX КЛАС (35 гадзін)

### Асновы рацыянальнага харчавання (4 гадзіны)

Паняцце калорыі. Каларыйнасць харчовых прадуктаў.

Практычныя работы. Разлік каларыйнасці. Складанне меню на дзень з улікам каларыйнасці харчовых прадуктаў.

### Сервіроўка стала (2 гадзіны)

Асаблівасці сервіроўкі стала для прыёму гасцей.

Практычная работа. Сервіроўка стала для прыёму гасцей.

### Рыба. Рыбныя стравы (6 гадзін)

Рыбныя прадукты. Віды рыб. Харчовая каштоўнасць рыбы. Умовы захоўвання рыбы і рыбных прадуктаў. Прыметы недабраякаснасці рыбы і рыбных прадуктаў. Разнастайнасць рыбных страў. Паўфабрыкаты для рыбных страў. Звесткі, якія змяшчаюцца на ўпакоўках рыбных вырабаў.

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні. Арганізацыя вучэбнага месца. Правілы бяспечных паводзін пры гатаванні рыбных страў. Тэрміны рэалізацыі рыбных страў.

Практычныя работы. Гатаванне халодных закусак і салатаў з выкарыстаннем гатовых рыбных прадуктаў.

### Кансерваванне (7 гадзін)

Спосабы кансервавання. Значэнне кансерваваных прадуктаў у харчаванні чалавека. Умовы і тэрміны захоўвання кансерваваных прадуктаў. Звесткі, якія змяшчаюцца на ўпакоўках кансерваваных прадуктаў. Агульныя звесткі аб тэхналогіі стэрылізацыі, засолкі і марынавання, сушкі, кансервавання з цукрам, перапрацоўкі на сокі. Апрацоўка тары.

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні. Арганізацыя вучэбнага месца. Правілы бяспечных паводзін пры кансерваванні агародніны і садавіны. Прыметы недабраякаснасці кансерваваных прадуктаў. Прычыны і прыметы атручэння кансерваванымі прадуктамі.

Практычныя работы. Кансерваванне агародніны і садавіны (без герметызацыі).

Беларуская нацыянальная кухня (8 гадзін)

Найбольш распаўсюджаныя стравы беларускай нацыянальнай кухні (дранікі, бульбяна-маркоўныя аладкі і іншыя), тэхналогія іх гатавання.

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні. Арганізацыя вучэбнага месца. Правілы бяспечных паводзін пры гатаванні страў беларускай нацыянальнай кухні. Тэрміны рэалізацыі страў беларускай нацыянальнай кухні.

Практычныя работы. Гатаванне дранікаў, бульбяна-маркоўных аладак.

Практычнае паўтарэнне (8 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

звесткі аб каларыйнасці харчовых прадуктаў;

асаблівасці сервіроўкі стала для прыёму гасцей;

прадукты з рыбы;

спосабы кансервавання ў хатніх умовах;

стравы нацыянальнай беларускай кухні;

умовы захоўвання і прыметы недабраякаснасці прадуктаў з рыбы;

тэхналогію гатавання халодных закусак і салатаў з выкарыстаннем гатовых рыбных прадуктаў;

агульныя звесткі аб тэхналогіі стэрылізацыі, засолкі і марынавання, сушкі, кансервавання з цукрам, перапрацоўкі на сокі;

умовы і тэрміны захоўвання кансерваваных прадуктаў;

звесткі, якія змяшчаюцца на ўпакоўках кансерваваных прадуктаў;

прыметы недабраякаснасці кансерваваных прадуктаў; прычыны і прыметы атручэння кансерваванымі прадуктамі;

тэрміны рэалізацыі страў, якія вывучаліся;

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць разлік каларыйнасці; складаць меню на дзень з улікам каларыйнасці харчовых прадуктаў;

сервіраваць стол для прыёму гасцей;

гатаваць халодныя закускі і салаты з выкарыстаннем гатовых рыбных прадуктаў; кансерваваць агародніну і садавіну (без герметызацыі); гатаваць стравы беларускай нацыянальнай кухні, якія вывучаліся.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па асновах гатавання ежы, па сацыяльна-бытавой арыенціроўцы і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб закусках і салатах, гатовых рыбных прадуктах пры вызначэнні страў, якія можна прыгатаваць з выкарыстаннем набору прапанаваных прадуктаў.

## X КЛАС (35 гадзін)

### Асновы рацыянальнага харчавання (4 гадзіны)

Набыццё прадуктаў харчавання. Цана на асноўныя прадукты харчавання ў розных магазінах і на рынку. Сезоннае змяненне цаны асобных прадуктаў харчавання. Дробнааптовыя і рознічныя цэны на прадукты харчавання. Эканамічная мэтазгоднасць хатняга прыгатавання розных страў.

Прадпрыемствы і аб'екты грамадскага харчавання. Кошт паслуг прадпрыемстваў грамадскага харчавання.

Практычныя работы. Складанне меню на тыдзень. Вызначэнне затрат на гатаванне асобных страў. Разлік затрат на харчаванне на дзень, тыдзень, месяц.

### Вырабы з цеста (10 гадзін)

Мука, віды мукі. Гатункі мукі. Віды цеста. Разнастайнасць вырабаў з дражджавога цеста. Тэхналогія гатавання дражджавога цеста. Тэрміны выкарыстання дражджавога цеста. Тэхналогія гатавання найпрасцейшых вырабаў (на выбар настаўніка) з дражджавога цеста. Разнастайнасць вырабаў з бісквітнага цеста. Тэхналогія гатавання бісквітнага цеста. Тэрміны выкарыстання бісквітнага цеста. Тэхналогія гатавання найпрасцейшых вырабаў (на выбар настаўніка) з бісквітнага цеста. Разнастайнасць вырабаў з пясочнага цеста. Тэхналогія гатавання пясочнага цеста. Тэрміны выкарыстання пясочнага цеста. Тэхналогія гатавання найпрасцейшых вырабаў (на выбар настаўніка) з пясочнага цеста.

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні. Арганізацыя вучэбнага месца. Правілы бяспечных паводзін пры гатаванні цеста і вырабаў з цеста. Тэрміны рэалізацыі вырабаў з цеста. Прыметы недабраякаснасці вырабаў з цеста.

Практычныя работы. Распазнаванне дабраякаснасці мукі. Гатаванне дражджавога, пясочнага, бісквітнага цеста (на выбар). Гатаванне найпрасцейшых вырабаў з цеста (з улікам выбранага цеста).

Садавіна і ягады. Салодкія стравы (8 гадзін)

Разнастайнасць садавіны і ягад. Харчовая каштоўнасць садавіны і ягад. Захоўванне садавіны і ягад. Прыметы недабраякаснасці садавіны і ягад. Разнастайнасць страў з выкарыстаннем садавіны і ягад. Неабходнасць і спосабы мыцця садавіны і ягад. Тэхналогія гатавання кісялёў і кампотаў.

Санітарна-гігіенічныя правілы. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры гатаванні кісялёў і кампотаў. Тэрміны рэалізацыі кісялёў, кампотаў.

Практычныя работы. Мыццё садавіны і ягад. Гатаванне кісялёў, кампотаў.

Беларуская нацыянальная кухня (4 гадзіны)

Сямейныя традыцыі гатавання страў нацыянальнай беларускай кухні.

Практычная работа. Гатаванне страў нацыянальнай беларускай кухні.

Практычнае паўтарэнне (9 гадзін)

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

цэны на асноўныя прадукты харчавання;

звесткі аб прадпрыемствах, аб’ектах грамадскага харчавання і іх паслугах;

эканамічную выгаду хатняга гатавання розных страў;

віды мукі і віды цеста;

разнастайнасць садавіны і ягад і іх харчовую каштоўнасць;

разнастайнасць страў з выкарыстаннем садавіны і ягад, разнастайнасць вырабаў з цеста;

умовы захоўвання і прыметы недабраякаснасці вырабаў з цеста, садавіны і ягад, страў з выкарыстаннем садавіны і ягад;

тэхналогію гатавання дражджавога, бісквітнага і пясочнага цеста, найпрасцейшых вырабаў з цеста, кісялёў, кампотаў;

тэрміны рэалізацыі страў і вырабаў, якія вывучаліся;

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

складаць меню на тыдзень; вызначаць выдаткі на гатаванне асобных страў; разлічваць выдаткі на харчаванне на дзень, тыдзень, месяц;

гатаваць найпрасцейшыя вырабы з цеста, кісель, кампот, дражджавое, бісквітнае і пясочнае цеста.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігієнічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па асновах гатавання ежы, па сацыяльна-бытавой арыенціроўцы і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб відах мукі і цеста, садавіне і ягадах пры вызначэнні страў, якія можна прыгатаваць з выкарыстаннем набору прапанаваных прадуктаў.

## РАМОНТНЫЯ РАБОТЫ Ў БЫЦЕ

### VI КЛАС (60 гадзін)

#### Уступныя заняткі (2 гадзіны)

Задачы навучання рамонтна-будаўнічым работам. Арганізацыя і абсталяванне кабінета (майстэрні). Захоўванне інструментаў, агульныя правілы карыстання інструментамі. Спецвопратка і абутак. Санітарна-гігієнічныя патрабаванні, правілы бяспечных паводзін на занятках па рамонтных работах у быце. Вучэбнае месца.

#### Агульныя звесткі аб канструкцыі будынкаў і збудаванняў (4 гадзіны)

Асноўныя групы будынкаў па прызначэнні: грамадзянскія, прамысловыя і вытворчыя. Прызначэнне грамадзянскіх будынкаў – задавальненне жыллёвых, культурных і іншых запатрабаванняў людзей. Асноўныя часткі будынкаў (падмурак, вонкавыя і ўнутраныя сцены, перакрыцці, падлога, лесвіцы, вокны і дзверы, перагародкі, дахі), іх прызначэнне.

Экскурсіі ў грамадзянскія, прамысловыя і вытворчыя будынкі.

#### Зялёнае будаўніцтва (16 гадзін)

Паняцце зялёнага будаўніцтва. Прызначэнне і будова кветнікаў, садовых дарожак, альпійскіх горак. Добраўпарадкаванне тэрыторыі. Віды пашкоджанняў аб’ектаў зялёнага будаўніцтва. Асаблівасці догляду дарожак у розныя поры года. Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры ўладкаванні аб’ектаў зялёнага будаўніцтва і іх рамонце.

Практычныя работы. Разбіўка і будова кветнікаў, садовых дарожак, альпійскіх горак; догляд іх. Догляд дарожак у цёплую пару года: ачыстка садовых дарожак ад травы, пасыпанне садовых дарожак шчэбнем або бітай цэглай. Уборка тэрыторыі падчас восеньскага лістападу. Уборка дарожак ад снегу і наледзі. Дробны рамонт бардзюраў. Апраўка броўкі.

#### Санітарна-тэхнічныя работы (4 гадзіны)

Прызначэнне і агульная будова ўнутранага водаправода і каналізацыі. Прызначэнне вентыляў і кранаў. Будова ўнітаза. Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры выкананні санітарна-тэхнічных работ.

Практычная работа. Устаноўка сядзення на ўнітаз.

Устаноўка і рамонт агароджаў на тэрыторыі школы (24 гадзіны)

Паняцце драўніны. Сталярныя інструменты: піла (нажоўка), рубанак, малаток, абцугі.

Прызначэнне агароджаў. Будова драўлянага плота, агароджаў дрэў і кустоў.

Будова дэкаратыўных агароджаў з лазовага дубца (лазы). Уласцівасці лазовага дубца. Патрабаванні да матэрыялу, яго якасныя характарыстыкі (даўжыня, таўшчыня, адсутнасць сучкоў і бакавых галінак). Тэхналогія вырабу дэкаратыўнай агароджы (бардзюра) для клумбы, рабаткі. Патрабаванні да якасці работ.

Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры апрацоўцы драўляных загатовак, устаноўцы і рамонце агароджаў.

Практычныя работы. Будова агароджаў дрэў і хмызнякоў: падбор калкоў, падгонка іх па вышыні (адпілоўванне) і апрацоўка габляваннем, укопванне калкоў, нацягванне і завязванне шнура. Дробны рамонт плота: удзел у вырабе штыкетніка, прыбіванне штыкетніка. Выраб дэкаратыўнага бардзюра з лазы і яго ўстаноўка.

Практычнае паўтарэнне (10 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках па рамонтных работах у быце;

агульныя звесткі аб канструкцыі будынкаў і збудаванняў;

прызначэнне і будову аб’ектаў зялёнага будаўніцтва, асаблівасці догляду іх; віды пашкоджанняў аб’ектаў зялёнага будаўніцтва;

прызначэнне і агульную будову ўнутранага водаправода і каналізацыі; прызначэнне вентыляў і кранаў; будову ўнітаза;

будову агароджаў дрэў і кустоў;

уласцівасці лазовага дубца і патрабаванні да яго як матэрыялу для агароджаў;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць уладкаванне аб’ектаў зялёнага будаўніцтва на тэрыторыі школы і іх дробны рамонт; устанаўліваць сядзенне на ўнітаз; выконваць знаёмыя заданні па ўстаноўцы і рамонце агароджаў.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па рамонтных работах у быце і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў зменай практычнай сітуацыі, якая патрабуе выканання работ па рамонце аб’ектаў зялёнага будаўніцтва, устаноўцы і рамонце агароджаў; удзельнічаць у іх планаванні.

## VII КЛАС (60 гадзін)

### Паняцце тынкавання. Віды тынкоўкі (4 гадзіны)

Азначэнне тынкавання. Прызначэнне тынкавання. Пласты тынкоўкі. Звычайная і дэкаратыўная тынкоўка. Простая, палепшаная і высакаякасная тынкоўка. Сухая тынкоўка. Санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках па вывучэнні тынкавальных работ.

Практыкаванні ў распазнаванні відаў тынкоўкі.

### Тынкавальныя растворы (6 гадзін)

Растворы для тынкавальных работ. Вяжучыя матэрыялы. Запаўняльнікі. Кампаненты для падрыхтоўкі раствораў (вывучаюцца кампаненты раствораў, якія прымяняюцца пры выкананні практычных работ на занятках). Прапорцыі. Тэхналогія падрыхтоўкі тынкавальнага раствору з сухой сумесі заводскай вытворчасці. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры прыгатаванні раствораў і ў рабоце з растворамі.

Практыкаванне. Удзел у прыгатаванні раствораў для тынкавальных работ з кампанентаў у прапорцыях; з сумесі заводскай вытворчасці.

### Дапаможныя матэрыялы для тынкавальных работ (2 гадзіны)

Віды і прызначэнне арміруючых матэрыялаў. Правілы бяспечных паводзін пры рабоце з арміруючымі матэрыяламі.

### Інструменты і прыстасаванні для тынкавальных работ (4 гадзіны)

Прызначэнне і будова інструментаў: бучарда, зубіла, тынкавальная лапатка (кельня), адразоўка, сокал, цёрка і паўцёрак, правіла. Правілы бяспечных паводзін пры рабоце і абыходжанні з імі. Прызначэнне і будова вымяральных інструментаў. Тынкавальная скрыня.

Падрыхтоўка паверхні да атынкоўкі (6 гадзін)

Паверхні з розных будаўнічых матэрыялаў. Падрыхтоўка да атынкоўкі бетонных, гіпсабетонных, гіпсавых, цагляных, драўляных паверхняў. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры падрыхтоўцы паверхні да атынкоўкі. Індывідуальныя сродкі аховы.

Практыкаванні ў падрыхтоўцы паверхняў да атынкоўкі.

Асноўныя аперацыі звычайнага тынкавання (16 гадзін)

Спосабы нанясення раствору: намазванне, накідванне. Прызначэнне апырску, грунту, накрыўкі. Спосабы нанясення апырску, грунту, накрыўкі. Параўнанне простай і палепшанай тынкоўкі. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні апырску, грунту, накрыўкі.

Практычныя работы. Удзел у прыгатаванні тынкавальных раствораў. Нанясенне апырску, грунту і накрыўкі ў вучэбных кабінах (на вучэбных шчытах).

Дэфекты тынкоўкі. Тынкоўка раней
атынкаваных паверхняў усярэдзіне будынка (10 гадзін)

Патрабаванні да якасці тынкоўкі. Дэфекты тынкоўкі (дуцікі, расколіны, адслойванне, успучванне), іх прычыны. Спосабы ліквідацыі дэфектаў тынкоўкі. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ па рамонце атынкаваных паверхняў.

Практычныя работы. Падрыхтоўка паверхні да рамонту. Удзел у падрыхтоўцы раствору, атынкоўцы паверхні, якая падлягае рамонту.

Аб’екты работы. Сцены.

Установка і замена сталярна-мэблевай фурнітуры (4 гадзіны)

Дэталі сталярна-мэблевай фурнітуры і іх прызначэнне. Прызначэнне і памеры шруб. Інструменты, якія выкарыстоўваюцца падчас установкі фурнітуры. Прыёмы работ па ўстаноўцы фурнітуры. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры ўстаноўцы фурнітуры.

Практычныя работы. Установка і замена сталярна-мэблевай фурнітуры.

Практычнае паўтарэнне (8 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

азначэнне, прызначэнне, пласты і віды тынкоўкі;

тынкавальныя растворы, дапаможныя матэрыялы, інструменты і прыстасаванні для тынкавальных работ;

асаблівасці падрыхтоўкі да атынкоўкі бетонных, гіпсабетонных, гіпсавых, цагляных, драўляных паверхняў;

асноўныя аперацыі звычайнай тынкоўкі і тэхналогію іх выканання;

дэфекты тынкоўкі, іх прычыны і спосабы ліквідацыі;

дэталі сталярна-мэблевай фурнітуры і іх прызначэнне;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

удзельнічаць у выкананні тынкавальных работ; устанаўліваць і замяняць дэталі сталярна-мэблевай фурнітуры.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па рамонтных работах у быце і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў зmenенай практычнай сітуацыі, якая патрабуе выяўлення дэфектаў і яе рамонту.

## VIII КЛАС (46 гадзін)

### Матэрыялы для малярных работ (4 гадзіны)

Прызначэнне малярных работ. Разнастайнасць лакафарбавых матэрыялаў. Умовы захоўвання лакафарбавых матэрыялаў і работы з імі. Дапаможныя матэрыялы: пакосты, грунтоўкі, шпаклёўкі, падкітоўкі, растваральнікі; іх прызначэнне. Правілы захоўвання лакафарбавых матэрыялаў і дапаможных матэрыялаў. Санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках па вывучэнні малярных работ.

Практыкаванні ў распазнаванні асобных лакафарбавых матэрыялаў і дапаможных матэрыялаў. Вывучэнне зместу этыкетак і інструкцый на ўпакоўках лакафарбавых і дапаможных матэрыялаў.

### Інструменты для малярных работ (4 гадзіны)

Інструменты для падрыхтоўкі паверхняў да афарбоўвання: металічныя і шчацінныя шчоткі, стамеска, малаток, зубіла, скрабкі, шпаталі, іх прызначэнне і будова. Дапаможны матэрыял: шліфавальная шкурка, пемза, лешчадзь, іх прызначэнне.

Пэндзлі: адрозніванне пэндзляў па прызначэнні, матэрыяле вырабу, памеры, форме. Догляд пэндзляў. Валікі, іх прызначэнне і будова. Адрозненне валікаў па матэрыяле насадкі і прызначэнні. Догляд валікаў.

Правілы бяспечных паводзін пры рабоце з інструментамі. Захоўванне інструментаў.

Простае афарбоўванне драўляных паверхняў (8 гадзін)

Прызначэнне афарбоўкі драўляных паверхняў. Фарбавальныя саставы: уласцівасці, састаў, прымяненне; фарбы гатовыя да ўжывання і густацёртыя. Падрыхтоўка драўлянай паверхні да афарбоўвання. Прызначэнне пакошчання і падкітоўкі (падмазкі) шпаклёўкай драўляных паверхняў.

Патрабаванні да паверхні, якая афарбоўваецца. Паслядоўнасць падрыхтоўкі драўляных паверхняў да афарбоўвання. Правілы афарбоўвання драўляных паверхняў. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры афарбоўванні драўляных паверхняў.

Практычныя работы. Падрыхтоўка фарбавальных саставаў да работы. Падрыхтоўка паверхняў да афарбоўвання. Афарбоўванне ручным інструментам. Догляд інструмента.

Аб'екты работы. Платы, збудаванні на гульнявой і спартыўнай пляцоўках, лаўкі на тэрыторыі школы, стэнды, сталярныя вырабы.

Афарбоўванне металічных паверхняў (4 гадзіны)

Прызначэнне афарбоўкі металічных паверхняў. Фарбавальныя саставы: уласцівасці, састаў, прымяненне. Прыстасаванні для афарбоўвання труб, рашотак, радыятараў.

Патрабаванні да паверхні, якая афарбоўваецца. Паслядоўнасць падрыхтоўкі металічных паверхняў да афарбоўвання. Правілы афарбоўвання металічных паверхняў. Саставы, якія рэкамендуюцца для афарбоўвання труб з гарачай вадой і радыятараў. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры афарбоўванні металічных паверхняў.

Практыкаванні ў распазнаванні фарбавальных саставаў.

Практычныя работы. Падрыхтоўка фарбавальных саставаў да работы. Падрыхтоўка паверхняў да афарбоўвання. Афарбоўванне ручным інструментам. Догляд інструмента.

Аб'екты работы. Трубы, радыятары, металічныя часткі агароджаў.

Палепшанае афарбоўванне драўляных паверхняў (8 гадзін)

Паняцце палепшанай афарбоўкі. Тэхналагічныя аперацыі палепшанай афарбоўкі. Падрыхтоўка фарбавальных саставаў. Грунтоўкі і шпаклёўкі. Інструменты для выдалення сучкоў і засмолаў: стамеска, малаток. Правілы работы стамескай, малатком.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры палепшаным афарбоўванні драўляных паверхняў.

Практычныя работы. Падрыхтоўка фарбавальных саставаў да работы. Падрыхтоўка паверхняў да афарбоўвання (выдаленне сучкоў і засмолаў выконваецца настаўнікам). Афарбоўванне ручным інструментам. Догляд інструмента.

Аб'екты работы. Прадметы мэблі, стэнды і іншыя сталярныя вырабы.

Афарбоўванне раней афарбаваных драўляных паверхняў (4 гадзіны)

Асаблівасці падрыхтоўкі да афарбоўкі раней афарбаваных паверхняў. Спосабы выдалення старой фарбы. Асаблівасці афарбоўвання гладкіх і філянговых дзвярных палотнаў, дзвярэй са шклом, аконных рам.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры афарбоўванні раней афарбаваных драўляных паверхняў.

Практычныя работы. Падрыхтоўка фарбавальных саставаў да работы. Падрыхтоўка паверхняў да афарбоўвання. Афарбоўванне ручным інструментам. Догляд інструмента.

Аб'екты работы. Дзверы і дзвярныя вушакі, сталы, лаўкі і (або) іншыя.

Санітарна-тэхнічныя работы (4 гадзіны)

Віды, прызначэнне і магчымыя няспраўнасці санітарна-тэхнічнага абсталявання. Інструменты для выканання санітарна-тэхнічных работ: гаечны ключ, разводны ключ, адвёрткі: прызначэнне, віды, правілы бяспечных паводзін пры рабоце з імі.

Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры выкананні санітарна-тэхнічных работ. Назіранні за выкананнем санітарна-тэхнічных работ.

Практычныя работы. Аказанне дапамогі работнікам установы ў выкананні санітарна-тэхнічных работ.

Практычнае паўтарэнне (10 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

лакафарбавыя і дапаможныя матэрыялы для малярных работ;

інструменты для малярных работ;

патрабаванні да драўляных і металічных паверхняў, якія афарбоўваюцца, паслядоўнасць падрыхтоўкі іх да афарбоўвання і правілы афарбоўвання;

віды, прызначэнне і магчымыя няспраўнасці санітарна-тэхнічнага абсталявання;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

рыхтаваць да работы фарбавальныя саставы;

падрыхтоўваць драўляныя і металічныя паверхні да афарбоўвання;

выконваць простую і палепшаную афарбоўку драўляных паверхняў, афарбоўку металічнай паверхні, афарбоўку раней афарбаваных драўляных паверхняў;

удзельнічаць у выкананні санітарна-тэхнічных работ.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па рамонтных работах у быце і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў зменenай практычнай сітуацыі, якая патрабуе выканання работ па афарбоўванні драўляных і металічных паверхняў; удзельнічаць у іх планаванні.

## IX КЛАС (46 гадзін)

### Афарбоўванне ўнутраных атынкаваных паверхняў памяшканняў (16 гадзін)

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках па вывучэнні малярных работ.

Агульныя звесткі аб выкарыстаных фарбавальных саставах. Сувязныя для водных фарбавальных саставаў. Пігменты і напаўняльнікі. Рэцэпты прыгатавання асобных водных фарбавальных саставаў. Тэхналагічныя аперацыі падрыхтоўкі паверхняў да афарбоўкі воднымі саставамі (у залежнасці ад віду рэальна афарбаванай паверхні, фарбавальнага саставу і катэгорыі афарбоўкі). Тэхналогія афарбоўвання столі, сцен.

Тэхналагічныя аперацыі падрыхтоўкі атынкаванай паверхні да афарбоўвання няводнымі саставамі, іх падабенства з падрыхтоўкай гэтых паверхняў пад водныя афарбоўкі.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры падрыхтоўцы фарбавальных саставаў і рабоце з імі.

Практыкаванні ў падрыхтоўцы водных фарбавальных саставаў.

Практычныя работы. Падрыхтоўка ўнутраных атынкаваных паверхняў да афарбоўвання. Афарбоўванне ўнутраных атынкаваных паверхняў воднымі саставамі.

Аб’екты работы. Сцены.

### Афарбоўванне драўляных падлог і плінтусаў (6 гадзін)

Тэхналагічныя аперацыі падрыхтоўкі да афарбоўвання новай драўлянай падлогі. Тэхналагічныя аперацыі падрыхтоўкі да афарбоўвання

раней афарбаванай падлогі. Паслядоўнасць афарбоўвання падлогі. Тэрміны высыхання паверхні падлогі пасля кожнага афарбоўвання. Фарбавальныя саставы для афарбоўвання падлогі.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры афарбоўванні падлогі.

Практычныя работы. Падрыхтоўка фарбавальных саставаў да работы. Падрыхтоўка драўлянай падлогі да афарбоўвання. Афарбоўка драўлянай падлогі пэндзлем, валікам.

Аб’ект работы. Драўляная падлога.

Рамонт раней афарбаваных паверхняў (16 гадзін)

Найбольш распаўсюджаныя дэфекты афарбаваных паверхняў, прычыны іх з’яўлення і тэхналогія ліквідацыі. Магчымасці афарбоўвання воднымі саставамі паверхняў, раней афарбаваных алейнымі фарбамі.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры рамонце раней афарбаваных паверхняў.

Практычныя работы. Падрыхтоўка фарбавальных саставаў да работы. Падрыхтоўка раней афарбаваных паверхняў пад новую афарбоўку. Афарбоўванне падрыхтаваных паверхняў воднымі саставамі.

Аб’екты работы. Сцены, вокны, дзверы, падлога і (або) іншыя.

Практычнае паўтарэнне (8 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

тэхналагічныя аперацыі падрыхтоўкі да афарбоўвання ўнутраных атынкаваных паверхняў і тэхналогію афарбоўвання іх воднымі фарбавальнымі саставамі;

тэхналагічныя аперацыі падрыхтоўкі да афарбоўвання драўлянай падлогі; паслядоўнасць афарбоўвання падлогі;

найболей распаўсюджаныя дэфекты афарбаваных паверхняў, прычыны іх з’яўлення і тэхналогіі ліквідацыі;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

падрыхтоўваць унутраныя атынкаваныя паверхні да афарбоўвання воднымі і няводнымі саставамі;

выконваць афарбоўку ўнутраных атынкаваных паверхняў воднымі саставамі;

выконваць падрыхтоўку да афарбоўвання і афарбоўванне драўлянай падлогі, рамонт раней афарбаваных паверхняў.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па рамонтных работах у быце і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў зменлівай практычнай сітуацыі, якая патрабуе выканання работ па афарбоўванні ўнутраных атынкаваных паверхняў, па афарбоўванні драўлянай падлогі, па рамонце паверхняў, афарбаваных воднымі і няводнымі саставамі; удзельнічаць у іх планаванні.

## X КЛАС (46 гадзін)

### Шпалерныя работы (агульныя звесткі) (4 гадзіны)

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін пры вывучэнні работ маляра (шпалерных і малярных).

Прызначэнне шпалерных работ. Тыпы і віды шпалер. Шпалеры для абклейвання сцен і столяў жылых і грамадскіх будынкаў. Бардзюры і фрызы. Клеі для шпалерных работ. Інструменты і прыстасаванні для шпалерных работ: рулетка, нажніцы, нож, металічная лінейка, вугольнік, адвес, валік прыціскной для шпалер, шпаталь для шпалер.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні шпалерных работ.

### Падрыхтоўчыя шпалерныя работы (4 гадзіны)

Тэхналогія прыгатавання клею. Патрабаванні да паверхняў. Тэхналагічныя аперацыі падрыхтоўкі новых і раней абклееных паверхняў. Тэхналогія падрыхтоўкі шпалер да наклейвання. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні падрыхтоўчых шпалерных работ.

Практычныя работы. Вызначэнне плошчы паверхні, якая падлягае абклейванню. Разлік колькасці шпалер, неабходных для работы. Прыгатаванне клею. Падрыхтоўка паверхні сцен пад абклейванне шпалерамі. Падрыхтоўка шпалер да наклейвання.

### Абклейванне сцен шпалерамі. Рамонт паверхняў, абклееных шпалерамі (8 гадзін)

Правілы намазвання шпалер клеем. Арганізацыя вучэбнага месца і работы пры абклейванні сцен шпалерамі. Паслядоўнасць абклейвання сцен. Патрабаванні да якасці шпалерных работ. Дэфекты пры шпалерных работах, прычыны з’яўлення іх і спосабы ліквідацыі. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні шпалерных работ.

Практычныя работы. Нанясенне клею на шпалеры. Наклейванне шпалер. Рамонт паверхняў, абклееных шпалерамі.

Аб’екты работы. Сцены.

### Асаблівасці вытворчасці тынкавальных і малярных работ у зімовы час (12 гадзін)

Патрабаванні да тэмпературнага рэжыму ў памяшканнях. Праветрыванне памяшканняў. Назіранні за вільготнасцю паверхняў. Падрыхтоўка тынкавальных раствораў і малярных саставаў для работы ў зімовых умовах.

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні, арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні тынкавальных і малярных работ у зімовы час.

Практычныя работы. Падрыхтоўка тынкавальных раствораў для работы ў зімовых умовах. Выкананне тынкавальных работ у памяшканнях, якія не ацяпляюцца. Выкананне малярных работ з улікам зімовых умоў.

Аб’екты работы. Сцены, падлога, вокны, дзверы.

### Афарбоўванне воднымі саставамі з прымяненнем фарбапульта (6 гадзін)

Віды фарбапультаў: ручны помпавы, пнеўматычны, электрычны. Будова помпавага ручнога фарбапульта і прынцып яго дзеяння. Водныя саставы, якія наносяцца праз фарбапульт. Правілы работы помпавым ручным фарбапультам.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры рабоце помпавым ручным фарбапультам.

Практычныя работы. Падрыхтоўка помпавага ручнога фарбапульта да работы. Падрыхтоўка да работы воднага фарбавальнага саставу. Запраўка фарбапульта. Выкананне афарбоўкі паверхні помпавым ручным фарбапультам. Прамыванне рэзервуара, прапампоўка праз вудачку і фарсунку ачышчальнага раствору.

Аб’екты работы. Сцены і столі.

### Планаванне рамонтных работ (4 гадзіны)

Практычныя работы. Агляд школьных памяшканняў, выяўленне дэфектаў тынкоўкі, афарбаваных паверхняў, шпалер. Складанне плана рамонту. Разлік кошту неабходных для работы матэрыялаў.

### Практычнае паўтарэнне (8 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

прызначэнне шпалерных работ; тыпы і віды шпалер, бардзюры і фрызы; клеі для шпалерных работ;

інструменты і прыстасаванні для шпалерных работ;

тэхналагічныя аперацыі падрыхтоўкі новых і раней абклееных паверхняў для абклейвання шпалерамі;

правілы намазвання шпалер клеем; паслядоўнасць абклейвання сцен шпалерамі;

дэфекты пры шпалерных работах, прычыны з’яўлення іх і спосабы ліквідацыі;

асаблівасці вытворчасці тынкавальных і малярных работ у зімовы час;

будову і правілы работы помпавым ручным фарбапультам;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць шпалерныя работы;

падрыхтоўваць тынкавальныя растворы для работы ў зімовых умовах;

выконваць тынкавальныя і малярныя работы з улікам зімовых умоў;

выконваць афарбоўку паверхні помпавым ручным фарбапультам.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па рамонтных работах у быце і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў зменenай практычнай сітуацыі, якая патрабуе выканання шпалерных работ, тынкавальных і малярных работ у зімовы час, афарбоўвання воднымі саставамі з прымяненнем фарбапульта; удзельнічаць у іх планаванні.

## РАСЛІНАВОДСТВА І ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ

## АГАРОДНІЦТВА. ПАЛЯВОДСТВА

### VI КЛАС

(35 гадзін, у тым ліку 12 гадзін на практычнае паўтарэнне)

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках па агародніцтве і паляводстве.

Інвентар, які выкарыстоўваецца для выканання практычных работ на занятках па агародніцтве і паляводстве, яго захоўванне, правілы бяспечных паводзін пры рабоце з інвентаром.

Паняцце «агародніння культуры». Асноўныя групы агародніны. Значэнне агародніны ў харчаванні чалавека. Тэрміны ўборкі агароднінных

культур. Інвентар для ўборкі агароднінных культур. Патрабаванні да якасці і правілы ўборкі агароднінных культур. Пасляўраджайная ўборка агарода: мэта, тэрміны і спосабы выканання.

Спосабы захоўвання ўраджаю агародніны. Будова бурта. Будова сховішча для агародніны, склепа, падпамосця. Падрыхтоўка памяшканняў да захоўвання ўраджаю.

Паняцце глебы. Неабходнасць восеньскай апрацоўкі глебы. Правілы перакопвання глебы рыдлёўкай, патрабаванні да перакопвання.

Паняцце ўгнаенняў. Паняцце мінеральных і арганічных угнаенняў.

Караняплоды. Сталовыя караняплоды, іх віды, значэнне ў харчаванні чалавека. Кармавыя караняплоды, іх віды. Падрыхтоўка і ўгнаенне глебы пад караняплоды. Тэрміны і спосабы сяўбы караняплодаў. Віды работ па доглядзе пасеваў караняплодаў. Хваробы і шкоднікі караняплодаў. Меры барацьбы са шкоднікамі і хваробамі караняплодаў.

Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры ўборцы, падрыхтоўцы да захоўвання і закладкі на захоўванне ўраджаю, сяўбе і доглядзе пасеваў агароднінных культур адкрытага грунту.

Практыкаванні ў адрозніванні мінеральных і арганічных угнаенняў.

Практычныя работы. Уборка ўраджаю агароднінных культур уручную, пасляўборачная ачыстка агарода. Падрыхтоўка бурта. Падрыхтоўка памяшканняў да захоўвання агародніны. Закладка агародніны на захоўванне.

Падрыхтоўка глебы і градак пад караняплоды. Сяўба караняплодаў. Догляд пасеваў караняплодаў. Уборка радыскі. Дапамога дарослым і больш старэйшым школьнікам у вырошчванні агароднінных культур.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках па агародніцтве і паляводстве;

асноўныя агароднінныя культуры, іх значэнне ў харчаванні чалавека;

інвентар, які выкарыстоўваецца для выканання практычных работ на занятках па агародніцтве і паляводстве;

тэрміны і правілы ўборкі ўраджаю агароднінных культур уручную, спосабы яго захоўвання;

работы па вырошчванні караняплодаў у адкрытым грунце;

хваробы і шкоднікі караняплодаў, меры барацьбы з імі;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

збіраць ураджай агароднінных культур уручную; закладваць ураджай агародніны на захоўванне; выконваць падрыхтоўку глебы і градак пад караняплоды, сяўбу караняплодаў, догляд пасеваў караняплодаў.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін на вучэбных занятках па агародніцтве і паляводстве і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў змененай практычнай сітуацыі пры выкананні заданняў па ўборцы ўраджаю агароднінных культур, сяўбе караняплодаў і доглядзе пасеваў; удзельнічаць у планаванні работы па іх выкананні.

## VII КЛАС

(35 гадзін, у тым ліку 12 гадзін на практычнае паўтарэнне)

Тэрміны ўборкі сталовых і кармавых караняплодаў. Спосабы і правілы ўборкі караняплодаў, патрабаванні да якасці ўборкі. Падрыхтоўка караняплодаў да захоўвання. Умовы працяглага захоўвання караняплодаў.

Арганічныя ўгнаенні: кампост, гной. Складовыя часткі кампосту, правілы яго прыгатавання.

Яравы і зімовы часнок. Значэнне часнаку ў харчаванні чалавека. Тэрміны пасадкі часнаку. Патрабаванні да падрыхтоўкі глебы пад пасадку часнаку. Спосабы і правілы пасадкі часнаку.

Зяленіўныя агароднінныя культуры, іх значэнне ў харчаванні чалавека. Насенне зяленіўных агароднінных культур, падрыхтоўка іх да сяўбы. Умовы вырошчвання зяленіўных агароднінных культур у памяшканні. Асаблівасці падрыхтоўкі глебы для вырошчвання зяленіўных агароднінных культур у памяшканні (у «агародзе на падаконніку»).

Паняцце абароненага грунту. Агульныя звесткі пра будову парніка. Агульныя звесткі аб будове цяпліцы.

Пладовая агародніна (тамат, агурок, перац), іх значэнне ў харчаванні чалавека. Сарты тамата, агурка, перцу.

Расадны спосаб вырошчвання агароднінных культур. Агароднінныя культуры, якія вырошчваюцца расадным спосабам. Састаў земляных сумесей, умовы вырошчвання расады перцу, агурка, тамата. Тэрміны сяўбы насення перцу, агурка, тамата пры вырошчванні расады. Догляд пасеваў і ўсходаў. Прыметы гатоўнасці раслін да пікіроўкі. Правілы пікіроўкі. Асаблівасці догляду раслін пасля пікіроўкі. Паслядоўнасць і правілы пасадкі расады перцу, агурка, тамата ў абаронены і адкрыты грунт. Віды работ па доглядзе пасадак перцу, агурка, тамата.

Падрыхтоўка насення зяленіўных агароднінных культур да сяўбы ў адкрыты грунт. Падрыхтоўка і ўгнаенне глебы пад сяўбу насення зяленіўных агароднінных культур. Тэрміны і спосабы сяўбы насення

зяленіўных агароднінных культур у адкрыты грунт. Віды работ па доглядзе пасеваў зяленіўных агароднінных культур.

Віды цыбулі. Умовы захоўвання цыбулі-сеянкі, падрыхтоўка яе да пасадкі. Умовы атрымання высокага ўраджаю цыбулі. Падрыхтоўка і ўгнаенне глебы пад цыбулю. Тэрміны і спосабы пасадкі і сяўбы цыбулі. Віды работ па доглядзе пасадак і пасеваў цыбулі. Хваробы і шкоднікі цыбулі. Меры барацьбы з хваробамі і шкоднікамі цыбулі.

Падрыхтоўка насення агурка да сяўбы ў адкрыты грунт. Падрыхтоўка і ўгнаенне глебы пад сяўбу насення агурка. Тэрміны і спосабы сяўбы насення агурка ў адкрыты грунт. Віды работ па доглядзе пасеваў агурка.

Хваробы і шкоднікі зяленіўных агароднінных культур, меры барацьбы з імі. Хваробы і шкоднікі пладовых агароднінных культур, меры барацьбы з імі.

Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры ўборцы, падрыхтоўцы да захоўвання і закладкі на захоўванне ўраджаю, сяўбе і доглядзе пасеваў агароднінных культур адкрытага і абароненага грунту.

Практычныя работы. Уборка ўраджаю караняплодаў. Абразанне бацвіння. Укладванне караняплодаў у кучу. Сарціроўка караняплодаў. Закладка караняплодаў на захоўванне.

Прыгатаванне кампосту. Удзел ва ўнясенні арганічных угнаенняў.

Удзел у работах па падрыхтоўцы парнікоў і цяпліц да зімы, у падрыхтоўцы глебы для парнікоў і цяпліц. Вырошчванне зяленіўных агароднінных культур у памяшканні ў зімовых умовах.

Нарыхтоўка земляных сумесей, падрыхтоўка пасяўных скрынь. Запаўненне пасяўных скрынь земляной сумессю. Падрыхтоўка і сяўба насення пладовых агароднінных культур пры вырошчванні расады. Размяшчэнне пасяўных скрынь. Догляд пасеваў і ўсходаў. Пікіроўка. Догляд раслін пасля пікіроўкі. Падрыхтоўка глебы пад пасадку расады. Пасадка расады ў абаронены і адкрыты грунт. Догляд пасадак.

Падрыхтоўка насення зяленіўных агароднінных культур да сяўбы. Падрыхтоўка глебы і градак для вырошчвання зяленіўных агароднінных культур. Сяўба насення, догляд пасеваў, збор ураджаю зяленіўных культур.

Падрыхтоўка насення агурка да сяўбы ў адкрыты грунт. Падрыхтоўка глебы і градак да сяўбы насення агурка. Сяўба насення агурка ў адкрыты грунт, догляд пасеваў.

Падрыхтоўка глебы і градак пад пасадку часнаку. Падзімняя пасадка часнаку. Пасадка яравога часнаку.

Падрыхтоўка (замочванне) цыбулі-сеянкі. Падрыхтоўка глебы і градак для пасадкі і сяўбы цыбулі. Пасадка і сяўба цыбулі, догляд пасадак і пасеваў.

Дапамога дарослым і больш старэйшым школьнікам у вырошчванні іншых агароднінных культур.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

тэрміны, спосабы і правілы ўборкі караняплодаў;

патрабаванні падрыхтоўкі караняплодаў да захоўвання і ўмовы іх захоўвання;

арганічныя ўгнаенні (кампост, гной);

агульную канструкцыю збудаванняў абароненага грунту (парніка, цяпліцы);

значэнне часнаку, цыбулі, зяленіўнай і пладовай агародніны ў харчаванні чалавека;

работы па вырошчванні часнаку, цыбулі, зяленіўных і пладовых агароднінных культур; хваробы і шкоднікаў часнаку, цыбулі, зяленіўных і пладовых агароднінных культур, меры барацьбы з імі;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

збіраць ураджай караняплодаў уручную; закладваць ураджай караняплодаў на захоўванне; падрыхтоўваць кампост; вырошчваць часнок, цыбулю, зяленіўныя і пладовыя агароднінныя культуры.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па агародніцтве і паляводстве і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў змененай практычнай сітуацыі пры выкананні заданняў па ўборцы ўраджаю караняплодаў уручную, вырошчванні часнаку, цыбулі, зяленіўных і пладовых агароднінных культур; удзельнічаць у планаванні работы па іх выкананні.

## VIII КЛАС

(35 гадзін, у тым ліку 12 гадзін на практычнае паўтарэнне)

Паняцце ўраджайнасці.

Бульба. Значэнне бульбы як харчовай і кармавой культуры. Сарты бульбы. Хваробы і шкоднікі бульбы. Меры барацьбы з хваробамі і шкоднікамі бульбы. Падрыхтоўка і ўгнаенне глебы пад бульбу. Тэрміны і спосабы пасадкі бульбы. Умовы атрымання высокага ўраджаю бульбы. Адрозненні здаровых і хворых клубняў. Віды работ па доглядзе пасадак бульбы.

Капуста. Выкарыстанне капусты ў харчаванні чалавека. Сарты капусты. Тэхналогія вырошчвання расады капусты. Тэрміны і спосабы высадкі расады капусты. Падрыхтоўка і ўгнаенне глебы пад высадку расады капусты. Умовы атрымання высокага ўраджаю капусты. Віды работ па доглядзе пасадак капусты. Хваробы і шкоднікі капусты, меры барацьбы з імі.

Мінеральныя ўгнаенні: віды, фізічныя ўласцівасці, правілы абыходжання, захоўвання і ўнясення ў глебу.

Паняцце «палявыя культуры». Зернебабовыя культуры: гарох, фасоля, соя; харчовыя і кармавыя зернебабовыя.

Асноўныя збожжавыя культуры. Значэнне збожжавых культур як харчовых і кармавых.

Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры ўборцы, падрыхтоўцы да захоўвання і закладкі на захоўванне ўраджаю, сяўбе і доглядзе пасеваў агароднінных культур адкрытага і абароненага грунту.

Назіранні за стадыямі росту збожжавых падчас экскурсій.

Практычныя работы. Уборка таматаў познаспелых сартоў. Уборка агуркоў-насеннікаў. Размяшчэнне насенных пладоў тамата і агуркоў-насеннікаў у памяшканні. Выманне, прамыванне, прасушка і захоўванне насення тамата і агурка.

Пераборка бульбы і адбор насеннага матэрыялу. Пасадка бульбы пад рыдлёўку. Догляд пасадак бульбы.

Вырошчванне расады капусты. Падрыхтоўка глебы для высадкі расады капусты. Пікіроўка расады капусты. Высаджванне расады капусты ў адкрыты грунт, догляд пасадак.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

паняцце ўраджайнасці;

сарты бульбы і капусты, іх значэнне ў харчаванні чалавека;

работы па вырошчванні бульбы, капусты;

хваробы і шкоднікаў бульбы, капусты; меры барацьбы з імі;

мінеральныя ўгнаенні: віды, фізічныя ўласцівасці, правілы абыходжання, захоўвання і ўнясення ў глебу;

зернебабовыя і збожжавыя культуры, іх значэнне як харчовых і кармавых;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

збіраць ураджай таматаў познаспелых сартоў, агуркоў-насеннікаў; перабіраць бульбу; вырошчваць бульбу і капусту.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін на вучэбных занятках па агародніцтве і паляводстве і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў зменай практычнай сітуацыі пры выкананні заданняў па ўборцы ўраджаю таматаў познаспелых сартоў, агуркоў-насеннікаў, вырошчванні бульбы і капусты; удзельнічаць у планаванні работы па іх выкананні.

## IX КЛАС

(35 гадзін, у тым ліку 12 гадзін на практычнае паўтарэнне)

Тэрміны ўборкі бульбы. Падрыхтоўчыя работы перад уборкай бульбы. Спосабы ўборкі бульбы (выкопванне рыдлёўкай, плугам, бульбакапалкай, камбайнам). Правілы выкопвання клубняў бульбы ўручную. Прызначэнне прасушкі і сарціроўкі бульбы. Умовы працяглага захоўвання бульбы.

Тэрміны ўборкі капусты розных сартоў. Спосабы ўборкі капусты. Умовы працяглага захоўвання качаноў капусты.

Уяўленне аб насенняводстве. Агульныя звесткі аб атрыманні насення караняплодаў, пладовых і зяленіўных агароднінных культур, капусты, цыбулі. Насенныя плады тамата, агуркі-насеннікі.

Калекцыйны ўчастак, яго прызначэнне і арганізацыя.

Гарбуз, кабачок, патысон. Выкарыстанне гарбуза, кабачка, патысона ў харчаванні чалавека. Сарты гарбуза, кабачка, патысона. Падрыхтоўка і ўгнаенне глебы пад сяўбу насення гарбуза, кабачка, патысона. Тэрміны сяўбы насення гарбуза, кабачка, патысона. Умовы атрымання высокага ўраджаю гарбуза, кабачка, патысона. Віды работ па доглядзе раслін пры вырошчванні гарбуза, кабачка, патысона. Хваробы і шкоднікі гарбуза, кабачка, патысона, меры барацьбы з імі.

Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры ўборцы, падрыхтоўцы да захоўвання і закладкі на захоўванне ўраджаю, сяўбе і доглядзе пасеваў агароднінных культур, работах на калекцыйным участку.

Практычныя работы. Уборка ўраджаю бульбы, прасушка, сарціроўка, адбор насеннай бульбы, затарванне клубняў бульбы, закладка на захоўванне. Уборка капусты, выдаленне з качаноў верхняга лісця, сарціроўка качаноў, закладка качаноў капусты на захоўванне.

Вызначэнне ўраджайнасці.

Падрыхтоўка глебы для вырошчвання гарбуза, кабачка, патысона. Сяўба насення гарбуза, кабачка, патысона. Догляд раслін пры вырошчванні гарбуза, кабачка, патысона.

Работы на калекцыйным участку.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

тэрміны і тэхналогію ўборкі бульбы, капусты;

умовы працяглага захоўвання бульбы, капусты;

прызначэнне і арганізацыю калекцыйнага ўчастка;

аб выкарыстанні ў харчаванні чалавека гарбуза, кабачка, патысона;

сарты гарбуза, кабачка, патысона, работы па іх вырошчванні;

хваробы і шкоднікаў гарбуза, кабачка, патысона; меры барацьбы з імі;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

збіраць ураджай бульбы, капусты; падрыхтоўваць бульбу, капусту да захоўвання і закладваць іх на захоўванне; вырошчваць гарбуз, кабачок, патысон.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па агародніцтве і паляводстве і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў зменenай практычнай сітуацыі пры выкананні заданняў па ўборцы ўраджаю бульбы, капусты; падрыхтоўцы бульбы, капусты да захоўвання і закладцы іх на захоўванне; вырошчванні гарбуза, кабачка, патысона; удзельнічаць у планаванні работы па іх выкананні.

## X КЛАС

(35 гадзін, у тым ліку 12 гадзін на практычнае паўтарэнне)

Тэрміны і спосабы ўборкі гарбуза, кабачка, патысона. Умовы працяглага захоўвання гарбуза, кабачка, патысона.

Прысядзібны ўчастак. План прысядзібнага ўчастка. Месца размяшчэння на прысядзібным участку агароднінных культур.

Паняцце севазвароту. Улік культур-папярэднікаў пры размяшчэнні агароднінных культур. Ушчыльненыя і змешаныя пасевы. Улік узаемаўплыву агароднінных культур пры іх размяшчэнні.

Каляндар агародніка.

Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры ўборцы, падрыхтоўцы да захоўвання і закладкі на захоўванне ўраджаю, сяўбе і доглядзе пасеваў агароднінных культур.

Практычныя работы. Уборка ўраджаю гарбуза, кабачка, патысона, закладка іх на захоўванне.

Складанне плана і разметка месцаў размяшчэння агароднінных культур.

Складанне календара агародніка.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

тэрміны і спосабы ўборкі гарбуза, кабачка, патысона;

умовы працяглага захоўвання гарбуза, кабачка, патысона;

асаблівасці размяшчэння агароднінных культур на прысядзібным участку;

паняцце севазвароту;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

збіраць ураджай гарбуза, кабачка, патысона; падрыхтоўваць гарбуз, кабачок, патысон да захоўвання і закладваць іх на захоўванне; складаць план і выконваць разметку месцаў размяшчэння агароднінных культур на прысядзібным участку.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па агародніцтве і паляводстве і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў зменenай практычнай сітуацыі пры выкананні заданняў па ўборцы ўраджаю гарбуза, кабачка, патысона; падрыхтоўцы гарбуза, кабачка, патысона да захоўвання і закладцы іх на захоўванне; складанні плана і выкананні разметкі месцаў размяшчэння агароднінных культур на прысядзібным участку; удзельнічаць у планаванні работы па іх выкананні.

## КВЕТКАВОДСТВА І АЗЕЛЯНЕННЕ

### VI КЛАС

(35 гадзін, у тым ліку 12 гадзін на практычнае паўтарэнне)

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках па кветкаводстве і

азеляненні. Інвентар, які выкарыстоўваецца для выканання практычных работ на занятках па кветкаводстве і азеляненні, яго захоўванне, правілы бяспечных паводзін пры рабоце з інвентаром.

Разнастайнасць кветкавых раслін. Падабенства і адрозненне культурных і дзікарослых кветкавых раслін. Кветкавыя расліны, найбольш распаўсюджаныя ў сваёй мясцовасці. Аднагадовыя, двухгадовыя і шматгадовыя кветкавыя расліны. Умовы вырошчвання кветкавых раслін (хатнія ўмовы, збудаванні абароненага грунту, кветнік).

Віды работ у кветніку (па сезонах). Прыметы паспявання, тэрміны паспявання і збору насення аднагадовых кветкавых раслін (аксаміткі, наготкі і іншыя). Асноўныя звесткі аб зборы, падрыхтоўцы да захоўвання і захоўванні насення. Неабходнасць і спосабы ачысткі кветніка.

Паняцце глебы. Прызначэнне ўскопвання глебы. Правілы бяспечных паводзін пры рабоце з рыдлёўкай. Правілы ўскопвання глебы рыдлёўкай. Выбар месца і правілы сяўбы насення аднагадовых кветкавых раслін, правілы догляду раслін.

Грунты для хатніх раслін. Правілы догляду хатніх раслін: размяшчэння, паліву, выдалення пылу, падкормкі, рыхлення глебы ў вазонах, перасадкі.

Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры работах у кветніку і па доглядзе хатніх раслін.

Практычныя работы. Збор насення аднагадовых кветкавых раслін, падрыхтоўка іх да захоўвання і захоўванне. Уборка ў кветніку аднагадовых кветкавых раслін. Сяўба і вырошчванне ў кветніку аднагадовых кветкавых раслін. Догляд хатніх раслін.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках па кветкаводстве і азеляненні;

інвентар, які выкарыстоўваецца для выканання практычных работ на занятках па кветкаводстве і азеляненні;

кветкавыя расліны бліжэйшага асяроддзя; умовы вырошчвання кветкавых раслін (хатнія ўмовы, збудаванні абароненага грунту, кветнік);

віды работ у кветніку (па сезонах);

прыметы паспявання, тэрміны паспявання і збору насення аднагадовых кветкавых раслін (аксаміткі, наготкі і іншыя), асноўныя звесткі аб зборы, падрыхтоўцы да захоўвання і захоўванні іх насення;

аб неабходнасці ачысткі кветніка; спосабы ачысткі кветніка;

паняцце глебы; прызначэнне і правілы ўскопвання глебы рыдлёўкай;

правілы сяўбы насення аднагадовых кветкавых раслін, правілы догляду раслін;

грунты для хатніх раслін; правілы догляду хатніх раслін;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

збіраць насенне аднагадовых кветкавых раслін, падрыхтоўваць іх да захоўвання і захоўваць; выконваць уборку ў кветніку аднагадовых кветкавых раслін; выконваць сяўбу і вырошчванне аднагадовых кветкавых раслін; даглядаць хатнія расліны.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па кветкаводстве і азеляненні і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў работах па вырошчванні аднагадовых кветкавых раслін і доглядзе хатніх раслін у зменenай практычнай сітуацыі, удзельнічаць у іх планаванні.

## VII КЛАС

(35 гадзін, у тым ліку 12 гадзін на практычнае паўтарэнне)

Вегетатыўны спосаб размнажэння раслін. Віды кветкавых раслін, якія размнажаюцца вегетатыўна.

Шматгадовыя кветкавыя расліны. Зімуючыя і незімуючыя шматгадовыя кветкавыя расліны. Асаблівасці размнажэння зімуючых шматгадовых кветкавых раслін. Віды работ па доглядзе зімуючых шматгадовых кветкавых раслін (па сезонах).

Расадны спосаб вырошчвання раслін. Кветкавыя расліны, прыдатныя для вырошчвання расадным спосабам. Віды і паслядоўнасць работ пры вырошчванні кветкавых раслін расадным спосабам.

Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры вырошчванні зімуючых шматгадовых раслін і вырошчванні кветкавых раслін расадным спосабам.

Практычныя работы. Вырошчванне зімуючых шматгадовых кветкавых раслін: дзяленне і пасадка, восеньскі і вясенне-летні догляд. Вырошчванне кветкавых раслін расадным спосабам: падрыхтоўка посуду, глебы і інвентару, сяўба насення, догляд расады, высадка расады, догляд раслін.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

вегетатыўны спосаб размнажэння раслін, віды кветкавых раслін, якія размнажаюцца вегетатыўна;

віды шматгадовых кветкавых раслін, асаблівасці размнажэння зімуючых шматгадовых кветкавых раслін і віды работ па доглядзе іх (па сезонах);

расадны спосаб вырошчвання раслін;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

вырошчваць зімуючыя шматгадовыя кветкавыя расліны; вырошчваць кветкавыя расліны расадным спосабам.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па кветкаводстве і азеляненні і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў работах па вырошчванні шматгадовых зімуючых кветкавых раслін у змененай практычнай сітуацыі, удзельнічаць у іх планаванні.

## VIII КЛАС

(35 гадзін, у тым ліку 12 гадзін на практычнае паўтарэнне)

Садовыя дарожкі: віды, матэрыялы для пакрыцця; догляд; пашкоджанні і спосабы рамонту.

Шматгадовыя кветкавыя расліны, якія не зімуюць у адкрытым грунце. Віды работ па доглядзе незімуючых шматгадовых кветкавых раслін (па сезонах).

Двухгадовыя кветкавыя расліны, асаблівасці іх вырошчвання.

Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры выкананні догляду садовых дарожак, іх рамонце, вырошчванні шматгадовых і двухгадовых кветкавых раслін.

Практычныя работы. Догляд садовых дарожак і пляцовак. Рамонт садовых дарожак.

Выкопванне карэнішчаў (караняклубняў вяргінь, цыбулін гладыёлусаў), падрыхтоўка іх да зімовага захоўвання і захоўванне, падрыхтоўка да пасадкі, пасадка, догляд пасадак.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

будову і віды пашкоджанняў садовых дарожак;

шматгадовыя кветкавыя расліны, якія не зімуюць у адкрытым грунце, і віды работ па доглядзе іх (па сезонах);

двухгадовыя кветкавыя расліны, асаблівасці іх вырошчвання;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

даглядаць садовыя дарожкі і пляцоўкі; рамантаваць садовыя дарожкі; выкопваць карэнішчы шматгадовых кветкавых раслін, падрыхтоўваць іх да зімовага захоўвання і захоўваць, падрыхтоўваць да пасадкі, выконваць пасадку і догляд пасадак.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па кветкаводстве і азеляненні і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў работах па вырошчванні шматгадовых незімуючых кветкавых раслін у зменenай практычнай сітуацыі, удзельнічаць у іх планаванні.

## IX КЛАС

(35 гадзін, у тым ліку 12 гадзін на практычнае паўтарэнне)

Віды афармлення кветніка: клумбы, рабаткі. План кветніка.

Паняцце аб угнаеннях. Арганічныя і мінеральныя ўгнаенні.

Паняцце пра работы па азеляненні. Зялёныя насаджэнні: дэкаратыўна-ахоўныя насаджэнні, загараджальныя насаджэнні, зялёныя жывыя загарадзі.

Арганізацыя работ па азелянянні. Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ работ па азеляненні.

Практычныя работы. Складанне плана кветніка, разбіўка кветніка. Удзел у работах па азеляненні.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

віды афармлення і план кветніка;

арганічныя і мінеральныя ўгнаенні;

віды зялёных насаджэнняў;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

складаць план кветніка; разбіваць кветнік; удзельнічаць у работах па азеляненні.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па кветкаводстве і азеляненні і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў работах па азеляненні ў зменeнай практычнай сітуацыі, удзельнічаць у іх планаванні.

## Х КЛАС

(35 гадзін, у тым ліку 12 гадзін на практычнае паўтарэнне)

Дрэвы і кусты, якія выкарыстоўваюцца ў азеляненні: елка, рабіна, ядловец, абляпіха і іншыя.

Тэхналогія пасадкі дрэў і кустоў. Догляд дрэў і кустоў.

Паняцце газона. Віды газонаў. Час засявання газона травамі.

Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ па азеляненні.

Практычныя работы. Пасадка дрэў і кустоў. Удзел у работах па доглядзе дрэў і кустоў. Падрыхтоўка глебы пад газон. Сяўба насення траў і догляд газонаў. Чытанне і складанне плана азелянення ўчастка.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

дрэвы і кусты, якія часцей выкарыстоўваюцца для азелянення;

работы па пасадцы дрэў і кустоў і доглядзе іх;

віды газонаў, час засявання іх травамі;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць пасадку дрэў і кустоў; даглядаць дрэвы і кусты; падрыхтоўваць глебу пад газон; высейваць насенне траў; даглядаць газоны.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па кветкаводстве і азеляненні і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў работах па пасадцы дрэў і кустоў, доглядзе дрэў і кустоў, газонаў у зменeнай практычнай сітуацыі; удзельнічаць у іх планаванні.

## ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ

## IX КЛАС

(35 гадзін, у тым ліку 12 гадзін на практычнае паўтарэнне)

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках па жывёлагадоўлі. Інвентар, які выкарыстоўваецца для выканання практычных работ на занятках па жывёлагадоўлі, яго захоўванне, правілы бяспечных паводзін пры рабоце з інвентаром.

Сельскагаспадарчыя жывёлы. Жывёлагадоўля як галіна сельскай гаспадаркі. Вядучыя галіны жывёлагадоўлі рэгіёна, у якім знаходзіцца школа. Прадукцыя жывёлагадоўлі. Прафесіі работнікаў жывёлагадоўлі.

Жывёлагадоўчыя памяшканні ў асабістых дапаможных, фермерскіх, калектыўных і іншых гаспадарках. Асноўны інвентар для ручной уборкі жывёлагадоўчых памяшканняў.

Правілы вытворчай санітарыі, асабістая гігіена работнікаў жывёлагадоўчай фермы.

Птушкагадоўля: значэнне, асноўныя напрамкі. Віды птушак, якія вырошчваюцца ў асабістай дапаможнай, школьнай і іншых гаспадарках: куры, гусі, качкі, індычкі. Памяшканні для ўтрымання птушак. Абсталяванне птушніка. Асаблівасці ўтрымання птушак на падворку і ва ўмовах птушкафабрыкі, у зімовы і летні перыяды. Кармленне свойскай птушкі: віды кармоў, спосабы падрыхтоўкі да скармлівання, неабходная колькасць кармоў. Захоўванне яек.

Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ па нарыхтоўцы кармоў і ўтрыманні свойскай птушкі.

Перавагі ўтрымання авечак і коз у асабістай дапаможнай гаспадарцы. Харчовая каштоўнасць казінага малака. Асаблівасці ўтрымання авечак і коз у асабістай дапаможнай гаспадарцы. Кармы для авечак і коз, час іх нарыхтоўкі на зімовы перыяд, асаблівасці захоўвання.

Практычныя работы. Удзел у нарыхтоўцы кармоў для свойскай птушкі і падрыхтоўцы іх да скармлівання, замене вады ў паілках, раскладванні кармоў у кармушкі для птушак, ва ўладкаванні і ўборцы птушніка, у змене падсцілак, чыстцы паілак і кармушак для птушак.

Экскурсіі на жывёлагадоўчую ферму, птушкафабрыку.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках па жывёлагадоўлі;

вядучыя галіны жывёлагадоўлі, віды прадукцыі жывёлагадоўлі і прафесіі работнікаў жывёлагадоўлі свайго рэгіёна;

жывёлагадоўчыя памяшканні ў асабістых дапаможных, фермерскіх, калектыўных і іншых гаспадарках;

асноўны інвентар для ручной уборкі жывёлагадоўчых памяшканняў;

значэнне і асноўныя напрамкі птушкагадоўлі, віды птушак, якія вырошчваюцца ў асабістай дапаможнай, школьнай і іншых гаспадарках; абсталяванне птушніка; умовы захоўвання яек;

асаблівасці ўтрымання і кармлення птушак на падворку і ва ўмовах птушкафабрыкі;

харчовую каштоўнасць казінага малака; асаблівасці ўтрымання і кармлення авечак і коз у асабістай дапаможнай гаспадарцы;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

удзельнічаць у нарыхтоўцы кармоў для свойскай птушкі і падрыхтоўцы іх да скормлівання, замене вады ў паілках, кармленні свойскай птушкі;

удзельнічаць у выкананні работ па ўладкаванні і ўборцы птушніка.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па жывёлагадоўлі і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў работах па нарыхтоўцы кармоў для свойскай птушкі і падрыхтоўцы іх да скормлівання, замене вады ў паілках, кармленні свойскай птушкі, ва ўладкаванні і ўборцы птушніка ў змененай практычнай сітуацыі; удзельнічаць у іх планаванні.

## X КЛАС

(35 гадзін, у тым ліку 12 гадзін на практычнае паўтарэнне)

Свінагадоўля як галіна жывёлагадоўлі. Свінаферма: памяшканні для ўтрымання свіней, дапаможныя памяшканні, тэрыторыя, памяшканні для розных груп свіней і іх абсталяванне. Уборка памяшканняў для ўтрымання свіней: патрабаванні, паслядоўнасць, інвентар.

Развядзенне буйной рагатай жывёлы як галіна жывёлагадоўлі. Будова і абсталяванне кароўніка. Будова і абсталяванне цялятніка. Уборка кароўніка, цялятніка: патрабаванні, паслядоўнасць, інвентар.

Распарадак дня на ферме. Віды работ па доглядзе свіней, цялят і маладняку буйной рагатай жывёлы, кароў.

Механізацыя работ у жывёлагадоўлі: сродкі механізацыі, іх прызначэнне, правілы бяспечных паводзін пры выкарыстанні сродкаў механізацыі.

Паняцці кармавой адзінкі, нормы і рацыёну кармлення жывёл. Пажыўнасць розных відаў кармоў. Кармы для свіней, цялят, маладняку буйной рагатай жывёлы, кароў.

Змяненне паводзін жывёл пры захворваннях.

Здача і кантроль якасці прадукцыі жывёлагадоўлі.

Правілы вытворчай санітарыі, асабістая гігіена работнікаў жывёлагадоўчай фермы.

Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ у жывёлагадоўчых памяшканнях і на тэрыторыі жывёлагадоўчай фермы.

Назіранні за даеннем кароў.

Экскурсіі на жывёлагадоўчыя фермы, назіранні за прымяненнем машын і механізмаў.

Практычныя работы. Удзел у складанні рацыёнаў кармлення свіней (цялят, кароў або іншых жывёл), падрыхтоўцы кармоў у адпаведнасці са складзеным рацыёнам з выкананнем узважвання корму, у чыстцы кармушак і станкоў (пры адсутнасці ў іх жывёл) на школьнай свінаферме (у кароўніку, цялятніку), падрыхтоўцы і раздачы кармоў; уборка тэрыторыі школьнай свінафермы (кароўніка, цялятніка) ад снегу.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

агульныя звесткі аб свінагадоўлі і развядзенні буйной рагатай жывёлы;

віды работ па доглядзе свіней, цялят і маладняку буйной рагатай жывёлы, кароў;

кармы для свіней, цялят, маладняку буйной рагатай жывёлы, кароў; нормы і рацыён кармлення жывёл, пажыўную каштоўнасць розных відаў кармоў;

патрабаванні да ўборкі школьнай свінафермы і яе тэрыторыі, кароўніка, цялятніка, яе паслядоўнасць; уборачны інвентар;

сродкі механізацыі работ у жывёлагадоўлі, іх прызначэнне;

прыметы захворванняў жывёл;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

удзельнічаць у складанні рацыёнаў, прыгатаванні і раздачы кармоў, чыстцы кармушак і станкоў (пры адсутнасці ў іх жывёл) на школьнай свінаферме (у кароўніку, цялятніку), прыбіраць тэрыторыю школьнай свінафермы (кароўніка, цялятніка) ад снегу.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па жывёлагадоўлі і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

менне арыентавацца ў работах па складанні рацыёнаў, прыгатаванні і раздачы кармоў, чыстцы кармушак і станкоў (пры адсутнасці ў іх жывёл) на школьнай свінаферме (у кароўніку, цялятніку), уборцы тэрыторыі школьнай свінафермы (кароўніка, цялятніка) ад снегу ў зменнай практычнай сітуацыі; удзельнічаць у іх планаванні.

## ПЛАДАВОДСТВА

### VI КЛАС

(35 гадзін, у тым ліку 12 гадзін на практычнае паўтарэнне)

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках па пладаводстве. Інвентар, які выкарыстоўваецца для выканання практычных работ на занятках па пладаводстве, яго захоўванне, правілы бяспечных паводзін пры рабоце з інвентаром.

Пладова-ягадныя культуры, іх выкарыстанне ў харчаванні чалавека.

Пладаводства як галіна раслінаводства: напрамкі, развіццё ў рэгіёне, дзе знаходзіцца установа адукацыі. Асноўныя пладовыя дрэвы ў Рэспубліцы Беларусь: яблыня, груша, вішня, сліва, іх сарты.

Тэрміны ўборкі ўраджаю, прыметы спеласці пладоў. Арганізацыя і тэхніка ручной уборкі пладоў. Сарціроўка, каліброўка і ўпакоўка пладоў.

Прызначэнне і правілы ўскопвання прыствольных кругоў.

Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры ўборцы ўраджаю пладоў.

Назіранні за сезоннымі работамі па вырошчванні пладовых культур.

Практычная работа. Уборка ўраджаю.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках па пладаводстве;

інвентар, які выкарыстоўваецца для выканання практычных работ на занятках па пладаводстве;

пладова-ягадныя культуры, іх выкарыстанне ў харчаванні чалавека;

агульныя звесткі аб пладаводстве як галіне раслінаводства;

сарты яблыні, грушы, вішні, слівы;

прыметы спеласці пладоў, тэрміны і асаблівасці ўборкі пладоў;

прызначэнне і правілы ўскопвання прыствольных кругоў;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

прымаць удзел ва ўборцы ўраджаю пладоў.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па пладаводстве і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў работах па ўборцы ўраджаю пладовых культур у зменегай практычнай сітуацыі і ўдзельнічаць у іх планаванні.

## VII КЛАС

(35 гадзін, у тым ліку 12 гадзін на практычнае паўтарэнне)

Ягадныя культуры (ягаднікі): суніцы, парэчкі, агрэст, маліны, іх віды і сарты. Віды восеньскіх работ па доглядзе ягадных кустоў. Віды вясновых работ па доглядзе ягадных кустоў.

Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ па вырошчванні ягадных культур.

Практычныя работы. Абразанне галін ягадных кустоў, апрацоўка глебы, удзел ва ўнясенні ўгнаенняў.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

віды і сарты ягадных культур;

віды работ па доглядзе ягадных кустоў;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

абразаць галіны ягадных кустоў; апрацоўваць глебу.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па пладаводстве і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў работах па доглядзе ягадных кустоў у зменегай практычнай сітуацыі і ўдзельнічаць у іх планаванні.

## VIII КЛАС

(35 гадзін, у тым ліку 12 гадзін на практычнае паўтарэнне)

Спосабы размнажэння суніц. Вегетатыўны – асноўны спосаб размнажэння суніц: умовы атрымання паўнавартаснага пасадачнага матэрыялу, передпасадачная апрацоўка і ўгнаенне глебы, тэрміны і правілы пасадкі, догляд пасадак. Віды работ па доглядзе пладаносных суніц.

Віды восеньскіх работ па доглядзе пладовых дрэў. Віды вясновых работ па доглядзе пладовых дрэў.

Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ па вырошчванні ягадных культур і доглядзе пладовых дрэў.

Практычныя работы. Удзел у атрыманні расады суніц, падрыхтоўка і ўгнаенне глебы пад пасадку суніц, разметка месцаў пасадкі, пасадка расады суніц, догляд пасадак. Догляд пладаносных суніц (рыхленне і мульчыраванне глебы, праполка, знішчэнне лішніх вусоў, снегазатрыманне).

Абразанне сухіх галін пладовых дрэў, ачыстка штамбаў, збор апалага лісця, пладоў, адмерлай кары, галінак, зімовых гнёздаў шкоднікаў і іх знішчэнне, ускопванне прыствольных кругоў, унясенне ўгнаенняў, пабелка штамбаў пладовых дрэў.

Ахова пладовых дрэў ад грызуноў (абвязка). Фарміруючае абразанне кроны пладовых дрэў (па метках настаўніка).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

спосабы размнажэння суніц;

віды работ па доглядзе пладаносных суніц;

віды работ па доглядзе пладовых дрэў;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

размножваць суніцы вегетатыўным спосабам; даглядаць пладаносныя суніцы; даглядаць пладовыя дрэвы.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па пладаводстве і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў работах па вырошчванні суніц і доглядзе пладовых дрэў у зменenай практычнай сітуацыі; удзельнічаць у іх планаванні.

## IX КЛАС

(35 гадзін, у тым ліку 12 гадзін на практычнае паўтарэнне)

Спосабы размнажэння ягадных кустоў. Тэрміны, рэкамендаваныя месцы і правілы пасадкі ягадных кустоў. Сутнасць работ па доглядзе маладых пасадак.

Правілы ўборкі ўраджаю садавіны. Спосабы і ўмовы працяглага захоўвання яблыкаў.

Тэрміны пасадкі саджанцаў пладовых дрэў. Адлегласць паміж саджанцамі пладовых дрэў. Правілы падрыхтоўкі пасадачных ям. Правілы пасадкі саджанцаў пладовых дрэў.

Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ па вырошчванні ягадных культур і пладовых дрэў, уборцы ўраджаю пладоў.

Практычныя работы. Вызначэнне месцаў для пасадкі ягадных кустоў. Падрыхтоўка глебы пад пасадку ягадных кустоў. Разметка месцаў пасадкі і пасадка ягадных кустоў, догляд маладых пасадак.

Уборка ўраджаю сліў, груш, яблыкаў. Адбор і закладка яблыкаў на працяглае захоўванне.

Разметка і выкопванне пасадачных ям пад саджанцы пладовых дрэў. Унясенне ў пасадачную яму ўгнаенняў і пасадка саджанцаў. Ушчыльненне глебы і паліў саджанцаў пасля пасадкі. Падвязванне саджанца да кала. Догляд саджанцаў.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

спосабы размнажэння ягадных кустоў;

тэрміны, рэкамендаваныя месцы і правілы пасадкі ягадных кустоў, сутнасць работ па доглядзе маладых пасадак;

правілы ўборкі ўраджаю садавіны, спосабы і ўмовы працяглага захоўвання яблыкаў;

тэрміны і правілы пасадкі саджанцаў пладовых дрэў;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць пасадку ягадных кустоў; даглядаць маладыя пасадкі ягадных кустоў; збіраць ураджай садавіны; выконваць пасадку саджанцаў пладовых дрэў.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па пладаводстве і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў работах па пасадцы ягадных кустоў, саджанцаў пладовых дрэў, уборцы ўраджаю садавіны ў зменenай практычнай сітуацыі; удзельнічаць у іх планаванні.

## X КЛАС

(35 гадзін, у тым ліку 12 гадзін на практычнае паўтарэнне)

Шкоднікі пладова-ягадных культур і меры барацьбы з імі. Хваробы пладова-ягадных культур і меры барацьбы з імі. Прызначэнне і спосабы прышчэпкаў пладовых дрэў.

Каляндар садавода.

Арганізацыя вучэбных месцаў, правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ па барацьбе са шкоднікамі і хваробамі пладова-ягадных культур, прышчэпцы пладовых дрэў.

Практычныя работы. Удзел у падрыхтоўцы і прымяненні натуральных прэпаратаў для барацьбы са шкоднікамі і хваробамі пладова-ягадных культур. Удзел у прышчэпцы пладовых дрэў.

Складанне календара садавода.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

шкоднікаў і хваробы пладова-ягадных культур і меры барацьбы з імі;

прызначэнне і спосабы прышчэпкаў пладовых дрэў;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

удзельнічаць у работах па барацьбе са шкоднікамі і хваробамі пладова-ягадных культур, у прышчэпцы пладовых дрэў.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па пладаводстве і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

уменне арыентавацца ў работах па барацьбе са шкоднікамі і хваробамі пладова-ягадных культур у зменenай практычнай сітуацыі і ўдзельнічаць у іх планаванні.

# МАСТАЦКАЯ АПРАЦОЎКА МАТЭРЫЯЛАЎ

## РУЧНАЯ ВЫШЫЎКА

## VI КЛАС (35 гадзін)

Уступныя заняткі (2 гадзіны)

Арганізацыя вучэбнага месца пры вышыванні. Захоўванне інструментаў, матэрыялаў і рабочага адзення. Санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы бяспечных паводзін на занятках па ручной вышыўцы.

Вышыўка як від дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (2 гадзіны)

Вышыванне як спосаб адлюстравання навакольнага свету і ўпрыгожвання прадметаў быту. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва як мастацтва афармлення прадметаў быту. Роля вышыўкі ў афармленні інтэр’ера. Значэнне вышыўкі ў афармленні адзення і іншых прадметаў. Вышыўкі розных народаў. Традыцыйная беларуская вышыўка, яе асаблівасці.

Экскурсія ў музеі народнай творчасці (на выставу).

Матэрыялы, інструменты і прыстасаванні для ручной вышыўкі (4 гадзіны)

Разнастайнасць тканін для вышывання, канва.

Ніткі для вышывання: мулінэ, ірыс, гарус, крашэ, шарсцяная пража. Структура пасмы (пасмо) нітак мулінэ. Разнастайнасць упакоўкі вышывальных нітак: шпулька, клубок, маток, патроны-трубкі. Іншыя матэрыялы для ручной вышыўкі: тасьма, шнур. Дэкаратыўныя матэрыялы: бісер, шклярус, пацеркі, бліскаўкі.

Пяльцы, іх віды і прызначэнне. Інструменты для заняткаў вышываннем: іголкі, нажніцы, шпількі. Іголкі для вышывання: нумары іголак, залежнасць даўжыні і дыяметра іголкі ад нумара. Падбор іголак у залежнасці ад тканіны і таўшчыні нітак.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры рабоце з інструментамі.

Простыя ўпрыгожвальныя швы (14 гадзін)

Віды простых швоў: «наперад іголку», сцяблістасты, тамбурны, аксамітны, пяцельны. Знешні выгляд швоў з правага і вываратнага бакоў, прымяненне, паслядоўнасць і асаблівасці выканання. Шывок, даўжыня шыўка, шво. Залежнасць даўжыні шыўка ад тканіны, на якой выконваецца вышыўка.

Падрыхтоўка да вышывання. Спосабы пераводу малюнка на паперу, на тканіну. Выкарыстанне клятчастай паперы для замалёўкі ўзораў, выкананых крыжам. Павелічэнне і памяншэнне малюнка. Адпаведнасць малюнка прызначэнню вырабу. Варыянты ўскладнення або спрашчэння малюнка для вышывання.

Падбор тканіны і нітак для вышывання. Выраўноўванне краёў тканіны.

Замацаванне рабочай ніткі. Розныя прыёмы замацавання рабочай ніткі ў пачатку і ў канцы работы.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні вільготна-цеплавой апрацоўкі вырабу.

Практыкаванні. Выкананне простых швоў («наперад іголку», сцяблісты, тамбурны, аксамітны, пяцельны). Выкананне прыёмаў замацавання ніткі на тканіне ў пачатку і ў канцы работы.

Практычныя работы. Выбар, перавод і змяненне малюнка. Падбор і падрыхтоўка тканіны. Падбор нітак для вышывання. Вышыванне з выкарыстаннем простых швоў. Вільготна-цеплавая апрацоўка вырабу.

Вырабы. Сурвэткі.

Лічаныя і свабодныя швы (6 гадзін)

Віды лічаных і свабодных швоў. Раўнамернасць шыўкоў як у лічаных, так і ў свабодных швах. Асаблівасці камбінавання швоў: выкананне контуру выявы адным швом, вышыванне ўнутры контуру іншымі швамі, выкананне розных частак выявы рознымі швамі.

Практыкаванні. Распазнаванне і выкананне швоў на ўзорах і ў вырабах, аформленых вышыўкай.

Практычнае паўтарэнне (7 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках па ручной вышыўцы;

прызначэнне вышыўкі; асаблівасці традыцыйнай беларускай вышыўкі;

матэрыялы, інструменты і прыстасаванні для ручной вышыўкі;

тэхналогію выканання простых швоў і асаблівасці іх камбінавання;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць вышыўку з выкарыстаннем простых швоў і іх камбінавання.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па ручной вышыўцы і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

выбар варыянтаў змены малюнка для вышывання і выкананне зmененага малюнка.

## VII КЛАС (35 гадзін)

### Вышыванне гладдзю (14 гадзін)

Віды гладзі: дэкаратыўная, аднабаковая, выпуклая, двухбаковая, гладзевы валік, белая гладзь.

Гладзь з насцілам. Тэхніка белай гладзі. Прыёмы выканання дэталей белай гладзі.

Лічаная гладзь. Тканіна для выканання лічанай гладзі. Ніткі для выканання лічанай гладзі. Тэхналогія выканання лічанай гладзі. Матывы малюнкаў з элементаў лічанай гладзі.

Дэкаратыўная гладзь. Знешні выгляд і паслядоўнасць выканання дэкаратыўнай гладзі. Штрыхавая і ценявая гладзь. Асаблівасці выкарыстання нітак 2–3 колераў пры выкананні асобнага элемента з мэтай атрымання аб’ёмнасці і выразнасці. Камбінаванне гладзі з іншымі швамі (выкананне сцябліністым швом дробных дэталей, часам – контуру малюнка).

Практыкаванні. Аналіз узораў і вырабаў, упрыгожаных гладдзю. Падбор нітак па колеры.

Практычныя работы. Выбар, перавод і змяненне малюнка. Падбор і падрыхтоўка тканіны. Падбор нітак для вышывання. Вышыванне ў тэхніцы белай гладзі, вышыванне ў тэхніцы лічанай гладзі, вышыванне ў тэхніцы дэкаратыўнай гладзі. Вільготна-цеплавая апрацоўка вырабу.

Вырабы. Сурвэткі, мініяцюры.

### Вышыванне паўкрыжам і крыжам (14 гадзін)

Шво «паўкрыж» і яго варыянты. Прымяненне шва «паўкрыж» як самастойнага і дадатковага ў спалучэнні з іншымі элементамі. Залежнасць памеру крыжа ад таўшчыні і шчыльнасці перапляцення нітак у тканіне.

Вышыванне крыжам. Тканіны для вышыўкі крыжам. Патрабаванні да вышыўкі крыжам. Крыж косы аднабаковы ў адзін і два хады. Прыёмы вышывання крыжам у гарызантальным і вертыкальным радах.

Прыёмы вышывання крыжам нахільных радоў.

Выкарыстанне вышыўкі крыжам для аздаблення бытавых вырабаў. Тэхніка выканання: вышыўка крыжам па ўзоры, па лічыльнай схеме.

Практыкаванні. Выкананне гарызантальных радоў: рад суцэльных крыжыкаў у адзін праход ніткі, у два праходы ніткі, рад разрэджаных крыжыкаў, двайны рад разрэджаных крыжыкаў. Выкананне вертыкальных радоў у два праходы: адзіночны вертыкальны рад крыжыкаў, вертыкальны

рад крыжыкаў з пераходам на суседні рад на тым жа ўзроўні, ніжэй – вышэй за ўзровень верхняга крыжыка і іншыя варыянты.

Практычныя работы. Выбар, перавод і змена малюнка. Падбор і падрыхтоўка тканіны. Падбор нітак для вышывання. Вышыванне паўкрыжам і крыжам. Вільготна-цеплавая апрацоўка вырабу.

Вырабы. Сурвэткі, ручнікі.

Практычнае паўтарэнне (7 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

віды гладзі; тэхналогію выканання лічанай гладзі, частковай гладзі, дэкаратыўнай гладзі, прыёмы вышывання паўкрыжам і крыжам;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць вышыўку з выкарыстаннем лічанай гладзі, частковай гладзі, дэкаратыўнай гладзі, вышывання паўкрыжом і крыжам.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па ручной вышыўцы і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай практычнай рабоце:

выбар варыянтаў змены малюнка для вышывання і выкананне змененага малюнка.

## VIII КЛАС (35 гадзін)

### Вышыванне стужкамі, тасьмой і шнурам (20 гадзін)

Вышыванне стужкамі. Адрозненне ад вышывання ніткай. Інструменты і матэрыялы. Асаблівасці тканін, якія выкарыстоўваюцца для вышывання стужкай. Разнастайнасць стужак: атласныя, шаўковыя, капронавыя, іх уласцівасці. Іголкі для вышывання стужкамі: «сінель», габеленавыя іголкі, бісерная іголка, цыганская іголка, звычайныя швейныя іголкі. Патрабаванні да іголак. Падбор іголак у залежнасці ад шырыні стужкі і ўласцівасцей тканіны.

Перавод малюнка на тканіну. Спосабы пераводу малюнка на канву або тканіну: з дапамогай самазнікаючага маркера, з дапамогай капіравальнай паперы, шляхам пераводу малюнка на канву накідвальнымі шыўкамі.

Прыёмы замацавання стужкі. Замацаванне стужкі ў іголцы, у канцы вышыўкі. Спосабы выканання вузельчыка. Захоўванне стужак для вышывання.

Выкананне найпрасцейшых швоў: сцяблісты, «наперад іголку», тамбурны, пяцельны, «крыжык», «паўпятля», «паўпятля з двайным замацаваннем», «пятля».

Швы: «французскі вузельчык», «пятля з французскім вузельчыкам», «пятля перакручаная» і іншыя.

Элементы кампазіцый са стужкі: бутон просты, бутон напаўраскрыты, бутон закрыты, лісцік і іншыя.

Вышыванне тасьмой, шнуром. Разнастайнасць тасьмы. Інструменты для вышывання тасьмой. Асаблівасці тэхналогіі вышывання тонкай тасьмой і шнуром. Прыёмы вышывання тасьмой.

Практыкаванні. Падбор іголак да стужак рознай шырыні і фактуры. Выкананне швоў (сцяблісты, «наперад іголку», тамбурны, пяцельны, «крыжык») стужкамі на ўзорах.

Практычныя работы. Выбар, перавод і змяненне малюнка. Падбор і падрыхтоўка тканіны. Падбор стужкі, тасьмы, шнура для вышывання. Вышыванне стужкай, тасьмой, шнуром. Вільготна-цеплавая апрацоўка вырабу.

Вырабы. Сурвэткі, насценныя ўпрыгожанні, абрусы.

### Строчавая вышыўка (8 гадзін)

Строчавая вышыўка па прасунутых нітках. Прызначэнне мярэжкі. Прасоўванне нітак тканіны для выканання мярэжак. Залежнасць шырыні дарожкі ад уласцівасцей тканіны. Аднабаковая мярэжка.

Вызначэнне месца пачатку работы.

Практыкаванні. Аналіз узораў і вырабаў, упрыгожаных вышыўкай. Прасоўванне нітак, выкананне мярэжкі.

Практычныя работы. Падбор нітак. Выкананне строчавай вышыўкі (мярэжкі). Вільготна-цеплавая апрацоўка вырабу.

Выраб. Мярэжка на бялізнавых вырабах.

### Практычнае паўтарэнне (7 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

магчымасці выкарыстання тасьмы, стужкі і шнура для вышывання;

іголкі для вышывання тасьмой і шнуром;

спосабы пераводу малюнка на канву або тканіну;

тэхналогію вышывання з выкарыстаннем тасьмы, стужкі і шнура;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць вышыўку з выкарыстаннем тасьмы, стужкі і шнура, прасоўваць ніткі, выконваць мярэжку.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па ручной вышыўцы і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

выбар варыянтаў змены малюнка для вышывання стужкай, тасьмой, шнуром і выкананне змененага малюнка;

выбар вырабу для выканання мярэжкі і схемы мярэжкі; выкананне мярэжкі з улікам выбранага вырабу і схемы.

## IX КЛАС (35 гадзін)

### Вышыванне крыжам (28 гадзін)

Разнавіднасці крыжа: балгарскі (двайны) крыж, падоўжаны косы крыж, крыж двухрадковы, крыж рассыпны (разрэджаны). Прызначэнне, знешні выгляд з правага і вываратнага бакоў, паслядоўнасць выканання. Віды тканіны для вышывання крыжам.

Вышыванне крыжам найпрасцейшых геаметрычных узораў на палатне. Асаблівасці тэхналогіі вышывання найпрасцейшых геаметрычных узораў.

Стылізаваныя выявы прадметаў і найпрасцейшыя ўзоры, вышытыя крыжам.

Вышыўка крыжам па схеме, малюнку, узоры. Асаблівасці тэхналогіі вышывання па гатовым малюнку, узоры, лічыльнай схеме. Умоўныя абазначэнні кветак. Падбор нітак.

Манаграмы. Месцы размяшчэння манаграм. Вышыванне манаграм на насоўках, сурвэтках, накладных кішэнях.

Практыкаванні. Аналіз узораў і вырабаў, упрыгожаных вышыўкай крыжам. Выкананне на ўзорах розных відаў крыжоў у гарызантальным радзе.

Выкананне на ўзорах розных відаў крыжоў у камбінацыях з іншымі відамі швоў.

Практычныя работы. Выбар, перавод і змена малюнка. Падбор і падрыхтоўка тканіны. Падбор нітак для вышывання. Вышыванне балгарскім крыжам, падоўжаным косым крыжам, крыжам двухрадковым, крыжам рассыпным па схеме, малюнку, узоры. Вільготна-цеплавая апрацоўка вырабу.

Вырабы. Сурвэткі, ручнікі.

Практычнае паўтарэнне (7 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

разнавіднасці крыжа: складаны (двайны, балгарскі) крыж (прызначэнне, знешні выгляд з правага і вываратнага бакоў, паслядоўнасць выканання); падоўжаны косы крыж, крыж двухрадковы, крыж рассыпны і іншыя;

асаблівасці тэхналогіі вышывання найпрасцейшых геаметрычных узораў; асаблівасці тэхналогіі вышывання па гатовым малюнку, узоры;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць вышыўку з выкарыстаннем вывучаных відаў крыжа.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па ручной вышыўцы і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

выбар варыянтаў змены малюнка для вышывання крыжам і выкананне змененага малюнка.

## X КЛАС (35 гадзін)

### Розныя тэхнікі вышывання (28 гадзін)

Камбінаванне розных відаў гладзі з дэкаратыўнымі швамі і дадатковымі элементамі. Выкарыстанне ажурнай сеткі для запаўнення буйных дэталей малюнка. Знешні выгляд і паслядоўнасць выканання пражразной гладзі.

Бардзюры з геаметрычным малюнкам. Чаргаванне вышыўкі гладдзю з вышыўкай крыжам.

Дадатковыя элементы ў вышыўцы: кусцікі, або «курыны след», зорачкі, завіткі, пяцелькі і паўпяцелькі.

Вышыванне бісерам, шклярусам, бліскаўкамі (паеткамі). Іголкі і ніткі для вышывання бісерам, шклярусам. Прыёмы работы пры вышыванні бісерам: шыццё «ў пракол», «прымацаванае». Вышыванне паеткамі. Спосабы замацавання паетак на тканіне.

Афармленне вышытых вырабаў: махрамі, падгінам, у рамку. Догляд вышытых вырабаў.

Практыкаванні. Выкананне ажурнай сеткі. Выкананне элементаў праразной гладзі на ўзорах. Выкананне на ўзорах дадатковых элементаў (кусцікі, зорачкі, «жабіна вока», завіткі «барановы рожкі», пяцелькі і паўпяцелькі прымацаваныя).

Практычныя работы. Выбар, перавод і змена малюнка. Падбор і падрыхтоўка тканіны. Падбор нітак для вышывання, бісеру, шклярусу, паетак. Вышыванне з выкарыстаннем камбінавання розных відаў гладзі, вышыванне бардзюраў з геаметрычным малюнкам, вышыванне бісерам, шклярусам, паеткамі. Афармленне вышытых вырабаў. Догляд вышытых вырабаў.

Вырабы. Сурвэткі, ручнікі.

Практычнае паўтарэнне (7 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

знешні выгляд і паслядоўнасць выканання розных выглядаў гладзі; магчымасці чаргавання вышыўкі гладдзю з вышыўкай крыжам;

дадатковыя элементы ў вышыўцы: кусцікі, або «курыны след», зорачкі, завіткі, пяцелькі і паўпяцелькі;

тэхналогію вышывання каралямі, шклярусам, бісерам, бліскаўкамі;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць вышыўку з выкарыстаннем розных відаў гладзі, чаргаваць вышыўку гладдзю з вышыўкай крыжам, выконваць дадатковыя элементы ў вышыўцы, выкарыстоўваць пры вышыванні бісер, шклярус, бліскаўкі.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па ручной вышыўцы і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

выбар варыянтаў вышыўкі і афармлення вырабу, выкананне вышыўкі ў адпаведнасці з задумай.

## ПЛЯЦЕННЕ З ЛАЗОВАГА ДУБЦА

### VI КЛАС (35 гадзін)

Уступныя заняткі (2 гадзіны)

Арганізацыя вучэбнага месца на занятках па пляценні з лазовага дубца. Захоўванне інструментаў, матэрыялаў і рабочага адзення. Санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы бяспечных паводзін на занятках па пляценні з лазовага дубца.

Пляценне з лазовага дубца як рамяство
і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (2 гадзіны)

Гісторыя рамяства. Віды вырабаў з лазовага дубца, іх прымяненне. Вырабы з лазовага дубца як творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Мастацкая каштоўнасць вырабаў.

Матэрыялазнаўства (2 гадзіны)

Матэрыялы для пляцення: прыродныя (натуральныя), штучныя. Віды лазы, дубец якіх прыдатны для пляцення, іх знешнія прыметы. Месцы натуральнага росту лоз. Натуральны (прыродны) матэрыял для пляцення: лазовы дубец, стужка-глянец. Знешнія прыметы якаснай сыравіны (даўжыня, спеласць, збежыстасць і іншыя). Вяршыня, камель. Штучныя матэрыялы: каляровы дрот, шнур, пластыкавая стужка; іх прызначэнне і ўласцівасці.

Практычныя работы. Распазнаванне лазы сярод іншых дрэў і кустоў. Знаходжанне кустовай лазы, дубец якой прыдатны для пляцення. Распазнаванне па знешніх прыметах дубцоў, прыдатных для пляцення.

Нарыхтоўка лазовага дубца (4 гадзіны)

Месца нарыхтоўкі лазовага дубца. Матэрыял, прыдатны для нарыхтоўкі: прыкаранёвыя парасткі, аднагадовы прырост галін. Знешнія прыметы якаснага матэрыялу. Тэрміны нарыхтоўкі лазовых дубцоў. Уласцівасці спелых дубцоў. Асаблівасці нарыхтоўкі ў розныя поры года.

Інструменты для нарыхтоўкі: секатар, бакарэз, нож. Будова рэжучых інструментаў. Правілы зрэзкі дубцоў. Падрыхтоўка лазовых дубцоў да транспарціроўкі.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры нарыхтоўцы лазовага дубца.

Практычныя работы. Нарыхтоўка дубцоў у асенне-зімовы перыяд бакарэзам, секатарам. Ачыстка дубцоў ад лісця пасля зразання. Сарціроўка зрэзаных дубцоў па якасці. Звязванне рассартаваных дубцоў, транспарціроўка ў майстэрню.

Сарціроўка лазовага дубца (2 гадзіны)

Прызначэнне сарціроўкі. Прыметы, па якіх сарціруюць неакораныя дубцы: колер, таўшчыня, даўжыня. Прыстасаванне для вызначэння

таўшчыні дубца ля камля. Тэхналогія сарціроўкі дубцоў па таўшчыні. Тэхналогія сарціроўкі дубцоў па даўжыні. Захоўванне неакораных дубцоў.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры сарціроўцы лазовага дубца.

Практычная работа. Сарціроўка неакоранай лазы па трох прыметах.

Інструменты і трэнажоры для пляцення (2 гадзіны)

Інструменты: бакарэз (кусачкі), нож-касяк, шыла, круглагубцы, Прызначэнне.

Трэнажоры: прамыя, круглыя, тарцовыя. Іх прызначэнне, будова. Прызначэнне стоек.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры рабоце з інструментамі для пляцення і трэнажораў.

Практычная работа. Нарэзка стоек для трэнажораў.

Падрыхтоўка матэрыялу да пляцення (2 гадзіны)

Уласцівасці вільготных і сухіх дубцоў. Ёмістасці для замочвання. Час і тэмпература вады.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры падрыхтоўцы матэрыялаў да работы.

Практыкаванні. Вызначэнне гатоўнасці лазовага дубца да работы шляхам згінання, навівання.

Практычныя работы. Выраб дэкаратыўных кветак шляхам навівання дубцоў або стужкі-глянец на шаблон.

Простае пляценне (2 гадзіны)

Прымяненне простага пляцення. Аснова пляцення – стойкі. Тэхналогія простага пляцення. Правы і вываратны бакі вырабу. Спосабы нарошчвання дубцоў. Тэхналогія простага пляцення праз адну стойку на круглым трэнажоры з няцотнай колькасцю стоек. Крытэрыі якасці простага пляцення.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры пляценні.

Практыкаванні ў адрозніванні відаў пляцення на ўзорах вырабаў. Практыкаванні ў выкананні простага пляцення на прамым і круглым трэнажорах.

Вяровачка ў два дубцы (4 гадзіны)

Прызначэнне вяровачак у вырабах. Канструктыўныя асаблівасці вяровачкі ў два дубцы. Тэхналогія пляцення вяровачкі ў два дубцы. Спосаб злучэння дубцоў.

Практыкаванні ў знаходжанні вяровачкі ў два дубцы на ўзорах вырабаў.

Практыкаванні ў выкананні вяровачкі ў два дубцы на прамым трэнажоры дротам рознага колеру (напрыклад: сіняга і чырвонага). Практыкаванні ў выкананні вяровачкі ў два дубцы на круглым трэнажоры. Практыкаванні ў выкананні чаргавання спосабаў пляцення «вяровачка ў два дубцы» і «простае пляценне».

Простая загібка (2 гадзіны)

Загібка як канструктыўны элемент вырабу. Прызначэнне загібак. Прызначэнне простай загібкі. Тэхналогія выканання простай загібкі праз адну стойку. Тэхналогія выканання простай загібкі праз дзве стойкі. Крытэрыі якасці. Тэхналогія замены стойкі. Падоўжаны зрэз.

Практыкаванні ў знаходжанні загібак на ўзорах вырабаў. Практыкаванні ў выкананні простай загібкі праз адну стойку на трэнажоры. Практыкаванні ў выкананні простай загібкі праз дзве стойкі на трэнажоры. Завострыванне дубцоў на падоўжаны зрэз.

Выраб кашпо для вазона (6 гадзін)

Вызначэнне і прызначэнне кашпо. Канструктыўныя асаблівасці кашпо. Шаблон, яго прызначэнне і будова. Тэхналогія пляцення кашпо без дна. Крытэрыі якасці вырабу.

Практыкаванні ў зборцы шаблона для работы.

Практычныя работы. Камплектаванне матэрыялу. Замочванне матэрыялу перад работай. Выраб кашпо.

Практычнае паўтарэнне (5 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках па пляценні з лазовага дубца;

віды вырабаў з лазовага дубца, іх прымяненне;

віды лоз, дубец якіх прыдатны для пляцення, іх знешнія прыметы, месцы натуральнага росту лоз; матэрыялы і інструменты для заняткаў па пляценні з лазовага дубца, іх прызначэнне;

тэхналогію выканання нарыхтоўкі, сарціроўкі, падрыхтоўкі матэрыялу да пляцення, простага пляцення, вяровачкі ў два дубцы, простай загібкі;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць нарыхтоўку, сарціроўку, падрыхтоўку матэрыялу да пляцення, простае пляценне, вяровачку ў два дубцы, простую загібку.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па пляценні з лазовага дубца і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб асаблівасцях нарыхтоўкі лазовага дубца ў розную пару года, прыёмах яго нарыхтоўкі, сарціроўкі і падрыхтоўкі да пляцення.

## VII клас (35 гадзін)

### Нарыхтоўка матэрыялу (практычнае паўтарэнне) (4 гадзіны)

#### Акорванне лазовых дубцоў (2 гадзіны)

Прызначэнне акорвання. Праварванне лазовых дубцоў – спосаб падрыхтоўкі дубцоў да акорвання. Умовы цеплавой апрацоўкі лазовага дубца (праварвання). Правілы цеплавой апрацоўкі. Інструмент для акорвання – шчамілка. Прынцып работы шчамілкай. Правілы акорвання шчамілкай. Патрабаванні да якасці дубца пасля акорвання.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры акорванні.

Практыкаванні ў пробным акорванні дубцоў шчамілкай.

Практычная работа. Акорванне лазовых дубцоў.

#### Сарціроўка і сушка акораных лазовых дубцоў (2 гадзіны)

Прызначэнне сарціроўкі акораных лазовых дубцоў. Прыметы, па якіх сарціруюць дубцы: колер, таўшчыня, даўжыня. Прыстасаванні для сарціроўкі. Сушка лазовых дубцоў: прызначэнне, умовы для сушкі.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры сарціроўцы і сушцы акораных лазовых дубцоў.

Практычныя работы. Сарціроўка лазовых дубцоў. Падрыхтоўка дубцоў да сушкі. Упакоўка на захоўванне.

### Вяровачка ў тры дубцы (4 гадзіны)

Канструктыўныя асаблівасці вяровачак у тры і больш дубцоў. Прызначэнне. Тэхналогія выканання вяровачкі ў тры дубцы. Спосабы злучэння дубцоў. Спосаб пераходу ў наступны рад.

Практыкаванні ў знаходжанні вяровачкі на ўзорах вырабаў. Практыкаванні ў выкананні вяровачкі ў тры дубцы на прамым трэнажоры. Практыкаванні ў выкананні вяровачкі ў тры дубцы на круглым трэнажоры. Практыкаванні ў выкананні чаргавання спосабаў пляцення «простае пляценне» і «вяровачка ў тры дубцы».

Пляценне вырабаў з гатовым дном (6 гадзін)

Вырабы з плеценым і няплеценым дном. Матэрыял для гатовых доноў (фанерныя дны рыхтуюць настаўнік ці вучні старэйшых класаў, якія навучаюцца апрацоўцы драўніны). Форма гатовых доноў. Адтуліны, іх прызначэнне.

Падрыхтоўка фанернага дна да выкарыстання: шліфоўка наждачнай паперай. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры пляценні вырабаў з гатовым дном.

Падстаноўка стоек і замацаванне іх у гатовым дне. Звесткі аб паслядоўнасці пляцення вырабу з гатовым дном. Крытэрыі якасці вырабу.

Практычныя работы. Падрыхтоўка фанерных доноў да работы. Выраб кашпо, сурвэтніцы з гатовым дном.

Выраб сувенірнага кошыка з гатовым дном
і вітай ручкай з двух дубцоў (6 гадзін)

Прызначэнне сувенірных вырабаў, сувенірнага кошыка. Аздабленне кошыка стужкай-глянец светлага і цёмнага колераў. Тэхналогія пляцення кошыка. Крытэрыі якасці сувенірнага кошыка.

Канструктыўны элемент «ручка», прызначэнне. Вітая ручка з двух дубцоў (ручка выконваецца метадам перапляцення двух дубцоў паміж сабой). Спосаб вырабу і замацавання (мацуецца з дыяметральна процілеглых бакоў вырабу). Інструменты. Дапаможны матэрыял: клей ПВА. Крытэрыі якасці.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкарыстанні клею.

Практычная работа. Выраб сувенірнага кошыка з гатовым дном і вітай ручкай з двух дубцоў.

Паслойнае пляценне (6 гадзін)

Паслойнае пляценне, прызначэнне, выкарыстанне ў вырабах з іншымі відамі пляцення. Асаблівасці знешняга выгляду. Падбор матэрыялу для паслойнага пляцення (адпаведнасць колькасці дубца пры паслойным пляценні колькасці стоек у вырабе). Тэхналогія пляцення паслойным спосабам. Крытэрыі якасці паслойнага пляцення.

Практыкаванні ў падборы матэрыялу для паслойнага пляцення. Пляценне паслойным спосабам у адзін дубец (адну стужку-глянец) на круглым трэнажоры.

Практычная работа. Выраб сувенірнага кошыка з гатовым дном і вітай ручкай з двух дубцоў. Сценка кошыка выканана паслойным пляценнем.

Практычнае паўтарэнне (5 гадзін)

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

тэхналогію выканання акорвання лазовых дубцоў, сарціроўкі акораных лазовых дубцоў, вяровачкі ў тры дубцы, паслойнага пляцення;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць акорванне лазовых дубцоў, сарціроўку акораных лазовых дубцоў, вяровачку ў тры дубцы, паслойнае пляценне.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па пляценні з лазовага дубца і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб акорванні лазовага дубца, сарціроўцы і сушцы акораных лазовых дубцоў;

падбор даступных найпрасцейшых вырабаў з лазовага дубца для далейшага выканання.

VIII клас (35 гадзін)

Нарыхтоўка матэрыялу, падрыхтоўка матэрыялу да пляцення
(практычнае паўтарэнне) (4 гадзіны)

Выраб стужкі-глянец (4 гадзіны)

Прызначэнне стужкі-глянец. Матэрыял для вырабу стужкі-глянец. Інструменты: калункі на тры і чатыры сячэнні. Тэхналогія расколвання дубцоў. Правілы бяспечнай работы пры расколванні дубцоў.

Шоф – інструмент для адстругвання стужкі па таўшчыні: прызначэнне, прымяненне. Шмол – інструмент для выраўноўвання стужкі па шырыні: прызначэнне, прымяненне. Крытэрыі якасці. Сарціроўка стужкі-глянец.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры вырабе стужкі-глянец.

Практычныя работы. Выраб стужкі-глянец: падбор матэрыялу, замочванне яго перад работай, расколванне дубцоў на шыны, адстругванне шын па таўшчыні, выраўноўванне стужкі па шырыні. Сарціроўка стужак.

Выраб крыжавіны для круглага дна. Пляценне дна (8 гадзін)

Плеценае дно – канструктыўны элемент кошыкаў і іншых плеценых вырабаў. Віды дноў. Крыжавіна – аснова дна. Інструменты і прыстасаванні. Матэрыял. Тэхналогія вырабу крыжавіны 4×4 дубца. Крытэрыі якасці крыжавіны.

Тэхналогія пляцення вяровачкі ў два дубцы пры пляценні дна. Тэхналогія пляцення дна простым пляценнем у адну стужку-глянец (адзін дубец). Тэхналогія пляцення дна простым пляценнем у дзве стужкі-глянец (два дубцы). Крытэрыі якасці вырабу круглага плеценага дна.

Практыкаванні ў замацаванні крыжавіны спосабам «вяровачка ў два дубцы».

Практычныя работы. Выраб крыжавіны. Выраб круглага дна з крыжавінай 4×4.

Ажурная загібка (4 гадзіны)

Ажур, ажурная загібка, прызначэнне. Умовы выканання ажурнай загібкі. Тэхналогія выканання ажурнай загібкі ў адзін дубец.

Умовы выканання загібкі ў два дубцы. Тэхналогія пляцення ажурнай загібкі ў два дубцы. Крытэрыі якасці.

Практыкаванні ў пляценні простай ажурнай загібкі ў адзін дубец на трэнажоры.

Практычная работа. Пляценне пано «Сонейка» з ажурнай загібкай у два дубцы.

Выраб вазы для садавіны з ажурнай загібкай у два дубцы (6 гадзін)

Ваза для садавіны, канструктыўныя асаблівасці (дно фанернае круглай ці авальнай формы). Замацаванне дна вазы ніжнімі канцамі стоек простай загібкай. Спосабы пляцення: вяровачка ў тры дубцы, паслойнае пляценне, ажурная загібка ў два дубцы з пераходам у простую. Простая загібка ў два дубцы. Крытэрыі якасці.

Практычная работа. Пляценне вазы для садавіны круглай або авальнай формы з ажурнай загібкай у два дубцы.

Атрыманне дубцоў белага колеру (4 гадзіны)

Прызначэнне дубцоў белага колеру, дэкаратыўныя аздобныя якасці. Вясновы рух соку. Асаблівасці акорвання ў вясновы перыяд. Сушка ў натуральных умовах.

Штучнае «ажыўленне» дубцоў у зімовы перыяд ва ўмовах памяшкання. Акорванне дубцоў без праварвання.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры атрыманні дубцоў белага колеру.

Практычныя работы. Штучнае «ажыўленне» лазовага дубца ва ўмовах майстэрні. Акорванне дубца.

Нарыхтоўка і акорванне лазовага дубца ў вясновы перыяд ва ўмовах натуральнага росту. Сушка дубцоў.

Практычнае паўтарэнне (5 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

тэхналогію вырабу стужкі-глянец, крыжавіны, пляцення донца, выканання ажурнай загібкі ў адзін і два дубцы, штучнага «ажыўлення» лазовага дубца, акорвання дубца ў вясновы перыяд;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

вырабляць стужку-глянец, крыжавіну, выконваць пляценне донца, ажурную загібку ў адзін і два дубцы, штучнае «ажыўленне» лазовага дубца, акорванне дубца ў вясновы перыяд.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па пляценні з лазовага дубца і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб вырабе стужкі-глянец, аб атрыманні дубцоў белага колеру;

падбор даступных найпрасцейшых вырабаў з лазовага дубца для далейшага выканання.

## IX КЛАС (35 гадзін)

Нарыхтоўка матэрыялу, падрыхтоўка матэрыялу да пляцення (практычнае паўтарэнне) (4 гадзіны)

Загібка ў тры пары дубцоў (2 гадзіны)

Выкарыстанне загібкі ў тры пары дубцоў у вырабах. Канструктыўныя асаблівасці загібкі ў тры пары дубцоў. Тэхналогія пляцення. Крытэрыі якасці загібкі. Памылкі і спосабы іх ліквідацыі.

Практыкаванні ў пляценні загібкі ў тры пары дубцоў на трэнажоры.

Кошык для ягад з плеценым круглым дном (6 гадзін)

Прызначэнне і канструктыўныя асаблівасці кошыкаў. Кошык для ягад, яго канструктыўныя асаблівасці. Тэхналогія вырабу кошыка для ягад.

Пляценне круглага дна. Тэхналогія пляцення круглага дна 5 на 5 стоек. Крытэрыі якасці плеценага дна для кошыка.

Пляценне кошыка паслойным спосабам у два дубцы. Падстаноўка і мацаванне стоек для сценкі вырабу вяровачкай у тры дубцы. Інструмент: круглагубцы. Пляценне сценкі кошыка. Загібка канта ў тры пары дубцоў. Крытэрыі якасці кошыка.

Практычныя работы. Падбор матэрыялу для вырабу кошыка для ягад. Пляценне круглага дна. Падстаноўка і мацаванне стоек для сценкі вырабу. Пляценне кошыка. Загібка канта.

Выраб ручкі, абвітай дубцамі (4 гадзіны)

Віды ручак для кошыкаў. Ручка, абвітая дубцамі. Умовы і матэрыялы для яе вырабу. Інструменты: нож, шыла, бакарэз. Тэхналогія вырабу ручкі, абвітай дубцамі. Тэхналогія мацавання ручкі да кошыка. Памылкі і спосабы ліквідацыі. Патрабаванні да якасці ручкі.

Практычныя работы. Падбор матэрыялу для ручкі. Выраб ручкі, абвітай дубцамі.

Загібка «каса» (6 гадзін)

Прызначэнне загібкі «каса». Канструктыўныя асаблівасці загібкі. Тэхналогія пляцення загібкі. Крытэрыі якасці загібкі.

Практыкаванні ў пляценні загібкі «каса» на круглым трэнажоры.

Практычная работа. Пляценне кошыка для ягад з загібкай «каса».

Выраб ручкі, абвітай стужкай-глянец (6 гадзін)

Агульныя патрабаванні да якасці ручак для кошыкаў. Ручка, абвітая стужкай-глянец, выкарыстанне ў вырабах. Матэрыял для ручкі: для асновы, для аздаблення. Інструменты: нож, шыла, бакарэз. Тэхналогія ўстаноўкі асновы ручкі ў выраб. Тэхналогія абвівання стужкай асновы ручкі. Памылкі і спосабы ліквідацыі. Патрабаванні да якасці.

Практычныя работы. Падбор матэрыялу для ручкі. Выраб ручкі, абвітай стужкай-глянец.

Практычнае паўтарэнне (7 гадзін)

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

тэхналогію загібкі ў тры пары дубцоў, пляцення круглага дна 5 на 5 стоек, абвівання ручкі дубцамі і яе замацавання да кошыка, загібкі «каса», абвівання ручкі стужкай-глянец;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць загібку ў тры пары дубцоў, пляценне круглага дна 5 на 5 стоек, абвіванне ручкі дубцамі і яе замацаванне да кошыка, загібку «каса», абвіванне ручкі стужкай-глянец.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па пляценні з лазовага дубца і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

падбор даступных для самастойнага вырабу найпрасцейшых вырабаў з лазовага дубца і вызначэнне тэхналогіі іх выканання.

## Х КЛАС (35 гадзін)

### Нарыхтоўка матэрыялу, падрыхтоўка матэрыялу да пляцення (практычнае паўтарэнне) (4 гадзіны)

### Выраб кошыка на два абручы (20 гадзін)

Канструктыўныя асаблівасці кошыка на два абручы. Тэхналогія вырабу кошыка на два абручы. Матэрыял для вырабу абручоў.

Выраб абручоў для кошыка. Патрабаванні да якасці абручоў.

Мацаванне абручоў каркаса кошыка «разеткамі».

Выраб і падстаноўка рэбраў для каркаса кошыка. Пляценне кошыка простым спосабам.

Практыкаванні ў выбары матэрыялу для абручоў; завострыванні дубцоў «на вус»; згінанні абручоў; пляценні «разетак».

Практычныя работы. Падбор матэрыялу для кошыка. Выраб абручоў. Злучэнне абручоў з дапамогай «разетак». Выраб і падстаноўка рэбраў. Пляценне кошыка простым спосабам.

### Дэкарыраванне вырабаў з лазы (4 гадзіны)

Прызначэнне дэкарыравання. Спосабы дэкарыравання вырабаў з лазы. Матэрыялы і інструменты для дэкарыравання. Тэхналогія пакрыцця вырабаў фарбавальнымі саставамі, лакам. Правілы бяспекі пры рабоце.

Практычная работа. Пакрыццё плеценых вырабаў фарбавальнымі саставамі, лакам.

Практычнае паўтарэнне (7 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

тэхналогію вырабу абручоў, злучэнні абручоў з дапамогай «разетак», вырабу асновы (каркаса) кошыка, пляцення каша простым спосабам;

віды і прызначэнне, матэрыялы і інструменты для дэкарыравання;

тэхналогію пакрыцця плеценых вырабаў фарбавальнымі саставамі, лакам;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

вырабляць абручы, злучаць абручы з дапамогай «разетак», рабіць каркас кошыка, плесці кошыка простым спосабам, выконваць дэкарыраванне вырабаў з лазы.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках па пляценні з лазовага дубца і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

падбор даступных для самастойнага выканання найпрасцейшых вырабаў з лазовага дубца і вызначэнне тэхналогіі іх выканання.

## РАЗЬБА ПА ДРЭВЕ

## VIII КЛАС (35 гадзін)

### Уступныя заняткі (2 гадзіны)

Арганізацыя і абсталяванне вучэбнага месца для заняткаў разьбой па дрэве.

Санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы бяспечных паводзін на занятках разьбой па дрэве. Захоўванне інструментаў і рабочага адзення.

### Разьба па дрэве як народны промысел і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (4 гадзіны)

Гісторыя разьбы па дрэве. Віды разьбы. Разнастайнасць разьбяных вырабаў, прымяненне ў іх розных відаў разьбы.

Экскурсія ў музей (на выставу народнай творчасці, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва).

Матэрыялы і інструменты для разьбы па дрэве (6 гадзін)

Пароды драўніны для разьбы. Уласцівасці драўніны розных парод, якія ўлічваюцца пры разьбе. Патрабаванні да матэрыялу для разьбы, выбар драўніны для разьбы.

Інструмент для разьбы: нажы-касякі, нажы-разакі, стамескі, лыжкавыя нажы, чаканы, скрабкі і цыклі, долата, рашпілі, шчотка драцяная; іх прымяненне. Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры рабоце з інструментамі.

Контурная разьба на светлым фоне (18 гадзін)

Інструмент для контурнай разьбы. Прыёмы выканання контурнай разьбы (рэзання драўніны) нажом-касяком, паўкруглымі стамескамі, чаканкі фону.

Капіравальная папера. Перавод малюнка праз капіравальную паперу. Паслядоўнасць выканання работы.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні контурнай разьбы.

Практыкаванні ў выкананні прыёмаў контурнай разьбы.

Практычныя работы. Вырабы з контурнай разьбой. Падрыхтоўка загатовак[7] . Падбор кампазіцыі. Перавод малюнка на аснову праз капіравальную паперу. Контурнае разьбярства з выкананнем кантролю якасці. Шліфаванне.

Аб’екты работы. Вучэбныя ўзоры, дэкаратыўныя пласціны, апрацоўчыя дошкі і іншыя.

Практычнае паўтарэнне (5 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, агульныя правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на занятках разьбой па дрэве;

матэрыялы і інструменты для заняткаў разьбой па дрэве;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

---

[7] Тут і далей падрыхтоўка загатовак выконваецца з улікам засваення тэхналагічных аперацый апрацоўкі драўніны, якія вывучаліся.

пераводзіць малюнак на аснову праз капіравальную паперу; выконваць контурную разьбу.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках разьбой па дрэве і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

падбор найпрасцейшых кампазіцый для выканання контурнай разьбы.

## IX КЛАС (35 гадзін)

### Арнамент (6 гадзін)

Паняцце арнаменту. Віды арнаменту па матывах (геаметрычны, раслінны), па характары кампазіцыі (у паласе, абмежаваны геаметрычнай фігурай, па ўсёй паверхні). Рытм, сіметрыя.

Практычныя работы. Складанне малюнкаў геаметрычнага і расліннага арнаментаў.

### Геаметрычная разьба (24 гадзіны)

Элементы геаметрычнай разьбы. Інструменты для выканання геаметрычнай разьбы.

Разметка элементаў геаметрычнай разьбы.

Прыёмы выканання выемак.

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры выкананні геаметрычнай разьбы.

Практыкаванні ў выкананні элементаў геаметрычнай разьбы.

Практычныя работы. Выкананне вырабаў з геаметрычнай разьбой. Падрыхтоўка загатовак. Разметка (нанясенне асноўных ліній малюнка). Геаметрычная разьба з выкананнем кантролю якасці. Шліфаванне.

Аб’екты работы. Дэкаратыўныя пласціны, апрацоўчыя дошкі і іншыя.

### Практычнае паўтарэнне (5 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

элементы геаметрычнай разьбы;

інструменты для выканання геаметрычнай разьбы;

тэхналогію выканання геаметрычнай разьбы;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць геаметрычную разьбу.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках разьбой па дрэве і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

падбор найпрасцейшых арнаментаў для выканання геаметрычнай разьбы.

## X КЛАС (35 гадзін)

### Фарбаванне (таніраванне) загатовак (4 гадзіны)

Прызначэнне фарбавання (таніравання). Натуральныя і штучныя фарбавальнікі. Тэхналогія фарбавання (таніравання).

Арганізацыя вучэбнага месца, правілы бяспечных паводзін пры фарбаванні (таніраванні).

Практычныя работы. Падрыхтоўка загатовак. Фарбаванне (таніраванне) загатовак.

### Выкананне і аздабленне разьбяных вырабаў (24 гадзіны)

Прызначэнне аздаблення разьбяных вырабаў. Матэрыялы для выканання празрыстага аздаблення. Тэхналогія выканання празрыстага аздаблення разьбяных вырабаў. Арганізацыя рабочага месца, правілы бяспекі пры аздабленні разьбяных вырабаў.

Практычныя работы. Выкананне разьбяных вырабаў з выкананнем празрыстага аздаблення. Падрыхтоўка загатовак. Контурная і геаметрычная разьба з выкананнем кантролю якасці. Аздабленне выкананых вырабаў.

### Практычнае паўтарэнне (7 гадзін)

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

прызначэнне фарбавання (таніравання); натуральныя і штучныя фарбавальнікі;

прызначэнне аздаблення разьбяных вырабаў; матэрыялы для выканання празрыстага аздаблення;

тэхналогію фарбавання (таніравання), тэхналогію выканання празрыстага аздаблення разьбяных вырабаў;

правілы арганізацыі вучэбнага месца і правілы бяспечных паводзін пры выкананні работ, якія вывучаліся.

Вучні ўмеюць:

выконваць фарбаванне (таніраванне), празрыстае аздабленне разьбяных вырабаў.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

санітарна-гігіенічныя патрабаванні, правілы арганізацыі вучэбнага месца і бяспечных паводзін на вучэбных занятках разьбой па дрэве і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

падбор кампазіцый для выканання контурнай разьбы і арнаментаў для выканання геаметрычнай разьбы.

## ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ

### VIII КЛАС (8 гадзін)

#### Электрычны ток (4 гадзіны)

Электрычныя зарады. Значэнне слова «ток». Электрычны ток – накіраваны рух зараджаных часціц. Праваднікі электрычнага току і ізалятары. Правілы электрабяспекі. Першая дапамога пры электратраўмах. Электрычныя ланцугі. Спосабы зачысткі і злучэнні правадоў.

Правілы бяспечных паводзін пры выкарыстанні батарэй для электрычнага ліхтарыка, гадзінніка і іншых прыбораў.

Вопыты. Электрызацыя прадметаў трэннем.

Практычныя работы. Зачыстка і злучэнне (зрошчванне правадоў). Зборка найпрасцейшага электрычнага ланцуга з выкарыстаннем батарэі для кішэннага ліхтарыка.

#### Электрарухавік (4 гадзіны)

Электрарухавік – частка швейнай машыны (такарных, свідравальных або іншых станкоў, якія вывучаюцца). Перадача руху ад электрарухавіка да рабочага механізма. Правілы бяспечных паводзін пры рабоце на машыне (станку) з электрапрывадам.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

правілы электрабяспекі;

паняцце «электрычны ток»;

прызначэнне электрарухавіка;

правілы аказання першай дапамогі пры электратраўмах; правілы бяспечных паводзін пры выкарыстанні батарэй для электрычнага ліхтарыка, гадзінніка і іншых прыбораў; правілы бяспечных паводзін пры рабоце на машыне (станку) з электрапрывадам.

Вучні ўмеюць:

збіраць просты электрычны ланцуг з выкарыстаннем батарэі для кішэннага ліхтарыка.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

правілы электрабяспекі на вучэбных занятках і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

вопыты па электрызацыі прадметаў трэннем.

## IX КЛАС (8 гадзін)

### Цеплавое дзеянне электрычнага току (8 гадзін)

Бытавыя прыборы, якія працуюць на аснове цеплавога дзеяння электрычнага току (электрычная лямпачка, электрапліта, электрачайнік, электракамін), агульныя звесткі аб іх будове. Награвальныя элементы ў электрабытавых прыборах. Правілы бяспечных паводзін пры рабоце з электрапрыборамі.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

правілы бяспечных паводзін пры рабоце з электрапрыборамі;

агульныя звесткі аб будове бытавых прыбораў, якія працуюць на аснове цеплавога дзеяння электрычнага току.

Вучні ўмеюць:

арыентавацца ў выкарыстанні бытавых прыбораў, якія працуюць на аснове цеплавога дзеяння электрычнага току.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

правілы бяспечных паводзін пры рабоце з электрапрыборамі на вучэбных занятках і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

веды аб бытавых награвальных і электрапрыборах у праблемных жыццёвых сітуацыях.

## X КЛАС (8 гадзін)

### Спажыванне электраэнергіі ў быце і на вытворчасці (8 гадзін)

Асноўныя крыніцы спажывання электраэнергіі ў быце. Асноўныя крыніцы спажывання электраэнергіі ў установе адукацыі. Асноўныя крыніцы спажывання электраэнергіі на вытворчасці.

Кошт электраэнергіі для спажыўцоў. Электралічыльнік. Зняцце паказанняў электралічыльніка. Эканомія электраэнергіі.

Назіранні за хуткасцю вярчэння дыска электралічыльніка ў розны час сутак, пры адключэнні пэўных крыніц электраэнергіі.

Практыкаванні ў здыманні і запісе паказанняў электралічыльніка, у вылічэнні платы за электраэнергію, у запаўненні квітанцый.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

асноўныя крыніцы спажывання электраэнергіі ў быце, ўстанове адукацыі, на вытворчасці;

кошт электраэнергіі для спажыўцоў;

прызначэнне электралічыльніка; правілы зняцця паказанняў электралічыльніка;

мерапрыемствы па эканоміі электраэнергіі.

Вучні ўмеюць:

здымаць і запісваць паказанні электралічыльніка, вылічваць плату за электраэнергію.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

правілы эканомнага выкарыстання электраэнергіі на вучэбных занятках і ў працэсе пазаўрочнай дзейнасці.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

атрыманыя веды для складання ўмоў арыфметычных задач.

## ПРАФЕСІЙНАЕ САМАВЫЗНАЧЭННЕ
## VIII КЛАС (8 гадзін)

### Свет прафесій (8 гадзін)

Галіны сферы матэрыяльнай вытворчасці. Галіны невытворчай сферы эканомікі. Разнастайнасць прафесій (на прыкладзе асобных галін па выбары настаўніка і рэгіёна установы адукацыі). Прафесіі рабочых, агульныя для ўсіх галін народнай гаспадаркі. Літаратура аб прафесіях.

Практыкаванні ў пошуку прафесійнай інфармацыі ў інтэрнеце. Аналіз прафесіяграм.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

асноўныя галіны сферы матэрыяльнай вытворчасці і невытворчай сферы эканомікі свайго рэгіёна, даступныя прафесіі рабочых, запатрабаваныя ў гэтых галінах.

Вучні ўмеюць:

арыентавацца ў літаратуры аб прафесіях у бібліятэцы ўстановы адукацыі.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

звесткі аб галінах матэрыяльнай вытворчасці для вызначэння асаблівасцей яе развіцця ў рэгіёне ўстановы адукацыі.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

звесткі аб прафесіях для ўдзелу ў конкурсах, віктарынах і іншых мерапрыемствах установы адукацыі.

## IX КЛАС (8 гадзін)

### Рынак працы (8 гадзін)

Масавыя прафесіі рабочых і служачых у рэгіёне ўстановы адукацыі. Попыт на даступныя вучням прафесіі на рынку працы ў рэгіёне ўстановы адукацыі, яго адлюстраванне ў перыядычным друку, аб’явах і іншых крыніцах інфармацыі. Звесткі аб працаўладкаванні выпускнікоў установы адукацыі за апошнія гады.

Практыкаванні ў пошуку прафесійнай інфармацыі ў інтэрнеце. Аналіз прафесіяграм.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

звесткі аб попыце на даступныя прафесіі на рынку працы ў рэгіёне ўстановы адукацыі.

Вучні ўмеюць:

арыентавацца ў крыніцах інфармацыі аб патрэбах рэгіёна ў працоўных кадрах.

Вучні ведаюць і прымяняюць:

звесткі аб рынку працы для пошуку інфармацыі, значнай для выбару прафесіі.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

звесткі аб масавых прафесіях і рынку працы для ўдзелу ў конкурсах, віктарынах і іншых мерапрыемствах установы адукацыі.

## X КЛАС (8 гадзін)

### Выбар прафесіі (8 гадзін)

Патрабаванні прафесіі да чалавека (да здароўя, адукацыі, ведаў, уменняў). Правілы выбару прафесіі.

Прафесіі, якія могуць быць рэкамендаваны вучням для працаўладкавання непасрэдна па заканчэнні X класа.

Прафесіі, навучанне якім арганізавана ў XI–XII класах першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната, ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Практыкаванні ў пошуку прафесійнай інфармацыі ў інтэрнеце. Аналіз прафесіяграм.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні ведаюць:

патрабаванні прафесіі да чалавека;

правілы выбару прафесіі;

прафесіі, па якіх яны могуць навучацца ў XI–XII класах першага аддзялення спецыяльнай школы, спецыяльнай школы-інтэрната, ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Вучні ўмеюць:

адэкватна ацаніць магчымасці далейшай прафесійнай падрыхтоўкі (атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі).

Вучні ведаюць і прымяняюць:

звесткі аб патрабаваннях прафесіі да чалавека і правілах выбару прафесіі.

Вучні ўмеюць выкарыстоўваць у творчай рабоце:

звесткі аб патрабаваннях прафесіі да чалавека і правілах выбару прафесіі для ўдзелу ў конкурсах, віктарынах і іншых мерапрыемствах установы адука